Уладзімір
МАЯКОЎСКІ

п'есы


КЛОП

ЛАЗНЯ

Уладзімір

МАЯКОЎСКІ

П'ЕСЫ



МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1985

Р 2
М 39

Пераклаў з рускай
КАСТУСЬ КІРЭЕНКА

Маякоўскі Ул.

М 39 П'есы: Клоп. Лазня./[Пер. з рус. К. Кірэенка].— Мн.: Маст. літ., 1985.— 152 с., іл.

У пер.: 70 к.

У гэтай кнізе змешчаны ў перакладзе на беларускую мову агульнавядомыя сатырычныя п'есы Ул. Маякоўскага «Клоп», «Лазня».

М $\frac{4702010200\text{-}107}{М\ 302(05)\text{-}85}$ БЗ 72-85

ББК 84Р7
Р2

© Пераклад на беларускую мову, афармленне, выдавецтва «Мастацкая літаратура». 1985.



КЛОП

ФЕЕРЫЧНАЯ КАМЕДЫЯ 9 КАРЦІН

ПРАЦУЮЦЬ:

Прысыпкін — П'ер Скрыпкін — былы рабочы, былы партыец, цяпер жаніх.

Зоя Бярозкіна — работніца.

Эльзевіра Давыдаўна — нявеста, манікюрка, касірка цырульні.

Разалія Паўлаўна — маці-цырульніца.

Давід Осіпавіч — бацька-цырульнік.

} Рэнесанс

Алег Баян — самародак, з домаўласнікаў.

Міліцыянер.

Прафесар.

Дырэктар заасада.

Брандмайстар.

Пажарнікі.

Шàфер.

Рэпарцёр.

Рабочыя аўдыторыі.

Старшыня гарсавета.

Прамоўца.

Вузаўцы.

Распарадчык урачыстасці.

Прэзідыум гарсавета, **паляўнічыя, дзеці, старыя.**

I

Цэнтр — круцяцца вялізныя дзверы універмага, бакі — зашклёныя; затаваранья вітрыны. У дзверы ўваходзяць пустыя, выходзяць з пакетамі. Па ўсім тэатры снуюць прыватнікі-латочнікі.

Разносчык гузікаў

Дзеля гузіка не варта жаніцца, праз гузік грэшна сварыцца! Адзін націск вялікім і ўказальным пальцамі, і штаны з грамадзян ніколі не зваляцца.

Галандскія,
Механічныя,
Гузікі, што самі прышываюцца,
6 штук 20 капеек...
Калі ласк, мусью!

Разносчык лялек

Танцуючыя людзі
З балетных студый!
Лепшая за́баўка
У садзе і дома,
Танцуе па ўказанню
Самога наркома!

Разносчыца яблык

Ананасаў!
Няма...
Бананаў!
Няма...
Антонаўскія яблычкі 4 штукі 15 капеек.
Загадаеце, грамадзяначка?

Р а з н о с ч ы к т а ч ы л ь н ы х к а м я н ё ў

Нябіткі
            германскі
                        тачыльны брусок.
30
  капеек
        любы кусок!
Точыць усё —
                галавой паручуся:
Брытвы,
        нажы
              і языкі для дыскусій!
Калі ласк, грамадзяне!

Р а з н о с ч ы к а б а ж у р а ў

Любой
        расфарбоўкі і масці абажуры!
Блакітныя для сем'яў,
                        чырвоныя для юру!
Уладкоўвайцеся, таварышы!

П р а д а в е ц ш а р о ў

Шары-кілбаскі.
Ляці без апаскі.
Такі б вось
            шар
                генералу Нобіле *,—
Яны б на полюсе
                    гадоў бы сто былі!
Бярыце, грамадзяне...

Р а з н о с ч ы к с е л я д ц о ў

А вось
        лепшыя
                рэспубліканскія селядцы.
Незаменныя там,
                    дзе гарэлка і блінцы!

Разносчыца галантарэі

Бюстгальтары з футрам,
Бюстгальтары з футрам!

Прадавец клея

У нас
і за мяжою,
а таксама ўсюды
Грамадзяне выкідваюць біты пасудак.
Славуты
Экцэльзіёр,
клей-парашок,
Клеіць
і Венеру
і начны гаршчок.
Загадаеце, васпані?

Разносчыца духоў

Духі Ко́ці *
на залатнікі!
Духі Ко́ці
на залатнікі!

Прадавец кніг

Што робіць жонка, калі мужа няма дома, 105 вясёлых анекдотаў былога графа Льва Мікалаевіча Талстога замест рубля дваццаці — пятнаццаць капеек! *

Разносчыца галантарэі

Бюстгальтары з футрам,
Бустгальтары з футрам!

Уваходзяць Прысыпкін,
Разалія Паўлаўна, Баян.

Разносчыца

Бюстгальтары...

Прысыпкін

(з захапленнем)

Якія арыстакратычныя чэпчыкі!

Разалія Паўлаўна

Якія ж гэта чэпчыкі, гэта ж...

Прысыпкін

Што ж я без вачэй, ці што? А калі ў нас двайняты народзяцца? Гэта вось на Дароці, а гэта на Ліліян *... Я іх ужо вырашыў назваць арыстакратычна-кінематаграфічна... так і будуць гуляць разам. Во! Дом у мяне павінен быць поўнай чашай. Захапіце, Разалія Паўлаўна!

Баян

(падхіхікваючы)

Захапіце, захапіце, Разалія Паўлаўна! Хіба ў іх пошласць у галаве? Оне малады клас, оне ўсё па-свойму разумеюць. Оне да вас старадаўняе незаплямленае пралетарскае паходжанне і прафсаюзны білет у дом уносяць, а вы рублі шкадуеце! Дом у іх павінен быць поўнай чашай.

Разалія Паўлаўна, уздыхнуўшы, купляе.

Баян

Я данясу... яны лёгенькія... не турбуйцеся, калі ласка... за тыя ж грошы...

Разносчык за́баўак

Танцуючыя людзі з балетных студый...

Прысыпкін

Мае будучыя патомныя дзеці павінны выхоўвацца ў шыкоўным гусце. Во! Захапіце, Разалія Паўлаўна!

Разалія Паўлаўна

Таварыш Прысыпкін...

Прысыпкін

Не называйце мяне таварышам, грамадзянка, вы яшчэ з пралетарыятам не парадніліся.

Разалія Паўлаўна

Будучы таварыш, грамадзянін Прысыпкін, гэта ж за такія грошы пятнаццаць чалавек бароды паголяць, без уліку драбязы — вусоў і іншага. Лепш піва на вяселле лішнюю дзюжыну. А?

Прысыпкін

(строга)

Разалія Паўлаўна! У мяне дом...

Баян

У яго дом павінен быць поўнай чашай. І танцы і піва ў яго павінны біць фантанам, як з рога дастатку.

Разалія Паўлаўна купляе.

Баян

(падхоплівае пакункі)

Калі ласка, не турбуйцеся, за тыя ж грошы.

Разносчык гузікаў

Дзеля гузіка не варта жаніцца!
Праз гузік не выпадае сварыцца!

Прысыпкін

У нашай чырвонай сям'і не павінна быць ніякай мяшчанскай мішуры і непрыемнасцей з штанамі. Во! Захапіце, Разалія Паўлаўна!

Баян

Пакуль у вас няма прафсаюзнага білета, не раздражняйце яго *, Разалія Паўлаўна. Ён — перамогшы клас, і ён змятае ўсё на сваім шляху, як лава, і штаны ў таварыша Скрыпкіна павінны быць поўнай чашай.

Разалія Паўлаўна купляе, уздыхаючы.

Баян

Дазвольце, я данясу за тыя ж самыя...

Прадавец селядцоў

Лепшыя рэспубліканскія селядцы!
Незаменныя там,
дзе гарэлка і бліццы!

Разалія Паўлаўна
(адхінае ўсіх, гучна і павесялела)

Селядцы — гэта — так! Гэта вы будзеце мець для вяселля рэч. Гэта я ды ўжо захаплю! Праходзьце, мосьё мужчыны! Колькі каштуе гэтая кілька?

Разносчык

Гэтая ласосіна каштуе 2.60 кілё.

Разалія Паўлаўна

2.60 за гэтага шпрота-перараростка?

Прадавец

Што вы, мадам, усяго 2.60 за гэтага кандыдата ў асятры!

Разалія Паўлаўна

2.60 за гэтыя марынаваныя карсетныя косці? Вы чулі, таварыш Скрыпкін? Дык вы зрабілі пра-

вільна, калі вы забілі цара і прагналі пана Рабушынскага! * Ой, гэтыя бандыты! Я знайду мае грамадзянскія правы і мае селядцы ў дзяржаўнай савецкай грамадскай кааперацыі!

Баян

Пачакаем тут, таварыш Скрыпкін. Навошта вам зліваціа з гэтай дробнабуржуазнай стыхіяй і купляць селядцы ў такім дыскусійным парадку? За вашы пятнаццаць рублёў і бутэльку гарэлкі я вам арганізую вяселлечка на-яць.

Прысыпкін

Таварыш Баян, я супроць гэтага мяшчанскага побыту — канарэек і іншага... Я чалавек з буйнымі запатрабаваннямі... Я — люстранай шафай цікаўлюся...

Зоя Бярозкіна амаль натыкаецца на гаворачых і здзіўлена адступае, прыслухоўваецца.

Баян

Калі ваш вясельны картэ́ж...

Прысыпкін

Што вы мелеце? Які карцёж?

Баян

Картэ́ж, я кажу. Так, таварыш Скрыпкін, называецца на прыгожых замежных мовах усялякая, і асабліва такая, вясельная ўрачыстая паездка.

Прысыпкін

А! Ну-ну-ну!

Баян

Дык вось, калі картэ́ж пад'едзе, я вам спяю эпітала́му Гіменея *.

Прысыпкін

Што ты плявузгаеш? Якія яшчэ такія Гімалаі?

Баян

Не Гімалаі, а эпіталаму пра бога Гіменея. Гэта такі бог кахання быў у грэкаў, ды не ў гэтых жоўтых, азвярэлых згоднікаў Венізеласаў *, а ў старажытных, рэспубліканскіх.

Прысыпкін

Таварыш Баян, я за свае грошы патрабую, каб было чырвонае вяселле і ніякіх багоў! Паняў?

Баян

Ды што вы, таварыш Скрыпкін, не тое, што паняў, а сілай, згодна Плеханаву, дазволенага марксістам уяўлення я праз як бы прызму бачу вашу класавую, узвышаную, чароўную і поўную захаплення ўрачыстасць!.. Нявеста вылазіць з карэты — чырвоная нявеста... уся чырвоная,— упарылася, значыцца; яе выводзіць чырвоны пасаджоны бацька, бухгалтар Ерыкалаў,— ён якраз мужчына тлусты, чырвоны, апаплексічны,— уводзяць гэта вас чырвоныя шáферы, увесь стол у чырвоных шынках і бутэлькі з чырвонымі галоўкамі.

Прысыпкін

(спачувальна)

Во! Во!

Баян

Чырвоныя госці крычаць «горка, горка», і тут чырвоная (ужо цяпер жонка) працягвае вам чырвоныя-чырвоныя губкі...

Зоя

(збянтэжана хапае за рукавы абодвух. Абое здымаюць яе рукі, збіваюць пстрычкамі пыл)

Ваня! Пра што ён? Што пляце гэтая каракаціца ў гальштуку? Якое вяселле? Чыё вяселле?

Баян

Чырвоны працоўны шлюб Эльзевіры Давыдаўны Рэнесанс і...

Прысыпкін

Я, Зоя Ванна, люблю другую.
Яна ўпрыгожыць дні мае.
Фігурку сцягвае тугую
Жакет дзівоснейшы ў яе *.

Зоя

Ваня! А я? Як жа гэта: пагуляўся і адцураўся?

Прысыпкін

(адхіляе працягнутую руку)

Мы разышліся, нібы ў моры караблі... *

Разалія Паўлаўна

(вырываецца з магазіна, трымаючы селядцы над галавой)

Кіты! Дэльфіны! *(Гандляру селядцамі.)* Ану, пакажы, ану, параўнай твайго смаўжа! *(Параўноўвае; селядзец латочніка большы; пляскае рукамі.)* На хвост даўжэй?! За што змагаліся, а, грамадзянін Скрыпкін? За што мы забілі гасудара імператара і прагналі пана Рабушынскага, а? У магілу мяне ўгоніць савецкая ваша ўлада... На хвост, на цэлы хвост даўжэй!..

Баян

Паважаная Разалія Паўлаўна, параўнайце з другога канца,— ён жа і большы толькі на галоўку, а навошта вам галоўка,— яна ж непрыдатная для яды, адрэзаць і выкінуць.

Р а з а л і я   П а ў л а ў н а

Вы чулі, што ён сказаў? Галоўку адрэзаць! Гэта вам галоўку адрэзаць, грамадзянін Баян: нічога не ўбавіцца і нічога не каштуе, а яму адрэзаць галоўку каштуе дзесяць капеек на кіле. Ну! Дамоў! Мне вельмі патрэбен прафесіянальны саюзны білет у доме, але дачка на даходлівым прадпрыемстве — гэта таксама вам не бык на палачцы.

З о я

Жыць хацелі, працаваць хацелі... Значыць, усё...

П р ы с ы п к і н

Грамадзянка! Наша любоў ліквідавана. Не замінайце свабоднаму грамадзянскаму пачуццю, а то я міліцыю паклічу.

Зоя, з плачам, учапілася за рукаў. Прысыпкін вырываецца. Разалія Паўлаўна становіцца паміж ім і Зояй, губляе пакупкі.

Р а з а л і я   П а ў л а ў н а

Чаго трэба гэтай лахудры? Чаго вы чапляецеся за майго зяця?

З о я

Ён мой!

Р а з а л і я   П а ў л а ў н а

А!.. Яна такі з дзіцём! Я ёй заплачу аліменты, але я ёй разаб'ю морду!

М і л і ц ы я н е р

Грамадзяне, спыніце гэтую агідную сцэну!

II

Інтэрнат для моладзі. Вынаходнік сапе за чарцяжом. Хлопец на ложку, на краю ложка дзяўчына. Ачкарык уткнуўся галавой у кнігу. Калі расчыняюцца дзверы, бачны калідор з дзвярыма і лямпачкі.

Босы хлопец
(крычыць)

Дзе боты? Зноў боты спёрлі. Што ж мне іх на ноч у камеру хавання ручнога і нажнога багажа на Курскі вакзал адносіць, ці што?

Прыбіральшчык

Гэта ў іх Прысыпкін да сваёй вярблюдзіхі на спатканне патопаў. Надзяваў — лаяўся. У апошні раз, кажа, а вечарам, кажа, з'яўлюся ў абноўленым выглядзе, больш адпавядаючым майму новаму сацыяльнаму становішчу.

Босы

Погань!

Малады рабочы
(прыбірае)

І смецце ж пасля яго стала нейкае як бы панскае, далікатнае. Раней што? Бутля з-пад піва ды хвост воблы, а зараз бляшаначкі Тэжэ ды стужачкі шматкалёрныя.

Дзяўчына

Кінь плявузгаць, хлопец гальштук купіў, дык яго ўжо Макданальдам * лаеце.

Хлопец

Макданальд і ёсць! Не ў гальштуку справа, а ў тым, што не гальштук да яго, а ён да гальштука

прывязаны. Нават не думае — галавой пашавяліць баіцца.

Прыбіральшчык

Лакам дзіркі залёпвае; заспяшаўся, дзірку на шкарпэтцы відаць, дык ён нагу на хаду чарнільным алоўкам падмазваў.

Хлопец

Яна ў яго і без алоўка чорная.

Вынаходнік

Можа быць, не на тым месцы чорная. Лепш бы яму шкарпэткі пераадзець.

Прыбіральшчык

Адразу відно — вынаходнік! Патэнт заяўляй. Глядзі, каб ідэю не спёрлі. *(Махнуў анучай па століку, падае бляшанка,— развальваюцца веерам карткі. Нагінаецца сабраць, падносіць да святла, заліваецца рогатам, склікае рукой таварышаў.)*

Усе

(перачытваюць, паўтараюць)

П'ер Скрыпкін! П'ер Скрыпкін!

Вынаходнік

Гэта ён сабе прозвішча вынайшаў. Прысыпкін. Ну, што такое, Прысыпкін? На што Прысыпкін? Куды Прысыпкін? Каму Прысыпкін? А П'ер Скрыпкін — гэта ўжо не прозвішча, а раманс!

Дзяўчына

(летуценна)

А і праўда: П'ер Скрыпкін — гэта так цудоўна і так прывабна! Вы тут гагочаце, а ён, можа, культурную рэвалюцыю дома прарабляе.

Хлопец

Мордай ён ужо і Пушкіна перасягнуў. Вісяць бакі, як хвост у сабакі, нават не мые — раскудлаціць баіцца.

Дзяўчына

У Гары Піля * таксама гэтая культура па ўсёй шчацэ пушчана.

Вынаходнік

Гэта яго настаўнік па валасатай справе выхоўвае.

Хлопец

І на чым толькі ў таго настаўніка валасы трымаюцца: галавы ніякай, а кучаравасці — хоць прадавай. Ад сырасці, ці што такія заводзяцца?

Хлопец з кнігай

Н-е-е. Ён — пісьменнік. Што пісаў — не ведаю, а толькі ведаю, што славуты! «Вячорка» пра яго тры разы пісала: вершы, кажа, Апухціна * за свае прадаў, а той як пакрыўдзіўся, абвяржэнне прыслаў. Дурні — кажа — вы, няправільна ўсё,— гэта я ў Надсана * спісаў. Чыя з іх праўда — не ведаю. Друкаваць яго больш не друкуюць, а славуты ён цяпер вельмі — моладзь навучае. Каго вершам, каго спевам, каго танцам, каго так... грошы пазычаць...

Хлопец з мятлой

Не рабочая гэта справа мазоль лакам наганяць.

Слесар, засалены, уваходзіць у час гаворкі, мые рукі, уключаецца ў размову.

Слесар

Да рабочага ў яго ніякага дачынення, разлік

сёння браў, жэніцца на дзяўчыне, цырульнікавай дачцэ — яна ж касірка, яна ж манікюрка. Кіпці яму цяпер падразаць будзе мадмуазель Эльзевіра Рэнесанс.

Вынаходнік

Эльзевір — шрыфт такі ёсць.

Слесар

Наконт шрыфтоў не ведаю, а корпус у яе — гэта, браце, рэч. Картачку бухгалтару для хуткасці разлікаў паказваў.

Ну і мілка, ну і цуды,—
Адны грудзі па два пуды.

Босы

Уладзіўся!

Дзяўчына

Ага! Зайздрошчы бяруць?

Босы

А што ж, я таксама, калі тэхнарукам стану ды штодзённыя боты агораю, я таксама сабе лепшую кватэрачку паабнюхаю.

Слесар

Я табе вось што параю: ты фіраначкі сабе завядзі. Адхінуў фіраначку — на вуліцу паглядзеў. Зацягнуў фіраначку — хабар цяпнуў. Гэта толькі працаваць аднаму сумна, а курыцу есці аднаму весялей. Правільна? З акопаў такія таксама ўладжвацца бегалі, толькі мы іх шлёпалі. Ну што ж — гайда!

Босы

І пайду, і пайду. А ты што з сябе Карла Лібк-

нехта * строіш? Цябе з акна з кветачкамі паклікай, таксама, глядзі, прыпусцішся... Герой!

С л е с а р

Нікуды не пайду. Ты думаеш, мне гэтае лахманнё і смурод падабаюцца? Не. Нас, бачыш ты, многа. На ўсіх на нас нэпаўскіх дачок не набярэшся. Вось набудуем дамоў і рушым адразу... Адразу ўсе. Але мы з гэтай акопнай нары і з белымі сцягамі не вылезем.

Б о с ы

Зарадзіў — акопы. Цяпер не дзевятнаццаты год. Людзя́м для сябе жыць хочацца.

С л е с а р

А што — не акопы?

Б о с ы

Мані!

С л е с а р

Вошай — дзе ні крані.

Б о с ы

Мані!

С л е с а р

А страляюць бязгучным порахам.

Б о с ы

Мані!

С л е с а р

Вось жа Прысыпкіна з зіркастай дубальтоўкі падстрэлілі.

Уваходзіць Прысыпкін у лакіраваных туфлях, у выцягнутай руцэ нясе стаптаныя боты, кідае Босаму. Баян з пакупкамі. Засланяе ад Скрыпкіна слесара, які перад яго носам урэзвае чачотку.

Баян

Вы, таварыш Скрыпкін, увагі на гэтыя грубыя танцы не звяртайце, оне вам тонкі, што ў вас нараджаецца, густ сапсуюць.

Жыхары інтэрната адварочваюцца.

Слесар

Кінь гнуцца. Булдавешку раскалоціш.

Баян

Я разумею вас, таварыш Скрыпкін, цяжка, немагчыма пры вашай пяшчотнай душы ў іхнім грубым асяроддзі. Яшчэ адзін урок — пакіньце ваша цярпенне не лопнутым. Адказнейшы момант у жыцці — першы факстрот пасля шлюбаўтварэння. На ўсё жыццё павінен ураджанне пакінуць. Ну-с, прайдзіцеся з уяўляемай дамай. Што вы грукаеце, як на першамайскім парадзе?

Прысыпкін

Таварыш Баян, чаравікі скіну: па-першае, ціснуць, па-другое, стаптваюцца.

Баян

Вось, вось! Так, так, ціхім крокам, як быццам у месячную ноч у марах і меланхоліі з піўной вяртаецеся. Так, так! Ды не варушыце вы ніжнім бюстам, вы ж не ваганетку, а мадмуазель вязеце. Так, так! Дзе рука? Нізка рука!

Прысыпкін

(слізгае рукой па ўяўляемым плячы)
Не трымаецца яна ў мяне на паветры.

Баян

А вы, таварыш Прысыпкін, лёгкай разведкай ліфчык знайдзіце і, як бы для адпачывання, вялікім пальчыкам упрыцеся, і даме прыемнасць, і вам палёгка — аб другой руцэ падумаць можаце. Чаго плячыма заторгалі? Гэта ўжо не факстрот, гэта вы ўжо шымскае «па» * прадэманстраваць сабе дазволілі.

Прысыпкін

Не. Гэта я так... на хаду пачухаўся.

Баян

Ды хіба ж так можна, таварыш Прысыпкін? Калі з вамі ў вашым танцавальным натхненні такі казус здарыцца, вы закаціце вочы, нібыта даму раўнуеце, адступіце па-іспанску да сцяны, хуценька патрыцеся аб якую-небудзь скульптуру (у фешэнебельным асяроддзі, дзе вы будзеце аціраццa, дык гэтых скульптур і ваз розных заўсёды чорт колькі наварочана). Патрыцеся, перасмыкніцеся, бліснiце вачыма і скажыце: «Я вас зразумеў, каварррная, вы мной забаўляецеся... але...» і зноў пусціцеся ў танец, як бы паступова ахалоджваючыся і супакойваючыся.

Прысыпкін

Вось так?

Баян

Брава! Добра! Талент у вас, таварыш Прысыпкін. Вам ва ўмовах буржуазнага акружэння і пабудовы сацыялізму ў адной краіне — вам разгарнуцца няма дзе. Хіба наш Сярэдні Казіны завулак вартае для вас поле дзейнасці? Вам сусветная рэвалюцыя патрэбна, вам выхад у Еўропу патрабуецца, вам толькі Чэмберленаў * і Пуанкароў * зла-

мацць, і вы Мулен Ружы * і Пантэоны * хараством рухаў свайго цела захапляць будзеце. Так і запомніце, так і замрыце. Цудоўна! А я пайшоў. За гэтымі шаферамі патрэбна вока ды вока, да вяселля задаткам шклянку і ні расінкі больш, а работу скончаць, тады хоць з рыла. Орэвуар. *(Ідзе, крычыць з дзвярэй.)* Не надзявайце двух гальштукаў адначасова, асабліва рознакаляровых, і зарубіце сабе на носе: нельга навыпуск насіць крухмальную кашулю!

Прысыпкін мерае абноўкі.

Хлопец

Ванька, кінь ты гэту бузу, чаго цябе так расчуаліла?

Прысыпкін

Не ваша сабачая справа, паважаны таварыш! За што я змагаўся? Я за добрае жыццё змагаўся! Вось яно ў мяне пад рукамі: і жонка, і дом, і сапраўднае абыходжанне. Я свой абавязак, калі спатрэбіцца, заўсёды выканаць здолею. Хто ваяваў, той мае права ля ціхай рэчкі адпачыць *. Во! Можа, я ўвесь свой клас сваім добраўпарадкаваннем узвышаю. Во!

Слесар

Баец! Сувораў! Правільна!
Крочыў верхам,
крочыў нізам,
Ладзіў мóст у сацыялізм,
Не закончыў
і прыстаў,
Тут і ўсеўся ля мастá.
Траўка вырасла ля мóста.
Па мастý ідуць авечкі.

Мы жадаем —
вельмі проста! —
Адпачыць ля гэтай рэчкі...*
Так, ці што?

Прысыпкін

Ды ну цябе! Адчапіся ты ад мяне з тваімі грубымі агіткамі... Во! *(Садзіцца на ложак, спявае пад гітару.)*

На Луначарскай вуліцы
Стары я помню дом
З цудоўнай цёмнай лесвіцай,
З дзівоснейшым акном *.

Стрэл. Кідаюцца да дзвярэй.

Хлопец
(з дзвярэй)

Зоя Бярозкіна застрэлілася!

Усе кідаюцца да дзвярэй.

Хлопец

Эх, і прабяруць жа яе цяпер у ячэйцы!

Галасы

Хутчэй...
Хутчэй...
Хуткую...
Хуткую...

Голас

Хуткая! Хутчэй! Што? Застрэлілася! Грудзі. Навылёт. Сярэдні Казіны, 16.

Прысыпкін адзін, спешна збірае рэчы.

Слесар

Праз цябе, поскудзь валасатая, і такая баба забілася. Вон! *(Бярэ Прысыпкіна за пінжак і штурхае за дзверы, услед выкідвае рэчы.)*

Прыбіральшчык

(які бяжыць з урачом, прытрымлівае і прыпадымае Прысыпкіна, падае яму выкінуты капялюш)

І з трэскам жа ты, хлопец, ад класа адрываешся!

Прысыпкін

(адварочваецца, крычыць)

Рамізнік, вуліца Луначарскага, 17! З рэчамі!

III

Вялікі цырульны пакой. Сцены ў люстрах. Перад люстрамі вялізныя папяровыя кветкі. На століках для галення — бутэлькі. Злева авансцэны раяль з разінутай пашчай, справа печ, трубы ад якой кругляюць па ўсім пакоі. Пасярэдзіне пакою шырокі вясельны стол. За сталом: П'ер Скрыпкін, Эльзевіра Рэнесанс, двое шафераў і шаферак, маці і бацька Рэнесанс. Пасаджоны бацька — бухгалтар і такая ж маці. Алег Баян распараджаецца каля стала, спіной да залы.

Эльзевіра

Пачнем, Скрыпачка?

Скрыпкін

Пачакаць.

Паўза.

Эльзевіра

Скрыпачка, пачнем?

Скрыпкін

Пачакаць. Я жадаю ажаніцца ў арганізаваным парадку і ў прысутнасці ганаровых гасцей і асабліва ў прысутнасці асобы сакратара заўкома, паважанага таварыша Ласальчанкі...* Во!

Госць

(убягаючы)

Паважаныя маладыя, даруйце велікадушна за спазненне, але я ўпаўнаважаны перадаць вам шлюбныя пажаданні нашага паважанага правадыра таварыша Ласальчанкі. Заўтра, кажа, хоць у царкву, а сягоння, кажа, прыйсці не магу. Сягоння, кажа, партдзень, і хочаш не хочаш, а ў ячэйку, кажа, пайсці трэба. Пяройдзем, так сказаць, да чарговых спраў.

Прысыпкін

Аб'яўляю вяселле пачатым.

Разалія Паўлаўна

Таварышы і мусьё, частуйцеся, калі ласка. Дзе вы цяпер знойдзеце такіх свіней? Я купіла гэтую шынку тры гады таму назад на выпадак вайны або з Грэцыяй або з Польшчай. Аднак... Вайны яшчэ няма, а вяндліна ўжо псуецца. Частуйцеся, мусьё.

Усе

(падымаюць шклянкі і чаркі)

Горка! Горка!..

Эльзевіра і П'ер цалуюцца.

Горка! Го-о-о-р-к-а-а!

Эльзевіра павісае на П'еры. П'ер цалуе паважна і з пачуццём класавай годнасці.

Пасаджоны Бацька — бухгалтар

Бетховѐна!.. Шакеспеара!..* Просім вытанчыць што-якоесь. Ці ж дарма мы вашы юбілеі штодзённа святкуем!

Цягнуць раяль.

Галасы

Пад крылца, пад крылца яе бярыце! Ух і зубоў жа, зубоў! Ох і ўрэзаць бы!

Прысыпкін

Не адтапчыце ножкі маёй раялі.

Баян

(устае, хістаецца і расплюхвае чарку)

Я шчаслівы, я шчаслівы бачыць чароўнае завяршэнне на дадзеным адрэзку часу поўнага барацьбы шляху таварыша Скрыпкіна. Праўда, ён страціў на гэтым шляху адзін прыватны партыйны білет, але затое прыдбаў багата білетаў дзяржаўнай пазыкі. Нам удалося спалучыць і ўзгадніць іх класавыя і іншыя супярэчнасці, у чым нельга не бачыць узброенаму марксісцкім поглядам, так сказаць, як у кроплі вады, будучае шчасце чалавецтва, якое назвалі ў простанароддзі сацыялізмам.

Усе

Горка! Горка!

Эльзевіра і Скрыпкін цалуюцца.

Баян

Якімі капітальнымі крокамі мы ідзем наперад па шляху нашага сямейнага будаўніцтва! Ці ж калі мы з вамі паміралі пад Перакопам, а многія нават памерлі, ці ж маглі мы здагадвацца, што гэтыя ружы будуць квітнець і дарыць нам водар ужо на цяперашнім адрэзку часу? Хіба калі мы стагналі пад ярмом самаўладдства, хіба хаця б нашы вялікія настаўнікі Маркс і Энгельс маглі б дапускальна марыць ці нават у марах дапускаць,

што мы будзем спалучаць вузамі Гіменея невядомую, але вялікую працу са зрынутым, але чароўным капіталам?

У с е

Горка!.. Горка...

Б а я н

Паважаныя грамадзяне! Прыгажосць — гэта рухавік прагрэсу! Чым бы я быў у якасці простага працоўнага? Бочкін — і больш нічога. Што я мог у якасці Бочкіна? Мычэць! І больш нічога! А ў якасці Баяна — колькі і чаго душа зажадае! Напрыклад:

Алег Баян
Ад шчасця п'ян.

І вось я цяпер Алег Баян, і я карыстаюся, як раўнапраўны член грамадства, усімі дабратáмі культуры і магу выражацца, хаця не, выбачайце — выражацца я не магу, але магу размаўляць, хоць бы як старажытныя грэкі: «Эльзевіра Скрыпкіна, перадайце рыбкі нам». І мне можа ўся краіна адказваць, як якія-небудзь трубадуры: *

Для прамыўкі глоткі ў целе
За прыгожы выгляд стану
З селядцом гарэлкі келіх
Прапануем мы Баяну.

У с е

Брава! Ура! Горка!

Б а я н

Прыгажосць — гэта маці...

Ш а ф е р
(змрочна і ўсхопліваючыся)

Маць! Хто сказаў «маць»? Прашу не лаяцца пры маладых!

Шафера адцягваюць.

У с е

Бетховена! Камарынскага!

Цягнуць Баяна да раяля.

Б а я н

З'язджаліся к загсу трамваі —
Вяселле чырвонае там...*

У с е
(падпяваюць)

Жаніх у спецвопратцы новай,
А з блузы тырчаў прафбілет!

Б у х г а л т а р

Зразумеў! Усё зразумеў! Гэта значыць:
Будзь здароў, Алег Баянчык,
Кучаравенькі баранчык...

Ц ы р у л ь н і к
(з відэльцам лезе да пасаджонай мамы)

Не, мадам, сапраўдных кучаравых цяпер, пасля рэвалюцыі, няма. Шыньён гаффрэ * робіцца так... Бяруцца шчыпцы *(круціць відэльцам)*, награваюцца на слабым агні, а ля этуаль * *(торкае відэлец у полымя печы)*, і ўзбіваецца на макушцы гэтакае валасяное суфле.

П а с а д ж о н а я

Вы абражаеце маю годнасць як маці і як дзяўчыны... Пусціце... Сучы сын!!!

Шафер

Хто сказаў «сучы сын»? Прашу не лаяцца пры маладых!

Бухгалтар разнімае пасаджоных, падпяваючы, спрабуе крутнуць ручку касавага лічыльніка, з якім ён круціцца, як з шарманкай.

Эльзевіра
(да Баяна)

Ах! Сыграйце, ах! Вальс «Туга Макарава па Веры Халоднай» *. Ах, гэта так шарман *, ах, гэта проста пеціт істуар...*

Шафер
(узброены гітарай)

Хто сказаў «пісуар»? Прашу пры маладых...

Баян разнімае і накідваецца на клавішы.

Шафер
(прыглядаючыся, пагражальна)

Ты што ж гэта на адной чорнай косці іграеш? Для пралетарыята, значыць, на палавіне, а для буржуазіі на ўсіх?

Баян

Што вы, што вы, грамадзянін? Я на белых касцях асабліва стараюся.

Шафер

Значыць, зноў выходзіць, што белая косць лепш? Іграй на ўсіх!

Баян

Ды я на ўсіх!

Шафер

Значыць, з белымі разам, згоднік!

Баян

Таварыш... Дык гэта ж... цэдура *.

Шафер

Хто сказаў «дура»? Пры маладых. Во!!! *(Грукае гітарай па патыліцы.)*

Цырульнік начэплівае на відэлец валасы пасаджонай маці. Прысыпкін адціскае бухгалтара ад жонкі.

Прысыпкін

Вы што ж маёй жонцы селядца ў грудзі тыцкаеце? Гэта ж вам не клумба, а грудзі, і гэта ж вам не хрызантэма, а селядзец!

Бухгалтар

А вы нас ласосінай частавалі? Частавалі? Так? А самі гарлаеце — так?

У бойцы куляюць нявесту ў газавай сукенцы на печ, печ падае,— полымя, дым.

Крыкі

Гарым!!! Хто сказаў «гарым»?.. Пажар! Ласосіну... З'язджаліся к загсу трамваі...

IV

У чорнай цемры ночы паблісквае ад недалёкага полымя каска пажарніка. Начальнік адзін. Падыходзяць і адыходзяць з дакладамі пажарнікі.

1-шы пажарнік

Не саўладаць, таварыш начальнік! Дзве гадзіны ніхто не выклікаў... П'яныя сцервы!!! Гарыць, як парахавы склад. *(Знікае.)*

Начальнік

Чаго ж яму не гарэць? Павуцінне ды спірт.

2-гі пажарнік

Затухае, вада на ляту ледзяніцца. Склеп вадой залілі, гладзей, чым каток. *(Ідзе.)*

Начальнік

Целы знайшлі?

3-ці пажарнік

Аднаго пагрузілі, уся каробка папсавана. Відаць, бэлькай праламаная. Проста ў морг. *(Ідзе.)*

4-ты пажарнік

Пагрузілі... Адно абгарэлае цела невядомага пола з відэльцам у галаве.

1-шы пажарнік

Пад печкай знойдзена былая жанчына з драцяным вяночкам на патылічных касцях.

3-ці пажарнік

Знойдзен невядомы даваеннага складу цела з касай у руках,— відавочна, пры жыцці бандыт.

2-гі пажарнік

Сярод жывых няма нікога... Сярод трупаў не далічваецца адзін, так што, на падставе невыяўлення, думаю — спалымнеў нашчэнт.

1-шы пажарнік

Ну і ілюмінацыя! Проста тэатр, толькі ўсе дзейныя асобы згарэлі.

3-ці пажарнік

Вязла іх з вяселля карэта,
Пад крыжам чырвоным вязла *.

Гарніст склікае пажарнікаў. Строяцца. Маршыруюць па тэатры, выкрыкваюць.

Пажарнікі

Таварышы, помніце:
гарэлка — яд.
П'яныя спаляць
рэспубліку-сад!
Жывучы з камінамі
і з прымусáмі,
Спаліце дом
і згарыце самі!
Сон выпадковы —
прычына пажараў,
На сон
не чытайце
Надсóна і Жарава! *



Вялізная зала пасяджэнняў, якая ўздымаецца амфітэатрам да столі. Замест людскіх галасоў — радыёраструбы, побач некалькі рук, якія вісяць так, быццам высоўваюцца з аўтамабіляў. Над кожным раструбам каляровыя электрычныя лямпы, пад самай столлю экран. Пасярэдзіне трыбуна з мікрафонам. Па баках трыбуны размеркавальнікі і рэгулятары галасоў і святла. Два механікі — стары і малады — нешта ладкуюць у цёмнай аўдыторыі.

Стары

(змятае раскалмачанай з пёраў шчоткай пыл з раструбаў)

Сягоння важнае галасаванне. Змаж маслам і правер галасавальны апарат земляробчых раёнаў. Апошні раз была замінка. Галасавалі са скрыпам.

Малады

Земляробчыя? Добра! Цэнтральныя змажу. Пратру замшай горла смаленскім апаратам. На мінулым тыдні зноў пахрыпвалі. Трэба падвінціць рукі службовым штатам сталіц, а то ў іх нейкі ўхільчык: правая за левую чапляецца.

Стары

Уральскія заводы гатовы. Металургічныя курскія ўключым, там правялі новы апарат на шэсцьдзесят дзве тысячы галасоў другой групы электрастанцыі Запарожжа. З імі нішто сабе, праца лёгкая.

Малады

А ты яшчэ памятаеш, як раней было? Смешна, мабыць?

Стары

Мяне раз мамка на руках на пасяджэнне насіла. Народу зусім мала — чалавек тысячу сабралася, сядзяць, як дармаеды, і слухаюць. Пытанне было нейкае важнае і спрэчнае, адным голасам прайшло.

Маці была супроць, а прагаласаваць не змагла, бо мяне на руках трымала.

Малады

Ну, вядома! Саматужніцтва!

Стары

Раней такі апарат і не спатрэбіўся б. Бывала, чалавеку **першаму** руку падняць трэба,— каб яго заўважылі, дык ён яе пад нос старшыні тыцкае, да самай наздры падносіць абедзве, шкадуе толькі, што не старажытная багіня Ізіда, а то б у дванаццаць рук галасаваў. А многія ратаваліся. Пра

аднаго расказвалі, што ён нейкую важную дыскусію ўсю ў нужніку прасядзеў — галасаваць баяўся. Сядзеў і задумваўся, шкуру, значыць, службовую бярог.

Маладзы

І збярог?

Стары

Збярог!.. Толькі па другой спецыяльнасці прызначылі. Бачаць любоў да прыбіральняў, дык яго там галоўным прызначылі пры мыле і ўціральніках.

Гатова?

Маладзы

Гатова!

Збягаюць уніз да размеркавальных дошчак і правадоў. Чалавек у акулярах і з бародкай, расчыніўшы дзверы, роўным крокам узыходзіць на эстраду, спіной да аўдыторыі, падымае рукі.

Прамоўца

Уключыць адначасова ўсе раёны федэрацыі!

Стары і маладзы

Ёсць!

Адначасова загараюцца ўсе чырвоныя, зялёныя і сінія лямпачкі аўдыторыі.

Прамоўца

Алё! Алё! Гаворыць старшыня інстытута чалавечых ажыўленняў. Пытанне апублікавана тэлеграмамі, абмеркавана,— простае і яснае. На скрыжаванні шэсцьдзесят другой вуліцы і семнаццатага праспекта былога Тамбова будаўнічая брыгада, прарываючы грунт, на глыбіні сямі метраў знайшла засыпаны зямлёй абледзянелы склеп. Праз лёд фенамена прасвечвае замарожаная чала-

вечая фігура. Інстытут лічыць магчымым ажыўленне індывідуума, які замёрз пяцьдзесят год таму назад.

Высветлім розніцу думак.

Інстытут лічыць, што кожнае жыццё рабочага павінна быць выкарыстана да апошняй секунды.

Прасвечванне паказала на руках істоты мазалі, якія былі паўстагоддзя таму назад адзнакай працоўнага. Нагадваем, што пасля войн, якія пранесліся над светам, грамадзянскіх войн, якія стварылі федэрацыю зямлі, дэкрэтам ад 7 лістапада 1965 года жыццё чалавека недатыкальнае. Даводжу да вашага ведама пярэчанні эпідэмічнай секцыі, якая баіцца пагрозы распаўсюджання бактэрый, што напаўнялі былыя істоты былой Расіі. З поўным усведамленнем адказнасці прыступаю да галасавання. Таварышы, памятайце, памятайце і яшчэ раз памятайце:

Мы
галасуем
чалавечае жыццё!

Лямпы гаснуць, прарэзлівы званок, на экране загараецца рэзалюцыя, якая паўтараецца прамоўцам.

«У імя даследавання працоўных звычак рабочага чалавецтва, у імя нагляднага параўнальнага вывучэння побыту патрабуем ажыўлення».

Галасы паловы раструбаў: «Правільна, прыняць!», частка галасоў: «Далоў!» Галасы змаўкаюць раптоўна. Экран гасне. Другі званок, загараецца новая рэзалюцыя. Прамоўца паўтарае.

«Рэзалюцыя санітарна-кантрольных пунктаў металургічных і хімічных прадпрыемстваў Данбаса. Каб пазбегнуць небяспекі распаўсюджання бактэрый падхалімства і зазнайства, характэрных для дваццаць дзевятага года, патрабуем пакінуць экспанат у замарожаным стане».

Галасы раструбаў: «Далоў!» Адзінокія выгукі: «Правільна!»

Ёсць яшчэ рэзалюцыі і дадаткі?

Загараецца трэці экран, прамоўца паўтарае.

«Земляробчыя раёны Сібіры просяць ажыўляць восенню, па сканчэнні палявых работ, для аблягчэння магчымасці прысутнасці шырокіх мас жадаючых».

Пераважная колькасць галасоў-труб: «Далоў!», «Адхіліць!» Лямпы загараюцца.

Стаўлю на галасаванне: хто за першую рэзалюцыю, прашу падняць рукі!

Падымаецца пераважная большасць жалезных рук.

Апусціць! Хто за папраўку Сібіры?

Падымаюцца дзве рэдкія рукі.

Сход федэрацыі пастанавіў: «А-жы-віць!»

Гул усіх раструбаў: «Ура!» Галасы сціхаюць.

Пасяджэнне скончана!

З двух расхінутых дзвярэй урываюцца рэпарцёры. Прамоўца прыпыняецца, потым радасна кідае на ўсе бакі:

Ажывіць! Ажывіць! Ажывіць!!

Рэпарцёры выцягваюць з кішэняў мікрафоны, на хаду крычаць.

1-шы рэпарцёр

Алё!!! Хваля 472,5 метра... «Чукоцкія навіны»... Ажывіць!

2-гі рэпарцёр

Алё! Алё!!! Хваля 376 метраў... «Віцебская вячэрняя праўда».... Ажывіць!

3-ці рэпарцёр

Алё! Алё! Алё! Хваля 211 метраў... «Варшаўская камсамольская праўда»... Ажывіць!

4-ты рэпарцёр

«Армавірскі літаратурны панядзелак». Алё! Алё!

5-ты рэпарцёр

Алё! Алё! Алё! Хваля 44 метры. «Паведамленні чыкагскага савета»... Ажывіць!

6-ты рэпарцёр

Алё! Алё! Алё! Хваля 115 метраў... «Рымская чырвоная газета»... Ажывіць!

7-мы рэпарцёр

Алё! Алё! Алё! Хваля 78 метраў... «Шанхайская бедната»... Ажывіць!

8-мы рэпарцёр

Алё! Алё! Алё! Хваля 220 метраў... «Мадрыдская батрачка»... Ажывіць!

9-ты рэпарцёр

Алё! Алё! Алё! Хваля 11 метраў... «Кабульскі піянер»... Ажывіць!

Газетчыкі ўрываюцца з гатовымі адбіткамі.

1-шы газетчык

Размарозіць
ці не размарозіць?
Артыкулы
ў вершах і ў прозе!

2-гі газетчык

Сусветная анкета па важнейшай тэме —
Аб магчымасці заноса падхалімскіх эпідэмій!

3-ці газетчык

Артыкул пра даўнія
гітары і рамансы

І іншыя спосабы
аблапошвання масы!

4-ты газетчык

Апошнія навіны!!! Інтэрв'ю! Інтэрв'ю!

5-ты газетчык

Навуковы веснік —
усё незвычайна! —
З поўным пералікам
так званых лаянак!

6-ты газетчык

Апошняе радыё!

7-мы газетчык

Пытанні гісторыі —
для ўсіх навіна:
Ці зваліць
адна папяроса
слана!

8-мы газетчык

Сумна да слёз
і смешна да колік:
Даём тлумачэнне
слова «алкаголік!»!

VI

Матавыя шкляныя двухстворкавыя дзверы, праз сцэны прасвечваюць металічныя часткі медыцынскіх апаратаў. Перад сцяной стары прафесар і пажылая асістэнтка, у якой яшчэ захаваліся характэрныя рысы Зоі Бярозкінай. Абое ў белым, бальнічным.

Зоя Бярозкіна

Таварыш! Таварыш прафесар, прашу вас, не

рабіце гэтага эксперымента. Таварыш прафесар, зноў пойдзе буза...

Прафесар

Таварыш Бярозкіна, вы сталі жыць успамінамі і загаварылі незразумелай мовай. Суцэльны слоўнік вымерлых слоў. Што такое «буза»? *(Шукае ў слоўніку.)* Буза... Буза... Буза... Багема, бюракратызм, богашукальніцтва *, бублікі, Булгакаў *... Буза — гэта род дзейнасці людзей, якія заміналі ўсякаму роду дзейнасці...

Зоя Бярозкіна

Гэтая ягоная «дзейнасць» пяцьдзесят год таму назад ледзь не каштавала мне жыцця. Я нават дайшла да... спробы самагубства.

Прафесар

Самагубства? Што такое «самагубства»? *(Шукае ў слоўніку.)* Самаабкладанне *, самаўладства, самарэклама, самаўшчыльненне... Знайшоў «самагубства». *(Здзіўлена.)* Вы стралялі ў сябе? Прыгавор? Суд? Рэўтрыбунал?

Зоя Бярозкіна

Не... Я сама.

Прафесар

Сама? Ад неасцярожнасці?

Зоя Бярозкіна

Не... Ад кахання.

Прафесар

Глупства... Ад кахання трэба масты будаваць і дзяцей раджаць. А вы... Так! Так! Так!

Зоя Бярозкіна

Вызвальце мяне, я, дапраўды, не магу.

Прафесар

Гэта і ёсць... Як вы сказалі... Буза. Так! Так! Так! Так! Буза! Грамадства прапануе вам выявіць усе, якія маюцца ў вас, пачуцці для максімальнай лёгкасці пераадолення размарожваемым суб'ектам пяцідзесяці анабіёзных * год. Так! Так! Так! Так! Ваша прысутнасць вельмі, вельмі патрэбна. Я рад, што вы знайшліся і прыйшлі. Ён — гэта ён! А вы — гэта яна! Скажыце, а вейкі ў яго былі мяккія? На выпадак паломкі пры хуткім размарожванні.

Зоя Бярозкіна

Таварыш прафесар, як жа я магу запомніць вейкі, якія былі пяцьдзесят год таму назад...

Прафесар

Як? Пяцьдзесят год таму назад? Гэта ўчора!.. А як я помню колер валасоў на хвасце мастадонта * паўмільёна год таму назад? Так! Так! Так!.. А вы не памятаеце,— ён моцна раздзімаў ноздры пры ўдыханні ва ўзрушанай кампаніі?

Зоя Бярозкіна

Таварыш прафесар, як жа я магу памятаць?! Ужо трыццаць год ніхто не раздзімае ноздраў у такіх выпадках.

Прафесар

Так! Так! Так! А вы не дасце даведку адносна аб'ёма страўніка і печані, на выпадак выдзялення магчымай наяўнасці спірту і гарэлкі, якія могуць успыхнуць пры неабходным высокім вальтажы?

Зоя Бярозкіна

Адкуль я магу запомніць, таварыш прафесар? Памятаю, быў нейкі жывот...

Прафесар

Ах, вы нічога не памятаеце, таварыш Бярозкіна! Прынамсі, хоць ці быў ён парывісты?

Зоя Бярозкіна

Не ведаю... Магчыма, але... толькі не са мной.

Прафесар

Так! Так! Так! Баюся, што мы адмарожваем яго, а адмерзлі пакуль што вы. Так! Так! Так! Ну-с, пачынаем.

Націскае кнопку, шкляныя дзверы ціха разыходзяцца. Пасярэдзіне, на аперацыйным стале, бліскучая ацынкаваная скрынка чалавечых памераў. Каля скрынкі краны, пад кранамі вёдры. Да скрынкі ідуць электраправады. Цыліндры кіслароду. Вакол скрынкі шэсць урачоў, белых і спакойных. Перад скрынкай на авансцэне шэсць фантанных умывальнікаў. На нябачным дроце, як на паветры, шэсць уціральнікаў.

Прафесар

(пераходзіць ад урача да ўрача, гаворыць)

(Першаму.)

Ток уключыць па майму сігналу.

(Другому.)

Давядзіце цеплыню да 36,4, пятнаццаць секунд кожная дзесятая.

(Трэцяму.)

Падушкі кіслароду напагатове?

(Чацвёртаму.)

Ваду выпускаць паступова, замяняючы лёд паветраным ціскам.

(Пятаму.)

Накрыўку адкрыць адразу.

(Шостаму.)

Наглядаць праз люстра стадыі ажыўлення.

Урачы нахіляюць галовы ў знак яснасці, разыходзяцца па сваіх месцах.

Пачынаем.

Уключаецца ток, сочаць за тэмпературай. Капае вада. Каля маленькай правай сценкі з люстрам уважліва-напружаны доктар.

6-ты ўрач

З'яўляецца натуральная афарбоўка!

Паўза.

Вызвалены ад ільду!

Паўза.

Грудзі вібрыруюць!

Паўза.

(Спалохана.)

Прафесар, звярніце ўвагу на ненатуральную парывістасць...

Прафесар

(падыходзіць, углядаецца, супакойліва)

Рухі нармальныя, чухаецца,— напэўна, ажываюць уласцівыя падобным індывідуумам паразіты.

6-ты ўрач

Прафесар, незразумелая рэч; рухам левай рукі аддзяляецца ад цела...

Прафесар

(узіраецца)

Ён зросся з музыкай, яны называлі гэта «чулай душой». У старадаўнасці жылі Страдыварыус * і Уткін *. Страдыварыус рабіў скрыпкі, а гэта рабіў Уткін, і называлася гэта гітарай.

Прафесар аглядае тэрмометр і апарат, які рэгіструе ціск крыві.

1-шы ўрач

36,1.

2-гі ўрач

Пульс 68.

6-ты ўрач

Дыханне выраўнена.

Прафесар

Па месцах!

Урачы адыходзяць ад скрынкі. Накрыўка ў адзін момант адкінулася, са скрынкі падымаецца ўскудлачаны і здзіўлены Прысыпкін, азіраецца, прыціскаючы гітару.

Прысыпкін

Ну, і выспаўся! Даруйце, таварышы, вядома, выпімшы быў. Гэта якое аддзяленне міліцыі?

Прафесар

Не, гэта зусім другое аддзяленне. Гэта — аддзяленне ад ільду скурнага покрыва, якое вы адмарозілі...

Прысыпкін

Чаго? Гэта вы чагой-та адмарозілі. Яшчэ пабачым, хто з нас былі п'яныя. Вы, як спецы-дактары, заўсёды самі каля спіртоў ацiраецеся. А я сябе, як асоба, заўжды засведчыць здолею. Дакументы пры мне. *(Выскачыў са скрынкі, вывернуў кішэні.)* 17 руб. 60 кап. пры мне. У МОПР? * Заплаціў. У Асаавіяхім? Унёс. «Далоў непісьменнасць»? Калі ласка. Гэта што? Выпіска з загса! *(Свіснуў.)* Ды я ж учора ажаніўся! Дзе вы цяпер, хто вам цалуе пальцы? * Ну і ўсыплюць мне дома! Распіска

шафераў тут. Прафсаюзны білет тут. *(Позірк падае на каляндар, трэ вочы, азіраецца з жахам.)* 12 мая 1979 года! Гэта ж за колькі ў мяне ў прафсаюз не плочана! Пяцьдзесят год! Даведак жа, даведак запатрабуюць! Губаддзел! ЦК! Божачка! Жонка!!! Пусціце! *(Цісне ўсім рукі, кідаецца да дзвярэй.)*

За ім занепакоеная Бярозкіна. Дактары абступаюць прафесара.

Х о р а м

Гэта што ён такое рукамі выробляў? Соваў і трэс, трэс і соваў...

П р а ф е с а р

У старажытнасці быў такі антысанітарны звычай.

Шэсць урачоў і прафесар задумліва мыюць рукі.

П р ы с ы п к і н
(натыкаецца на Зою)

Якія вы, грамадзяне, уласна кажучы, ёсць? Хто я? Дзе я? Ці не маці вы Зоі Бярозкінай будзеце?

Выццё сірэны павярнула прысыпкінскую галаву.

Куды я папаў? Куды мяне папалі? Што гэта?.. Масква?.. Парыж?.. Н'ю-Йорк?.. Рамізнік!!!

Выццё аўтамабільных сірэн.

Ні людзей, ні коней! Аўтадоры, аўтадоры, аўтадоры!!! * *(Прыціскаецца да дзвярэй, чухаецца спіной, шукае пяцярнёй, паварочваецца, бачыць на белай сцяне клапа, які перапоўз туды з каўнерыка.)*

Клоп, клопік, клапуньчык!!! *(Перабірае струны, пяе.)* Не пакідай, пабудзь са мною...* *(Ловіць*

клапа пяцярнёй; клоп знік.) Мы разышліся, бы ў моры караблі... Уцёк! ...Адзін! Але няма адказу мне, ізноў адзін я... Адзін!!! Рамізнік, аўтадоры... Вуліца Луначарскага, 17! Без рэчаў!!! *(Хапаецца за галаву, падае ў непрытомнасці на рукі Зоі Бярозкінай, якая выбягае насустрач з дзвярэй.)*

VII

Сярэдзіна сцяны — трохкутнік сквера. У скверы тры штучныя дрэвы. Першае дрэва: на зялёных квадратах-лістах — вялізныя талеркі, на талерках мандарыны. Другое дрэва — папяровыя талеркі, на талерках яблыкі. Трэцяе — зялёнае, з яловымі шышкамі,— адкрытыя флаконы духоў. Бакі — шкляныя і абліцаваныя сцены дамоў. Па баках трохкутніка — доўгія лаўкі. Уваходзіць рэпарцёр, за ім чацвёра: мужчыны і жанчыны.

Рэпарцёр

Таварышы, сюды, сюды! У цень! Я вам раскажу па парадку пра ўсе гэтыя сумныя і дзіўныя здарэнні. Па-першае... Перадайце мне мандарыны. Гэта правільна робіць гарадское самакіраўніцтва, што сягоння дрэвы мандарыняцца, а то ўчора былі адны грушы — і ні соку, і ні смаку, і ні пажыўнасці...

Дзяўчына знімае з дрэва талерку з мандарынамі, прысутныя абіраюць мандарыны, ядуць, з цікаўнасцю нахіляюцца да рэпарцёра.

1-шы мужчына

Ну, хутчэй, таварыш, расказвайце ўсё падрабязна і па парадку.

Рэпарцёр

Дык вось... Якія сакаўныя лустачкі! Не жадаеце?.. Ну, добра, добра, расказваю. Падумаеш, не-

цярплівась! Безумоўна, мне, як прэзідэнту рэпартажа, вядома ўсё... Дык вось, бачыце, бачыце?..

Хуткай хадою праходзіць чалавек, у якога доктарская скрынка з тэрмометрамі.

Рэпарцёр

Гэта — ветэрынар. Эпідэмія распаўсюджваецца. Будучы пакінутае адно, гэтае ажыўленае млекакормячае ўступіла ў зносіны з усімі хатнімі жывёламі небаскроба, і цяпер усе сабакі пашалелі. Яно прывучыла іх стаяць на задніх лапах. Сабакі не брэшуць і не гуляюць, адно — віляюць хвастом. Жывёлы прыстаюць да ўсіх, хто абедае, падлашчваюцца і падлізваюцца. Урачы кажуць, што людзі, пакусаныя такімі жывёламі, набудуць усе першасныя адзнакі эпідэмічнага падхалімства.

Прысутныя

О-о-о!!!

Рэпарцёр

Глядзіце, глядзіце!

Хісткай хадою праходзіць чалавек, нагружаны кошыкамі з бутэлькамі піва.

Прахожы

(напявае)

У дзевятнаццатым стагоддзі
Брат наш быў дзівак, дый годзе —
Піў гарэлку ён і піва,
Шызы нос вісеў, як сліва!

Рэпарцёр

Глядзіце, скончаны, хворы чалавек! Гэта адзін са ста сямідзесяці пяці рабочых другой медыцынскай лабараторыі. У мэтах аблягчэння пераходнага існавання ўрачамі было прызначана паіць

уваскрэсенае млекакормячае сумессю, атрутнай у вялікіх дозах і агіднай у малых, так званым півам. У іх ад ядавітых выпарэнняў закружылася галава, і яны па памылцы глынулі гэтай прахалаepisode джальнай сумесі. І з таго часу мяняюць ужо трэцюю партыю рабочых. Пяцьсот дваццаць рабочых ляжаць у бальніцах, але страшная эпідэмія трохгорнай чумы * пеніцца, бурліць і падкошвае ногі.

Прысутныя

А-а-а-а!!!

Мужчына

(летуценна і пакутліва)

Я б аддаў сябе ў ахвяру навуцы,— хай прышчэпяць і мне гэтую загадкавую хваробу!

Рэпарцёр

Гатоў! І гэты гатоў! Ціха... Не спалохайце гэтую лунатычку...

Праходзіць дзяўчына, ногі заплятаюцца ў па факстрота і чарльстона *, мармыча вершы па кніжцы ў двух пальцах выцягнутай рукі. У двух пальцах другой рукі ўяўляемая ружа, падносіць да носа і ўдыхае.

Няшчасная, яна жыве побач з ім, з гэтым шалёным млекакормячым, і вось ноччу, калі горад спіць, праз сценку сталі даносіцца да яе гітарныя ракатанні, потым працяжныя душараздзіральныя прыдыханні і ўсхліпы нараспеў, як гэта ў іх называецца? «Рамансы», ці што? Далей-болей, і небарака-дзяўчына стала вар'яцець. Прыгнечаныя горам бацькі збіраюць кансіліум. Прафесары кажуць, што гэта прыступы вострай «закаханасці»,— так называлася старажытная хвароба, калі чалавечая палавая энергія, якая разумна размяркоўваецца на ўсё жыццё, раптам скарацечна кандэнсуецца ў

тыдзень у адным запаленчым працэсе, ведучы да бязглуздых і неверагодных учынкаў.

Дзяўчына
(закрывае вочы рукамі)

Я лепш не буду глядзець, я адчуваю, як па паветры расплываюцца гэтыя жахлівыя мікробы кахання.

Рэпарцёр

Гатова, і гэтая гатова... Эпідэмія акіяніцца.

30 герлс* праходзяць у танцы.

Глядзіце на гэтую трыццацігаловую шасцідзесяціножку! Падумаць толькі — і гэтае ўзбрыкванне нагамі *(да аўдыторыі)* абзывалі мастацтвам!

Пара ў факстроце.

Эпідэмія дайшла... дайшла... да чаго дайшла? *(Глядзіць у слоўнік.)* Да а-па-гея, ну... гэта ўжо двуполая жывёла.

Убягае дырэктар заалагічнага сада з невялікім шкляным куфэрачкам у руках. За дырэктарам натоўп, узброены падзорнымі трубамі, фотаапаратамі і пажарнымі лесвіцамі.

Дырэктар
(да ўсіх)

Бачылі? Бачылі? Дзе ён? Ах, вы нічога не бачылі!!! Атрад паляўнічых данёс, што яго бачылі тут чвэрць гадзіны таму назад: ён перабіраўся на чацвёрты паверх. Калі ўлічыць сярэднюю яго хуткасць паўтара метра ў гадзіну, дык ён не мог уцячы далёка. Таварышы, зараз жа агледзьце сцены!

Наглядальнікі развінчваюць глядзельныя трубы, з лавак ускакваюць, узіраюцца, засланяючы вочы. Дырэктар размяркоўвае групы, кіруе пошукамі.

Галасы

Хіба яго знойдзеш!.. Трэба голага чалавека на сянніку ў кожным акне выставіць — ён на чалавека бяжыць...

Не крычыце, спалохаеце!!!

Калі я знайду, я нікому не аддам...

Не маеш права: ён камунальны набытак...

Урачысты голас

Знайшоў! Ёсць! Паўзе!..

Біноклі і глядзельныя трубы накіраваны ў адну кропку. Маўчанне, якое перарываецца шчоўканнем фота- і кінаапаратаў.

Прафесар

(прыглушаным шэптам)

Так... Гэта ён! Пастаўце засады і варту. Пажарныя, сюды!!!

Людзі з сеткамі абкружаюць месца. Пажарнікі развінчваюць лесвіцу, людзі караскаюцца адзін за адным.

Дырэктар

(апускае трубу, панылым голасам)

Уцёк... На суседнюю сцяну папоўз... О! Сарвецца — заб'ецца! Смельчакі, добраахвотнікі, героі!!! Сюды!!!

Развінчваюць лесвіцу перад другой сцяной, ускарасквающца. Гледачы заміраюць.

Голас захаплення зверху

Злавіў! Ура!

Дырэктар

Хутчэй!!! Асцярожней!!! Не ўпусціце, не пакамечце жывёліне лапкі...

Па лесвіцы з рук у рукі перадаюць звера, нарэшце ён у дырэктарскіх руках. Дырэктар хавае звера ў куфэрак і падымае куфэрак над галавой.

Дзякуй вам, непрыкметныя працаўнікі навукі! Наш заалагічны сад ашчасліўлены, маючы такі шэдэўр... Мы злавілі вельмі рэдкі экземпляр вымерлага і папулярнейшага ў пачатку стагоддзя насякомага. Наш горад можа ганарыцца — да нас будуць сцякацца вучоныя і турысты... Тут, у маіх руках, адзіны на свеце жывы «клопус нармаліс». Разыходзьцеся, грамадзяне: жывёліна заснула, жывёліна склала лапкі, жывёліна хоча спаць. Я запрашаю вас усіх на ўрачыстае адкрыццё ў заапарк. Важнейшы, трывожнейшы акт злаўлення завершаны!

VIII

Гладкія, апалавыя, напаўпразрыстыя сцены пакоя. Зверху, з-за карніза роўная палоска блакітнаватага святла. Злева вялікае акно. Перад акном рабочы чарцёжны стол. Радыё. Экран. Некалькі кніг. Справа высунуты са сцяны ложак, на ложку, пад чысцюткай коўдрай, найбруднейшы Прысыпкін. Венцілятары. Вакол Прысыпкіна ўсё забруджана. На стале акуркі, перакуленыя бутэлькі. На лямпе абрывак ружовай паперы. Прысыпкін стогне. Урач нервова ходзіць па пакоі.

Прафесар

(уваходзіць)

Як справы хворага?

Урач

Хворага — не ведаю, а мае агідныя! Калі вы не наладзіце змену кожнай паўгадзіны,— ён пераразарзіць усіх. Як дыхне, дык у мяне ногі падкошваюцца! Я ўжо сем вентылятараў паставіў: смурод разганяць.

Прысыпкін

О-о-о!

Прафесар кідаецца да Прысыпкіна.

Прысыпкін

Прафесар, о прафесар!!!

Прафесар цягне носам і адхінаецца і, хістаючыся, ловіць паветра рукамі.

Прысыпкін

Пахмяліцца...

Прафесар налівае піва на донца шклянкі, падае.

Прысыпкін

(прыпадымаецца на локцях, дакорліва)

Уваскрэсілі... і здзекуюцца. Што гэта мне — як слану ліманад!..

Прафесар

Грамадства спадзяецца развіць цябе да ступені чалавека.

Прысыпкін

Чорт з вамі і з вашым грамадствам! Я вас не прасіў мяне ажыўляць. Замарозьце мяне зноў! Во!!!

Прафесар

Не разумею, пра што ты гаворыш? Наша жыццё належыць калектыву, і ні я, ні хто іншы не могуць гэтае жыццё...

Прысыпкін

Ды якое ж гэта жыццё, калі нават картку любімай дзяўчыны нельга да сценкі прыкнопіць? Усе кнопкі аб праклятае шкло абламваюцца... Таварыш прафесар, дайце пахмяліцца.

Прафесар

(налівае шклянку)

Толькі не дыхайце ў мой бок.

Зоя Бярозкіна ўваходзіць з двума стосікамі кніг. Урачы перагаворваюцца з ёй шэптам, выходзяць.

Зоя Бярозкіна

(сядае каля Прысыпкіна, распакоўвае кнігі)

Не ведаю, ці спатрэбіцца гэта. Пра што ты казаў, гэтага няма, і ніхто не ведае пра гэта. Ёсць пра ружы толькі ў падручніках садоўніцтва, ёсць мроі толькі ў медыцыне, у аддзеле сноў. Вось дзве найцікавейшыя кнігі прыблізна таго часу. Пераклад з англійскай: Хувер * — «Як я быў прэзідэнтам».

Прысыпкін

(бярэ кнігу, адкідвае)

Не, гэта не для сэрца, трэба такую, каб замірала...

Зоя Бярозкіна

Вось другая — нейкага Мусаліні *: «Пісьмы з ссылкі».

Прысыпкін

(бярэ, адкідвае)

Не, гэта ж не для душы. Адчапіцеся вы з вашымі грубымі агіткамі. Трэба, каб шчыпала...

Зоя Бярозкіна

Не ведаю, што гэта такое? Замірала, шчыпала... Шчыпала, замірала.

Прысыпкін

Што ж гэта? За што мы стараліся, кроў пралівалі, калі мне, гегемону, значыцца, у сваёй кампаніі ў новавывучаным танцы і растанцавацца нельга?

Зоя Бярозкіна

Я паказвала рухі вашага цела нават дырэктару цэнтральнага інстытута рухаў. Ён кажа, што

бачыў нешта гэтакае на старых калекцыях парыжскіх паштовак, а цяпер, кажа, пра такое і спытацца няма ў каго. Ёсць дзве бабулі — памятаюць, але паказаць не могуць па прычынах рэўматычных.

Прысыпкін

Дык для чаго ж я сабе патомную прыгожую адукацыю выпрацоўваў? Працаваць жа я ж і да рэвалюцыі мог.

Зоя Бярозкіна

Я вазьму цябе заўтра на танец дзесяці тысяч рабочых і работніц, будуць рухацца на плошчы. Гэта будзе вясёлая рэпетыцыя новай сістэмы палявых работ.

Прысыпкін

Таварышы, я пратэстую!!! Я ж не для таго размёрз, каб вы мяне цяпер засушылі. *(Зрывае коўдру, усхопліваецца, хапае згорнуты стос кніг і вытрасае яго з паперы. Хоча падзерці паперу і раптам углядаецца ў літары, перабягае ад лямпы да лямпы.)* Дзе? Дзе вы гэта ўзялі?..

Зоя Бярозкіна

На вуліцах усім раздавалі... Мусіць, у бібліятэцы ў кнігі паклалі.

Прысыпкін

Выратаваны!!! Ура!!!

(Кідаецца да дзвярэй, як флагам, развявае паперкай.)

Зоя Бярозкіна

(адна)

Я пражыла пяцьдзесят год наперад, а магла памерці пяцьдзесят год назад праз такую погань...

IX

Заалагічны сад. Пасярэдзіне на п'едэстале клетка, задрапіраваная матэрыямі і сцягамі. Па-за клеткай два дрэвы. За дрэвамі клеткі сланоў і жырафаў. Злева ад клеткі трыбуна, справа — узвышэнне для ганаровых гасцей. Усюды музыканты. Групамі падыходзяць гледачы. Распарадчыкі з бантамі расстаўляюць падышоўшых — па роду заняткаў і ўзросту.

Распарадчык

Таварышы замежныя карэспандэнты, сюды! Бліжэй да трыбун! Саступіце ўбок і дайце месца бразільцам! Іх аэракарабель зараз прызямляецца на цэнтральным аэрадроме. *(Адступае, любуецца.)* Таварышы негры, стойце ўперамежку з англічанамі прыгожымі каляровымі групамі, англасаксонская белізна яшчэ больш падкрэсліць вашу аліўкавасць... Студэнты вузаў — налева, да вас накіраваны тры бабулі і тры старыя з саюза стогадовых. Яны будуць дапаўняць тлумачэнні прафесараў апавяданнямі сведкаў.

Уязджаюць на калясках стогадовыя старыя.

1-я старая

Як зараз помню...

1-шы стары

Не, гэта я помню як зараз!

2-я старая

Вы помніце, як зараз, а я помню, як раней.

2-гі стары

А я як зараз помню, як раней.

3-я старая

А я помню, як яшчэ раней, зусім, зусім рана.

3-ці стары

А я помню і як зараз і як раней.

Распарадчык

Ціха, сведкі, не шапяляйце! Расступіцеся, таварышы, дарогу дзецям! Сюды, таварышы! Хутчэй! Хутчэй!!!

Дзеці

(маршыруюць калонай з песняй)

Вучоба наша —
спраўная:
На колішняе «яць»!
Затое ўсе
і слаўна мы
Умеем гуляць.
Іксы
і ігрэкі
Здалі
ў дні вясны.
Ідзём
туды,
дзе цігрыкі
І дзе
сланы!
Сюды,
дзе зверы многія,
І мы
з людзьём
У сад
заалогіі
Ідзём!
Ідзём!
Ідзём!

Распарадчык

Грамадзяне, якія жадаюць зрабіць экспанатам

прыемнасць, а таксама выкарыстаць іх у навуковых мэтах, хай маюць ласку набываць дазіраваныя экзатычныя прадукты і навуковыя прыборы выключна ў афіцыйных служыцеляў заасада. Дылетантства і гіпербала ў дозах — смяртэльныя. Просім карыстацца толькі гэтымі прадуктамі і прыборамі, выпушчанымі цэнтральным медыцынскім інстытутам і гарадскімі лабараторыямі дакладнай механікі.

По садзе і тэатру ідуць служыцелі заасада.

1-шы служыцель

Разглядваць
бактэрыі
нельга на дотык.
Вось мікраскопы —
выдатнай работы!

2-гі служыцель

Мець пры сабе
раіць доктар Таболкін *
На выпадак аплёўвання
раствор карболкі.

3-ці служыцель

Кармленне экспанатаў —
незабыўная карціна!
Бярыце
дозы
алкаголя і нікаціна!

4-ты служыцель

Паіце алкаголем —
і жывёліны забяспечаны
Падаграй,
ідыятызмам
і расшырэннем печані.

5-ты служыцель

Гваздзіка агню
і дым-тубероза
Гарантуюць
100
працэнтаў
скляроза.

6-ты служыцель

Узбройвайце вушы,—
навушнікі адмыслова
Затрымліваюць
кожнае
грубае слова.

Распарадчык

(расчышчае праход да трыбуны гарсавета)

Таварыш старшыня і яго бліжэйшыя супрацоўнікі пакінулі найважнейшую працу і пад старадаўні дзяржаўны марш прыбылі на нашу ўрачыстасць. Вітаем дарагіх таварышаў!

Усе апладыруюць, праходзіць група з партфелямі, паважна раскланьваецца і спявае.

Служба
і годы
Не зморшчылі нас.
Справа —
заўсёды,
Забава —
раз!
Прывет вам
ад горада,
Лаўцы і стралкі!

Мы вамі
гордыя.
Мы —
горада бацькі!!!

Старшыня

(узыходзіць на трыбуну, узмахвае флагам, усё заціхае)

Таварышы, аб'яўляю ўрачыстасць распачатай. Нашы гады багатыя глыбокімі хваляваннямі і перажываннямі ўнутранага характару. Знешнія падзеі рэдкія. Чалавецтва, стомленае ад папярэдніх падзей, нават рада гэтаму адноснаму спакою. Аднак мы ніколі не адмаўляемся ад відовішча, якое, будучы феерычным па знешнасці, хавае пад ружовым апярэннем глыбокі навуковы сэнс. Сумныя выпадкі ў нашым горадзе, што з'явіліся вынікам неабачлівага дапушчэння прабывання ў ім двух паразітаў, выпадкі гэтыя маімі сіламі і сіламі сусветнай медыцыны ліквідаваны. Аднак гэтыя выпадкі, што тлеюць слабым напамінам мінулага, падкрэсліваюць жах зрынутага часу і велічнасць і цяжкасць культурнай барацьбы рабочага чалавецтва.

Хай жа загартуюцца душы і сэрцы нашай моладзі на гэтых злавесных прыкладах!

Не магу не адзначыць падзякай і даю слова праслаўленаму нашаму дырэктару, які разгадаў сэнс дзіўных з'яў і зрабіў са згубных выпадкаў навуковае і вясёлае правядзенне часу.

Ура!!!

Усе крычаць «ура», музыка іграе туш, на трыбуну ўзыходзіць дырэктар заалагічнага сада, раскланьваецца.

Дырэктар

Таварышы! Я ўзрадаваны і ўсхваляваны вашай

увагай. Улічваючы і свой удзел, я не магу ўсё ж не выказаць падзякі адданым працаўнікам саюза паляўнічых, якія з'яўляюцца непасрэднымі героямі злаўлення, а таксама паважанаму прафесару інстытута ажыўлення, які перамог замарожваючую смерць. Хаця я і не магу не адзначыць, што першая памылка паважанага прафесара была ўскоснай прычынай вядомых бедстваў. Па знешніх мімікрыйных * прыкметах — мазалях, вопратцы і іншаму — паважаны прафесар памылкова прылічыў размарожанае млекакормячае да «гомо сапіенс» * і да яго вышэйшага віду — да класа рабочых. Не прыпісваю поспех выключна сваёй працяглай практыцы з жывёламі і пранікненню ў іх псіхалогію. Мне дапамог выпадак. Няясная, падсвядомая надзея цвердзіла: «Напішы, дай, зрабі аб'яву». І я даў:

«Зыходзячы з прынцыпаў заасада, шукаю жывое чалавечае цела для пастаянных абкусванняў і для ўтрымання і развіцця свежанабытага насякомага ў прывычных для яго, звычайных умовах».

Голас з натоўпу

Ах, які жах!

Дырэктар

Я разумею, што жах, я сам не верыў уласнаму абсурду, і раптам... істота з'яўляецца! Яе выгляд амаль чалавечы... Ну, вось як мы з вамі...

Старшыня Савета
(звоніць у званок)

Таварыш дырэктар, я заклікаю вас да парадку!

Дырэктар

Даруйце, даруйце! Я, вядома, зараз жа шляхам апытання і параўнаўчай звералогіі ўпэўніўся,

што мы маем справу са страшным чалавекападобным сімулянтам, і што гэта самы страшэнны паразіт. Не буду ўдавацца ў падрабязнасці, тым больш што яны вам зараз адкрыюцца ў гэтай у поўным сэнсе дзіўнай клетцы.

Іх двое — розных памераў, але аднолькавых па сутнасці: гэта славутыя «клопус нармаліс» і... і «абываценіус вульгарыс». Абодва водзяцца ў затхлых матрацах часу.

«Клопус нармаліс», растлусцеўшы і ўпіўшыся на целе аднаго чалавека, падае пад ложак.

«Абываценіус вульгарыс», растлусцеўшы і ўпіўшыся на целе ўсяго чалавецтва, падае на ложак. Уся розніца!

Калі працоўнае чалавецтва рэвалюцыі абчэсвалася і курчылася, саскрабаючы з сябе бруд, яны звівалі сабе ў гэтым самым брудзе гнёзды і домікі, білі жонак і прысягалі Бебелем *, і адпачывалі і бесклапотна праводзілі час у шатрах уласных галіфэ. Але «абываценіус вульгарыс» яшчэ страшнейшы. З яго пачварнай мімікрыяй ён заваблівае тых, каго абкусвае, прыкідваючыся то цвыркуном-вершаплётам, то рамансагалосай птахай. У тыя часы нават адзенне ў іх было мімікруючым — птушынае аблічча — крылатка і хвастаты фрак са снежна-белай крухмальнай грудкай. Такія птахі звівалі гнёзды ў ложах тэатраў, грувасціліся на дубах опер, пад Інтэрнацыянал у балетах чухалі нага аб нагу *, звісалі з галінак радкоў, стрыглі Талстога пад Маркса, галасілі і енчылі ў абуральных колькасцях ...даруйце за выраз, але мы на навуковым дакладзе, паскудзілі ў колькасцях, якія не могуць быць разглядаемыя, як дробная птушыная прыкрасць.

Таварышы! Аднак... пераконвайцеся самі!

Робіць знак, служыцелі раскрываюць клетку; на п'едэста-

ле клапіны куфэрак, за ім узвышэнне з двухспальным ложкам. На ложку Прысыпкін з гітарай. Зверху ў клетцы звешваецца жоўтая абажурная лямпа. Над галавой Прысыпкіназзяючы вянок — веер паштовак. Бутэлькі стаяць і ляжаць на падлозе. Клетка абкружана плявальніцамі. На сценах клеткі — надпісы, з бакоў — фільтры і азанатары. Надпісы: 1. «Асцярожна — плюецца!» 2. «Без даклада не ўваходзіць!» 3. «Беражыце вушы — яно лаецца!» Музыка сыграла туш; асвятленне бенгальскае; адрынуты натоўп

набліжаецца, анямелы ад захаплення.

Прысыпкін

На Луначарскай вуліцы
Стары я помню дом —
З шырокай цёмнай лесвіцай,
З завешаным акном!..

Дырэктар

Таварышы, падыходзьце, не бойцеся,— яно зусім ціхмянае. Падыходзьце, падыходзьце! Не хвалюйцеся: чатыры фільтры па баках затрымліваюць лаянку на ўнутраным баку клеткі, і вонкі даходзяць нешматлікія, але зусім годныя словы. Фільтры прачышчаюцца штодзённа спецыяльнымі служыцелямі ў супрацьгазах. Глядзіце, яно будзе зараз так званае «курыць».

Голас з натоўпа

Ах, які жах!

Дырэктар

Не бойцеся — зараз яно будзе так званае «натхняцца». Скрыпкін,— перакуліце!

Скрыпкін цягнецца да бутэлькі з гарэлкай.

Голас з натоўпа

Ах, не трэба, не трэба, не мучайце бедную жывёліну!

Дырэктар

Таварышы, гэта ж зусім не страшна: яно руч-

ное! Глядзіце, я яго выведу зараз на трыбуну. *(Ідзе да клеткі, надзявае пальчаткі, правярае пістолеты, адчыняе дзверы, выводзіць Скрыпкіна, ставіць яго на трыбуну, паварочвае тварам да месцаў пачэсных гасцей.)*

Ану, скажыце што-небудзь кароценькае, пераймаючы чалавечы выраз, голас і мову.

Скрыпкін

(пакорліва становіцца, пакашлівае, падымае гітару і раптам паварочваецца і кідае позірк у глядзельную залу. Твар Скрыпкіна мяняецца, ён у захапленні. Скрыпкін адштурхоўвае дырэктара, кідае гітару і крычыць у глядзельную залу)

Грамадзяне! Браткі! Свае! Родныя! Адкуль? Колькі вас? Калі ж вас усіх размарозілі? Чаму ж я адзін у клетцы? Родныя, браткі, прашу ўсіх да мяне! За што ж я пакутую? Грамадзяне!..

Галасы гасцей

Дзяцей, адвядзіце дзяцей...
Намордпік... намордпік яму...
Ах, які жах!
Прафесар, спыніце!
Ах, толькі не страляйце!

Дырэктар з вентылятарам, у суправаджэнні двух служыцеляў, узбягае на эстраду. Служыцелі адцягваюць Скрыпкіна. Дырэктар праветрывае трыбуну. Музыка іграе туш. Служыцелі закрываюць клетку.

Дырэктар

Даруйце, таварышы... Даруйце... Насякомае стамілася. Шум і святло кінулі яго ў стан галюцынацыі. Супакойцеся. Нічога такога няма. Заўтра яно супакоіцца... Ціха, грамадзяне, разыходзьцеся да заўтрага. Музыка, марш!

Канец



ЛАЗНЯ

ДРАМА
У 6-ці ДЗЕЯХ
З ЦЫРКАМ, ФЕЕРВЕРКАМ

ДЗЕЙНЫЯ АСОБЫ

Таварыш Пабеданосікаў — галоўны начальнік па ўмацаванню парадку справаўзгаднення, галоўначпупс.
Поля — яго жонка.
Таварыш Аптымістэнка — яго сакратар.
Ісак Бельвядонскі — партрэтыст, баталіст, натураліст.
Таварыш Маментальнікаў — рэпарцёр.
Містэр Понт Кіч — іншаземец.
Таварыш Ундэртон — машыністка.
Растратчык Ночкін.
Таварыш Веласіпедкін — лёгкі кавалерыст *.
Таварыш Чудакоў — вынаходнік.
Мадам Мезальянсава — супрацоўніца ВОКС.
Таварыш Фоскін, Таварыш Двойкін, Таварыш Тройкін — рабочыя.
Прасьбіты.
Старшыня дамкома.
Рэжысёр.
Іван Іванавіч.
Устаноўскі натоўп.
Міліцыянер.
Капельдынер.
Фасфарычная жанчына.

І ДЗЕЯ

Справа стол, злева стол. Адусюль звісаюць і ўсюды параскіданы чарцяжы. Пасярэдзіне т а в а р ы ш Ф о с к і н залітоўвае паветра паяльнай лямпай, Ч у д а к о ў пераходзіць ад лямпы да лямпы, пераглядвае чарцёж.

В е л а с і п е д к і н
(убягаючы)

Што, усё яшчэ ў Каспійскае мора ўпадае подлая Волга?

Ч у д а к о ў
(размахвае чарцяжом)

Так, але гэта цяпер ненадоўга. Гадзіннік закладвайце і прадавайце.

В е л а с і п е д к і н

Добра, што я яго яшчэ і не купіў.

Ч у д а к о ў

Не купляй! Не купляй нізашто! Хутка гэтая цікаючая плоская недарэчнасць будзе смяшнейшая, чым лучынка на Днепрабудзе, бездапаможнейшая, чым бык у аўтадоры.

В е л а с і п е д к і н

Унасякомілі, значыцца, Швейцарыю? *

Ч у д а к о ў

Ды не ляскай ты языком на дробных лічыльніках сённяшняй палітыкі! Мая ідэя больш гран-

дыёзная. Волга чалавечага часу, у якую нас, як бярвенні ў сплаў, кідала наша нараджэнне, кідала борсацца і плысці па быстры,— гэтая Волга ад сёння і назаўсёды пакарылася нам. Я прымушу час і стаяць і імчаць у любым напрамку і з любой хуткасцю. Людзі здолеюць вылазіць з дзён, як пасажыры з трамваяў і аўтобусаў. З маёй машынай ты можаш спыніць секунду шчасця і цешыцца хоць і месяц, пакуль не надакучыць. З маёй машынай ты можаш узвіхрыць расцягнутыя маруднын гады гора, уцягнуць галаву ў плечы, і над табою, не закранаючы і не ранячы, сто разоў у мінуту будзе праносіцца снарад сонца, вынішчаючы чорныя дні. Глядзі, феерверачныя фантазіі Уэлса,* футурыстычны мозг Эйнштэйна,* звярыныя навыкі спячкі мядзведзяў і ёгаў * — усё, усё спрасавана, сціснута і зліта ў гэтай машыне.

Веласіпедкін

Амаль нічога не разумею і, ва ўсякім разе, зусім нічога не бачу.

Чудакоў

Да напні ж ты акуляры! Цябе слепяць гэтыя планкі плаціны і крышталю, гэты бляск прамянёвых спляценняў. Бачыш? Бачыш?..

Веласіпедкін

Ну, бачу...

Чудакоў

Глядзі, ты прыкмеціў гэтыя дзве лінейкі, гарызантальную і вертыкальную, з дзяленнямі, як на шалях?

Веласіпедкін

Ну, бачу...

Чудакоў

Гэтымі лінейкамі ты адмерваеш куб неабходнай прасторы. Глядзі, ты бачыш гэты колавы рэгулятар?

Веласіпедкін

Ну, бачу...

Чудакоў

Гэтым ключом ты ізалюеш уключаную прастору і адсякаеш ад усіх цяжараў усе патокі зямнога прыцяжэння і вось гэтымі дзіўнаватымі рычажкамі ўключаеш хуткасць і кірунак часу.

Веласіпедкін

Разумею! Здорава! Незвычайна!!! Гэта значыць — збіраецца, напрыклад, усесаюзны з'езд па пытанні аб суніманні ўзнімаемых пытанняў, ну, і, вядома, даецца слова для прывітання ад Дзяржаўнай акадэміі навуковых мастацтваў дзяржаўнаму таварышу Когану *, і як толькі ён пачаў: «Таварышы, праз шчупальцы сусветнага імперыялізму чырвонай ніткай праходзіць хваля...» — я яго адгароджваю ад прэзідыума і запускаю час з хуткасцю паўтараста мінут у чвэрць гадзіны. Ён сабе пацее, вітае, вітае і пацее гадзіны паўтары, а публіка глядзіць: акадэмік ледзь рот разявіў — і ўжо пляскаюць у ладкі. Усе з палёгкай уздыхнулі, паднялі з крэсел свежанькія зады і гайда працаваць. Так?

Чудакоў

Фу, як брыдка! Чаго ты мне нейкага Когана соваеш? Я табе тлумачу вялікую справу сусветнай адноснасці, справу пераводу азначэння часу з метафізічнай субстанцыі *, з ноўмена * ў рэаль-

насць, падлеглую хімічнаму і фізічнаму ўздзеянню.

Веласіпедкін

А я што кажу? Я тое ж і кажу: ты сабе пабудуй рэальную станцыю з поўным хімічным і фізічным уздзеяннем, а мы ад яе правядзём правады, ну, скажам, на ўсе курыныя інкубатары, за пятнаццаць хвілін будзем вырошчваць паўпудовую курыцу, а потым ёй пад крылца штэпсель, выключым час — і сядзі, курыца, і чакай, пакуль цябе не засмажылі і не з'елі.

Чудакоў

Якія інкубатары, якія курыцы?!! Я табе...

Веласіпедкін

Добра, добра, ты думай сабе хоць пра сланоў, хоць пра жырафаў, калі табе пра дробную жывёлу і думаць занізка. А мы ўсё гэта да нашых шэранькіх куранятак і самі прыстасуем...

Чудакоў

Ну, што за пашляціна! Я адчуваю, што ты са сваім практычным матэрыялізмам хутка з мяне самога курыцу зробіш. Толькі-толькі я размахнуся і хачу ляцець — ты з мяне пер'е выскубаеш.

Веласіпедкін

Ну, годзе, годзе, не гарачыся. А калі я ў цябе нават якое пяро і выскуб, ты даруй, я яго табе назад устаўлю. Лётай, лунай, фантазіруй, мы твайму энтузіязму памочнікі, а не перашкода. Ну, не злуйся, хлапчына, запускай, закручвай сваю машыну. Дзе памагаць, а?

Чудакоў

Увага! Я зараз крану кола, і час ірванецца і пусціцца сціскаць і мяняць прастору, заключаную намі ў клетку ізалятараў. Зараз я адбіваю хлеб ва ўсіх прарокаў, варажбітак і вешчуноў.

Веласіпедкін

Пачакай, Чудакоў, дай я стану сюды, можа, я праз пяць хвілін выйду з камсамольца ў гэтакія барадатыя Марксы. Альбо не, буду старым бальшавіком з трохсотгадовым стажам. Я табе тады ўсё адразу прапіхну.

Чудакоў
(адцягваючы, спалохана)

Асцярожна, вар'ят! Калі ў наступальных гадах тут праляжа стальная ферма падземнай дарогі, то, папаўшы сваім шчуплым цельцам у занятую сталлю прастору, ты ўмомант ператворышся ў зубны парашок. І, магчыма, у будучым вагоны зрынуцца з рэек, а тут небывалым часатрасеннем у тысячу балаў да ўсіх чарцей раскідае наш падвал. Цяпер небяспечна пускацца туды, трэба дачакацца пасланых адтуль. Паварочваю павольна-павольна — усяго ў мінуту пяць год...

Фоскін

Пастой, таварыш, пачакай хвіліначку. Табе ўсё роўна круціць машыну. Зрабі ласку, усунь у тваю машыну маю аблігацыю, не дарма я за яе ўшчаперыўся і не прадаю,— можа, яна праз пяць мінут ужо сто тысяч выйграе.

Веласіпедкін

Здагадаўся! Тады ж туды ўвесь Наркамфін з Бруханавым * засунуць трэба, а то ж ты выйгра-

еш, а яны ўсё роўна табе не паверацъ — табліцу спытаюць.

Чудакоў

Ну, вось, я вам у будучыню дзверы прабіваю, а вы на рублі спаўзлі... Фу, гістарычныя матэрыялісты!

Фоскін

Дурань, я ж для цябе з выйгрышам спяшаюся. У цябе на твой дослед ёсць грошы?

Чудакоў

Але... Грошы ёсць?

Веласіпедкін

Грошы?

Стук у дзверы. Уваходзяць Іван Іванавіч, Понт Кіч, Мезальянсава і Маментальнікаў.

Мезальянсава

(Чудакову)

Ду ю спік інгліш? * Ах, ну, дык шпрэхен зі дэйч? * Парле ву франсэ, нарэшце? * Ну, я так і ведала! Гэта стамляюча вельмі. Я змушана рабіць традзюксіён * з нашай на рабоча-сялянскую. Масье Іван Іванавіч, таварыш Іван Іванавіч! Вы, безумоўна, ведаеце Івана Іванавіча?

Іван Іванавіч

Прывітанне, прывітанне, дарагі таварыш! Не губляйцеся! Я паказваю нашы дасягненні, як звычайна гаворыць Аляксей Максімавіч *. Я сам часам... але, разумееце, гэтая нагрузка! Нам, рабочым і сялянам, вельмі, вельмі патрэбен свой, чырвоны Эдысон *. Вядома, крызіс нашага росту, маленькія недахопы механізма, лес сякуць —

трэскі ляцяць... Яшчэ адно намаганне — і гэта будзе ліквідавана. У вас ёсць тэлефон? Ах, у вас няма тэлефона! Ну, я скажу Мікалаю Іванавічу, ён не адмовіць. Але, калі ён адмовіць, можна бепайсці да самога Уладзіміра Панфілыча, ён, бязумоўна, пойдзе насустрач. Бо нават і Сямён Сямёнавіч мне пастаянна гаворыць: «Патрэбен,— кажа,— нам, рабочым і сялянам, патрэбен чырвоны, свой савецкі Эдысон». Таварыш Маментальнікаў, трэба распачаць шырокую кампанію.

Маментальнікаў

Эчэленца *, загадайце!
Перад ва́мі ўвесь я — слых.
Толькі нам зад-да-да-да-данне
дайце —
Будзе выканана ўміг.

Мезальянсава

Масье Маментальніка́ў, таварыш Маментальніка́ў! Супрацоўнік! Папутчык! Бачыць — савецкая ўлада ідзе — далучыўся. Бачыць — мы ідзём — зайшоў. Убачыць — яны ідуць — пабяжыць.

Маментальнікаў

Зусім, зусім правільна — супрацоўнік. Супрацоўнік дарэвалюцыйнай і парэвалюцыйнай прэсы. Вось толькі рэвалюцыйная ў мяне, разумееце, неяк выпала. Тут белыя, там чырвоныя, тут зялёныя, Крым, падполле... Давялося гандляваць у крамцы. Не мая — бацькава, або нават, здаецца, проста дзядзькі. Сам я рабочы па пераконанню. Я заўсёды казаў, што лепш памерці пад чырвоным сцягам, чым пад плотам. Пад гэтым лозунгам можна аб'яднаць вялікую колькасць інтэлігенцыі

майго складу. Эчэленца, загадайце — перад вамі ўвесь я — слых!

Понт Кіч

Кхе! Кхе!

Мезальянсава

Пардон! Даруйце! Містэр Понт Кіч, пан Понт Кіч. Брытанскі англасакс.

Іван Іванавіч

Вы былі ў Англіі? Ах, я быў у Англіі!.. Усюды англічане... Я якраз купіў кепку ў Ліверпулі і аглядаў дом, дзе нарадзіўся і жыў Антыдзюрынг *. Надзвычай цікава! Трэба распачаць шырокую кампанію.

Мезальянсава

Містэр Понт Кіч вядомы, вядомы і ў Лондане і ў Сіці * філатэліст. Філатэліст (сконапель, маркалюб — па-руску), і ён вельмі, вельмі цікавіцца хімічнымі заводамі, авіяцыяй, і наогул мастацтвам. Вельмі, вельмі культурны і кампанейскі чалавек. Нават мецэнат. Сконапель...*, ну, як гэта вам перакласці?.. памагае, там, кінаработнікам, вынаходнікам... Ну, такі, такі, накшталт, як быццам, РСІ *, толькі наадварот... Ву компрэнэ? Ён ужо глядзеў на Маскву з небаскроба «Известий» * (Нахрыхтэн) *, ён ужо быў у Анатоль Васільіча *, а цяпер, кажа, да вас... Такі культурны, таварыскі, нават нам ваш адрас паведаміў.

Фоскін

Насатая сволач: з нюхам!

Мезальянсава

Пліз *, сэр!

Понт Кіч

Ай Іван, у дзверы рэвень, а зверы абедалі. Ай, ішоў у рай менекен, а янот у Індастан, перапэрчыў ой зверы ізабрэтэйшэн.

Мезальянсава

Містэр Понт Кіч хоча сказаць на ўласцівай яму мове, што на яго туманнай радзіме ўсе, ад Макданальда * да Чэрчыля *, зусім, зусім як зверы, зацікаўлены вашай вынаходкай, і ён вельмі, вельмі просіць...

Чудакоў

Ну, вядома, вядома! Мая вынаходка належыць усяму чалавецтву, і я, безумоўна, зараз жа... Я дужа, дужа рад. *(Адводзіць іншаземца, які дастаў блакнот, паказвае і тлумачыць.)* Гэта вось так. Але... але... але... Тут два рычажкі, а на паралельнай крышталёвай вымяральнай лінейцы... Так... так... так... от сюды! А гэта вось так... Ну, але...

Веласіпедкін

(адводзіць Івана Іванавіча)

Таварыш, трэба падтрымаць хлопца. Я хадзіў усюды, куды «без дакладу не ўваходзіць», і гадзінамі тырчаў усюды, дзе «скончыў справу» і гэтак далей, і амаль начаваў пад шыльдай «Калі вы прыйшлі да занятага чалавека, дык пакіньце яго» — і ніякага выніку. Праз цяганіну і боязь асігнаваць дзесятак чырвонцаў гіне, можа быць, грандыёзная вынаходка. Таварыш, вы павінны з вашым аўтарытэтам...

Іван Іванавіч

Так, гэта жахліва! Лес сякуць — трэскі ля-

цяць. Я зараз жа проста ў Галоўнае ўпраўленне па ўзгадненню. Я скажу зараз жа Мікалаю Ігнатавічу... А калі ён адмовіць, я буду размаўляць з самім Паўлам Варфаламеічам... У вас ёсць тэлефон? Ах, у вас няма тэлефона! Маленькія недахопы механізма... Ах, якія механізмы ў Швейцарыі! Вы былі ў Швейцарыі? Я быў у Швейцарыі. Усюды адны швейцарцы. Надзвычай цікава!

Понт Кіч

(кладзе блакнот у кішэню і паціскае Чудакову руку)

Дзед звёў у рай трам з дзверы ў дзверы лез і не дайшоў туга. Дуй Іван. Чэрвонцлі?..

Мезальянсава

Містэр Понт Кіч кажа, што калі вам патрэбны чырвонцы...

Веласіпедкін

Яму? Яму не патрэбны, яму напляваць на чырвонцы. Я толькі што для яго збегаў у Дзяржбанк і прыйшоў увесь у чырвонцах. Нават брыдка. Праз кішэню ціснуць. Вось тут натыканы купюры па два, вось тут па тры, а ў гэтых дзвюх кішэнях дык адны дзесяцічырвонцавыя. Ол райт! Гуд бай! * *(Трасе Кічу руку, абнімае яго абедзвюма рукамі і ў захапленні праводзіць да дзвярэй.)*

Мезальянсава

Я вельмі прашу вас — крышачку тактоўней: з вашымі камсамольскімі замашкамі наспее, калі яшчэ не наспеў, велізарны міжнародны канфлікт. Гуд бай — да пабачэння.

Іван Іванавіч

(паляпваючы па плячы Чудакова і развітваючыся)

Я таксама ў вашы гады... Лес сякуць — трэскі ляцяць. Нам патрэбен, патрэбен савецкі Эдысон. *(Ужо з дзвярэй.)* У вас няма тэлефона? Ну, нічога, я абавязкова скажу Нікандру Пірамідонавічу.

Маментальнікаў

(дробненька тупае, напявае)

Эчэленца, загадайце...

Чудакоў

(да Веласіпедкіна)

Гэта добра, што ёсць грошы.

Веласіпедкін

Грошай няма!

Чудакоў

Значыцца... Як жа гэта — няма грошай? Я не разумею, нашто тады хваліцца і гаварыць... А тым больш адмаўляцца, калі робяцца салідныя прапановы з боку іншаземных...

Веласіпедкін

Хоць ты і геній, а дурань! Ты хочаш, каб твая ідэя абжалезілася і ўляцела да нас з Англіі празрыстым, нябачным у часе дрэдноутам — раптоўна біць па нашых заводах і Саветах?

Чудакоў

А і то ж праўда, праўда... Як жа гэта я яму ўсё расказаў? А ён яшчэ ў блакнот упісваў! А ты чаму ж мяне не спыніў? Сам яшчэ да дзвярэй вядзеш, абнімаешся!

Веласіпедкін

Дурань! Я яго не так сабе абнімаў. Былая беспрытульшчына прыдалася. Я не яго — я кішэню яго абнімаў. Вось ён, блакнот англійскі. Згубіў блакнот англічанін.

Чудакоў

Брава, Веласіпедкін! Ну, а грошы?

Веласіпедкін

Чудакоў, я пайду на ўсё. Я буду кусаць глоткі і глытаць кадыкі. Я буду біцца так, ажно шчокі будуць ляцець у паветры. Я пераконваў, я гарлаў на гэтага Аптымістэнку. Ён гладкі і паліраваны, як дачны шар. На яго люстранай чысціні адно начальства адбіваецца, ды і тое дагары нагамі. Я амаль заагітаваў бухгалтара Ночкіна. Але што можна зрабіць з гэтым праклятым таварышам Пабеданосікавым? Ён проста плюшчыць кожнага сваімі заслугамі і стажам. Ты ведаеш яго біяграфію? На пытанне: «Што рабіў да 17-га года?» — у анкетах ставіў: «Быў у партыі». У якой — невядома, і невядома, што ў яго — «бэ» ці «мэ» ў дужках стаяла *, а можа, ні бэ, ні мэ не было. Потым ён уцёк з турмы, засыпаўшы варце тытунём вочы. А цяпер, праз дваццаць пяць год, сам час засыпаў яму вочы тытунём драбніц і мінут, вочы яго слязяцца ад здаволення і бесклапотнасці. Што можна ўбачыць такімі вачамі? Сацыялізм? Не, толькі чарніліцу ды прэс-пап'е.

Фоскін

Таварышы, што ж я — слінаю буду залітоўваць, ці што? Тут яшчэ двух паставіць трэба. Дзвесце шэсцьдзесят рублёў мінімаксам.

Поля

(убягае, размахвае пачкамі)

Грошы — смехата!

Веласіпедкін

(Фоскіну, перадае грошы. Фоскін выбягае)

Ну, гані! На таксі гані! Хапай матэрыял, памочнікаў — і назад. *(Да Полі.)* Ну, што, угаварыла начальства па сямейнай лініі?

Поля

Хіба з ім можна проста? Смехата! Ён сіпіць папяровым удавам кожны раз, калі вяртаецца дамоў, цяжарны рэзалюцыямі. Не да пацехі. А ёсць Ночкін... гэта такі бухгалтарчык у яго ўстанове, і я яго бачу ўсяго першы раз... Прыбягае сёння ў абед, пакет тыцкае, перадайце, кажа... сакрэтна... Смехата! А мне, кажа, да іх нельга... з выпадку магчымасці падазрэння ў саўдзеле... Ці ж смешна?

Чудакоў

Можа быць, гэтыя грошы...

Веласіпедкін

Так! Тут ёсць над чым падумаць, штосьці мне здаецца... Але што ж! Усё роўна! Заўтра высветлім.

Уваходзяць Фоскін, Двойкін і Тройкін.

Гатова?

Фоскін

Ёсць!

Веласіпедкін

(зграбаючы ўсіх)

Ну, гайда! Шпарце, таварышы!

Чудакоў

Так, так... Правадкі злітаваны. Ізаляцыйныя перагародкі ў парадку. Напружанне выверана. Здаецца, можна. Першы раз у гісторыі чалавецтва... Адступіце! Уключаю... Раз, тва, тры!

Бенгальскі выбух, дым. Усе адхіснуліся, праз секунду зноў — прылівам да месца выбуху. Чудакоў выхоплівае, апякаючыся, кавалак празрыстай шклянiстай паперы з адбітым, пашматаным ражком.

Чудакоў

Скачыце! Рагачыце! Глядзіце на гэта. Гэта — пісьмо. Гэта напісана пяцьдзесят год таму наперад. Разумееце — таму наперад!!! Якое незвычайнейшае слова! Чытайце!

Веласіпедкін

А што ж тут чытаць?.. «Бе дэ 5-24-20». Гэта што, тэлефон, ці што, нейкага таварыша Бэдэ?

Чудакоў

Не «бе дэ», а «бу-ду». Яны пішуць аднымі зычнымі, а 5 — гэта азначэнне парадкавай галоснай. А-е-і-о-у. «Буду». Эканомія дваццаць пяць працэнтаў на алфавіце. Зразумеў? 24 — гэта заўтрашні дзень. 20 — гадзіны. Ён, яна, яно — будзе тут заўтра — у восем вечара. Катастрофа? Што?.. Ты бачыш, бачыш гэты абпалены, абсечаны край? Гэта азначае — на шляху часу сустрэлася перашкода, цела, што ў адзін з пяцідзесяці гадоў займала гэтую цяпер пустую прастору. Таму і выбух. Неадкладна, каб не забіць пасланае адтуль, патрэбны людзі і грошы... Многа! Трэба зараз жа вынесці дослед як мага вышэй, на самую пустую прастору. Калі мне памогуць, я на ўласнай спіне

выцісну гэтую махіну. Але заўтра ўсё будзе вырашана. Таварышы, вы са мной!

Кідаюцца да дзвярэй.

Веласіпедкін

Хадзем, таварышы, возьмем іх за каўнер, прымусім! Я буду жэрці чыноўнікаў і выплёўваць гузікі.

Дзверы расчыняюцца насустрач.

Старшыня дамкома

Я колькі разоў вам казаў: вымятайцеся вы адсюль з вашай прыватнай крамкай. Вы смуродзіце ўгору адказнаму кватэранаймальніку, таварышу Пабеданосікаву. *(Заўважае Полю.)* І... і... вы-ы... тут? Я кажу, памагай бог вашай грамадскай дзейнасці. У мяне для вас прыхаваны дзівосны вентылятарчык. Да пабачэння.

II ДЗЕЯ

Канцылярская сцяна прыёмнай. Справа дзверы са светлавой шыльдай «Без дакладу не ўваходзіць». Каля дзвярэй за сталом Аптымістэнка прымае даўжэзную, на ўсю сцяну, чаргу просьбітаў. Просьбіты капіруюць рухі адзін аднаго, як падаючыя карты. Калі сцяна асвятляецца знутры, бачны толькі чорныя сілуэты просьбітаў і кабінет Пабеданосікава.

Аптымістэнка

У чым справа, грамадзянін?

Просьбіт

Я вас прашу, таварыш сакратар, увяжыце, калі ласка, увяжыце.

Апт ымістэнка

Гэта можна. Увязаць і ўзгадніць — гэта можна. Кожнае пытанне можна і ўвязаць і ўзгадніць. У вас ёсць адносіна?

Просьбіт

Ёсць адносіна... такая адносіна, што проста праходу не дае. Мацюгаецца і б'ецца, б'ецца і мацюгаецца.

Аптымістэнка

Гэта хто ж, пытанне вам праходу не дае?

Просьбіт

Ды не пытанне, а Пашка Тыгралапаў.

Аптымістэнка

Даруйце, грамадзянін, як жа гэта можна Пашку ўвязаць?

Просьбіт

Гэта праўда, аднаму яго аніяк нельга ўвязаць. Але ўдвох-утрох, калі вы загадаеце, дык яго і звяжуць і ўвяжуць. Я вас прашу, таварыш, увяжыце вы гэтага хулігана. Уся кватэра ад яго стогне...

Аптымістэнка

Цьфу! Чаго ж вы з такімі драбніцамі ў буйную дзяржаўную ўстанову лезеце? Звярніцеся ў міліцыю... Вам чаго, грамадзяначка?

Просьбітка

Узгадніць, бацюхна, узгадніць.

Аптымістэнка

Гэта можна — і ўзгадніць можна, і ўвязаць. Кожнае пытанне можна і ўвязаць і ўзгадніць. У вас ёсць заключэнне?

Просьбітка

Ды не, бацюхна, нельга яму заключэнне даваць. У міліцыі сказалі — можна, кажуць, яго на тыдзень заключыць, а я што ж, бацюхна, есці тады буду? Ён жа з заключэння выйдзе, ён жа зноў мяне паб'е.

Аптымістэнка

Даруйце, грамадзяначка, вы ж заяўлялі, што вам узгадніць трэба. А чаго ж вы мне мужам галаву марочыце?

Просьбітка

Ды мяне ж з мужам, бацюхна, і трэба ўзгадніць, нязгодна мы жывём, не, п'е ён надта ўдумліва. А крануць яго баімося, як ён парцейны.

Аптымістэнка

Цьфу! Ды я ж вам кажу, не совайцеся вы з дробязямі ў буйную дзяржаўную ўстанову. Мы дробязямі займацца не можам. Дзяржава буйнымі рэчамі цікавіцца — фардзізмы * розныя, тое, сёе...

Убягаюць Чудакаў і Веласіпедкін.

О! А вы ж куды ж?

Веласіпедкін

(імкнецца адхінуць Аптымістэнку)

Да таварыша Пабеданосікава тэрмінова, неадкладна, зараз жа!

Ч у д а к о ў

(паўтарае)

Тэрмінова... неадкладна...

А п т ы м і с т э н к а

Ага-га! Я вас пазнаю. Гэта вы самі ці ваш брат? Тут хадзіў малады чалавек.

Ч у д а к о ў

Гэта я сам і ёсць.

А п т ы м і с т э н к а

Ды не... Ён жэ ж без барады.

Ч у д а к о ў

Я быў нават і без вусоў, калі пачаў стукацца да вас. Таварыш Аптымістэнка, з гэтым неабходна скончыць. Мы ідзём да самога галоўначпупса, нам патрэбен сам Пабеданосікаў.

А п т ы м і с т э н к а

Нэ трэба. Нэ трэба вам его турбаваць. Я жэ ж вас магу асабістаўласна цалкам задаволіць. Усё ў парадку. На вашу справу маецца поўнае рашэнне.

Ч у д а к о ў

(перапытвае радасна)

Поўнасцю задаволіць? Праўда?

В е л а с і п е д к і н

(перапытвае радасна)

Поўнае рашэнне? Так? Зламалі, значыцца, бюракратаў? Так? Здорава!

Аптымістэнка

Ды што вы, таварыш! Які ж можа быць бюракратызм перад чысткай? * У мяне ўсё на індыкатары без уваходных і выходных, па найноўшай картачнай сістэме. Раз — шукаю вашу скрынку. Раз — хапаю вашу справу. Раз — у руках поўная рэзалюцыя — вось, вось!

Усе ўтыкаюцца ў паперу.

Я ж казаў — поўнае рашэнне. Вось! Ад-мо-віць.

Першы план гасне. Асвятляецца кабінет.

Пабеданосікаў

*(перагортвае паперы, дазвоньваецца па вяртушцы *. Мімаходзь дыктуе)*

«...І так, таварышы, гэты набатны, рэвалюцыйны заклікальны трамвайны званок павінен звонам гудзець у сэрцы кожнага рабочага і селяніна. Сягоння рэйкі Ільіча звяжуць «Плошчу імя дзесяцігоддзя савецкай медыцыны» з былой апорай буржуазіі «Сянным рынкам». *(У тэлефон.)* Так. Алё, алё-о!.. *(Дыктуе далей).* «Хто ездзіў у трамваі да 25 кастрычніка? Дэкласіраваныя інтэлігенты, папы і дваране. За колькі ездзілі? Яны ездзілі за пяць капеек станцыю. У чым ездзілі? У жоўтым трамваі. Хто будзе ездзіць цяпер? Цяпер будзем ездзіць мы, працаўнікі сусвету. Як мы будзем ездзіць? Мы будзем ездзіць з усімі савецкімі выгодамі. У чырвоным трамваі. За колькі? Усяго за дзесяць капеек. І так, таварышы...» *(Тэлефонны званок. У тэлефон.)* Так, так, так. Няма? На чым мы спыніліся?

Машыністка Ундэртон

На «І так, таварышы...».

Пабеданосікаў

Так, так... «І так, таварышы, памятайце, што Леў Талстой — найвялікшы і незабыўны мастак пяра. Яго спадчына мінулага блішча нам на мяжы двух светаў, як вялікая мастацкая зорка, як цэлае сузор'е, як самае вялікае з вялікіх сузор'яў — Вялікая Мядзведзіца. Леў Талстой...»

Ундэртон

Даруйце, таварыш Пабеданосікаў. Вы там пра трамвай пісалі, а тут вы чамусьці Льва Талстога ў трамвай на хаду ўпусцілі. Наколькі можна разумець, тут якоесьці парушэнне літаратурна-трамвайных правіл.

Пабеданосікаў

Што? Які трамвай? Так, так... З гэтымі пастаяннымі прывітаннямі і прамовамі... Папрашу без заўваг у рабочы час! Для самакрытыкі вам адведзена насценная газета. Працягваем... «Нават Леў Талстой, нават гэтая найвялікшая мядзведзіца пяра, калі б ёй удалося глянуць на нашы дасягненні ў выглядзе вышэйадзначанага трамвая, нават яна заявіла б перад тварам сусветнага імперыялізму: «Не магу маўчаць. Вось яны, чырвоныя плады ўсеагульнай і абавязковай асветы». І ў гэтыя дні юбілею...» Што за агіднасць! Кашмар! Выклікаць мне сюды таварыша... грамадзяніна бухгалтара Ночкіна.

Кабінет Пабеданосікава гасне. Зноў чарга ля кабінета. Урываюцца Чудакоў і Веласіпедкін.

Веласіпедкін

Таварыш Аптымістэнка, гэта здзек!

Аптымістэнка

Ды не так жэ ж, ніякага здзеку нэма. Слухалі — пастанавілі: адмовіць. Не ўваходзіць ваша вынаходка ў перспектыўны план на бліжэйшы квартал.

Веласіпедкін

Дык жа не на адным тваім бліжэйшым квартале сацыялізм будуецца!

Аптымістэнка

Ды не замінайце вы са сваімі фантазіямі нашай дзяржаўнай дзейнасці! *(Да ўвайшоўшага Бельвядонскага.)* Калі ласка! Шпарце! Рассыпайцеся! *(Да Чудакова.)* Ваша прапанова не ўвязана з НКШЗ * і нэ трэба найшырэйшым рабочым і сялянам.

Веласіпедкін

Пры чым тут НКШЗ? Што за галавацяпства!

Чудакоў

Безумоўна, нельга прадбачыць наперад усёй грандыёзнасці вынікаў, і магчыма, магчыма з цягам часу прыстасаваць з карысцю маю вынаходку і да транспартных задач — пры максімальнай хуткасці і амаль па-за часам...

Веласіпедкін

Ну, так, так, можна і з НКШЗ узгадніць. Напрыклад, сядаеце вы ў тры гадзіны ночы, а ў пяць раніцы — ужо ў Ленінградзе.

Аптымістэнка

Ну вось, а я што сказаў? Адмовіць! Нежыццё-

ва. І нашто нам быць у пяць раніцы ў Ленінградзе, калі ўсе ўстановы яшчэ жэ ж закрытыя? *(Загараецца чырвоная лямпачка тэлефона. Слухае, крычыць.)* Ночкіна — да таварыша Пабеданосікава!

Адхіляючыся ад Чудакова і Веласіпедкіна, якія кінуліся яму насустрач, подбегам трухае Ночкін. Кабінет Пабеданосікава.

Пабеданосікаў

(круціць і дзьме ў вяртушку)

Цьфу! Іван Міканорыч? Здароў. Іван Міканорыч! Я цябе папрашу два білеты. Ну так, міжнародным. Як, ужо не загадваеш? Цьфу! З гэтай нагрузкай проста адрываешся ад мас. Патрэбен білет, дык невядома, каму тэлефоніць! Алё, алё! *(Да машыністкі.)* На чым спыніліся?

Ундэртон

«І так, таварышы...»

Пабеданосікаў

«І так, таварышы, Аляксандр Сямёныч Пушкін, непераўзыдзены аўтар як оперы «Яўгені Анегін», так і п'есы той жа назвы...»

Ундэртон

Даруйце, таварыш Пабеданосікаў, але вы спачатку пусцілі трамвай, потым усадзілі туды Талстога, а цяпер улез Пушкін — без усякага трамвайнага прыпынку.

Пабеданосікаў

Які Талстой? Пры чым тут трамвай?! Ах, так, так! З гэтымі пастаяннымі прывітаннямі... Папрашу без пярэчанняў! Я тут вытрымана і ўдаска-

налена пішу на адну тэму і без усялякіх ухілаў у бок, а вы... І Талстой, і Пушкін, і нават, калі хочаце, Байро́н — гэта ўсё, хаця і ў розныя часы, аднак саюбілейшчыкі, і наогул. Я, можа, напішу адзін агульны кіруючы артыкул, а вы маглі б потым, без усякіх скрыўленняў самакрытыкі, разрэзаць артыкул па асобных пытаннях, калі вы наогул на сваім месцы. Але вы наогул больш думаеце, як пафарбаваць губкі і прыпудрыцца, і вам не месца ў маёй установе. Даўно пара з ліку маладых камсамолак арабочыць сакратарыят. Папрашу-с сягоння ж...

Уваходзіць Бельвядонскі.

Добрага здароўя, добрага здароўя, таварыш Бельвядонскі! Заданне выканана? Ударным парадкам?

Бельвядонскі

Выканана, безумоўна, выканана. Амаль не сплюшчыўшы вачэй, так сказаць, у сацыялістычным спаборніцтве з самім сабой, але выканана ўсё паводле сацыялістычнага заказу і авансу на ўсе трыста працэнтаў. Будзьце ласкавы, таварыш, глянуць на вашу будучую мэблю?

Пабеданосікаў

Прадэманструйце!

Бельвядонскі

Калі ласка! Вы, бясспрэчна, ведаеце і бачыце, як сказаў славуты гісторык, што стылі бываюць розных Луеў. Вось гэта Луі Каторз Чатырнаццаты *, празваны так французамі пасля рэвалюцыі сорак восьмага года за тое, што ішоў непасрэдна пасля трынаццатага. Затым вось Луі Жакоп *, і, нарэшце, дазволю сабе і параю, як найбольш сучаснае, Луі Мове Гу *.

Пабеданосікаў

Стылі нішто сабе, чыста падабраныя. А як цана?

Бельвядонскі

Усе тры Луі — прыблізна па адной цане.

Пабеданосікаў

Тады, я думаю, мы спынімся на Луе Чатырнаццатым. Аднак, зразумела, згодна з патрабаваннем РСІ аб зніжэнні кошту, прапаную вам у спешным парадку выпрастаць у крэслаў і канап ножкі, паздымаць золата, пафарбаваць пад мораны дуб і параскідаць там і сям савецкі герб на спінках і іншых вытырклых месцах.

Бельвядонскі

Чароўна! Звыш пятнаццаці Людовікаў было, а да гэтага дадумацца не маглі, а вы адразу — пабальшавіцку, па-рэвалюцыйнаму! Таварыш Пабеданосікаў, дазвольце мне прадоўжыць ваш партрэт і адлюстраваць вас як наватара-адміністратара, а таксама размеркавальніка крэдытаў. Турма і ссылка па вас плачуць, часопіс * само сабой. Музей рэвалюцыі па вас плача: арыгінал туды — адарвуць з рукамі! А копіі з невялікай растэрміноўкай і пры ўтрыманні з пэнсіі расхапаюць удзячныя таварышы па службе. Дазвольце?

Пабеданосікаў

Ні за што! Для такіх глупстваў я, безумоўна, ад стырна ўлады адрывацца не магу, аднак, калі неабходна для паўнаты гісторыі і калі на хаду, не прыпыняючы працы, то калі ласка. Я сяду тут, за пісьмовым сталом, але ты адлюструй мяне рэ-

траспектыўна, гэта значыць, як быццам бы на кані.

Бельвядонскі

Каня вашага я ўжо дома намаляваў па памяці, натхняўся на скачках і нават, ці паверыце, у патрэбных месцах сам у люстэрка глядзеўся. Мне застаецца вас да каня прысабачыць. Дазвольце адсунуць убок кошык з паперкамі. Якая сціпласць пры такіх заслугах! Ачысціце мне лінію вашай баявой нагі. Ах, як чабаток чыста бліпчыць, проста — хоць лізні. Толькі ў Мікель Анжэла * сустракалася такая чыстая лінія. Вы ведаеце Мікель Анжэла?

Пабеданосікаў

Анжэлаў, армянін?

Бельвядонскі

Італьянец.

Пабеданосікаў

Фашыст?

Бельвядонскі

Што вы?

Пабеданосікаў

Не ведаю.

Бельвядонскі

Не ведаеце?

Пабеданосікаў

А ён мяне ведае?

Бельвядонскі

Не ведаю... Ён таксама мастак.

Пабеданосікаў

А! Ну, ён мог бы і ведаць. Мастакоў многа, галоўначпупс — адзін.

Бельвядонскі

Аловак дрыжыць. Не перадаць дыялектыку характару пры агульнай бытавой сціпласці. Самапавага ў вас, таварыш Пабеданосікаў, тытанічная! Зіркніце вачыма цераз правае плячо і цераз самапішучую ручку-с. Дазвольце ўвекавечыць гэты міг.

Пабеданосікаў

Зайдзіце!

Уваходзіць Ночкін.

Пабеданосікаў

Вы?!

Ночкін

Я...

Пабеданосікаў

Дзвесце трыццаць?

Ночкін

Дзвесце сорак.

Пабеданосікаў

Прапілі?..

Ночкін

Прайграў.

Пабеданосікаў

Які жах! Неверагодна! Хто? Растратчык! Дзе? У мяне! У які час? У той час, калі я вяду маю ўстанову да сацыялізма па геніяльных слядах Карла Маркса і згодна з прадпісаннямі цэнтра...

Ночкін

Ну, што ж, Карл Маркс таксама ў карты пагульваў.

Пабеданосікаў

Карл Маркс? У карты? Ніколі!!!

Ночкін

Ну, вось, ніколі... А што пісаў Франц Мерынг? * Што ён пісаў на семдзесят другой старонцы сваёй капітальнай працы «Карл Маркс у асабістым жыцці *»? Гуляў! Гуляў наш вялікі настаўнік...

Пабеданосікаў

Я, вядома, чытаў і ведаю Мерынга. Па-першае, ён перабольшвае, а, па-другое, Карл Маркс сапраўды гуляў, але не ў азартныя, а ў камерцыйныя гульні.

Ночкін

А вось аднакласнік, знаўца і сучаснік, вядомы Людвіг Фейербах * піша, што і ў азартныя.

Пабеданосікаў

Ну, так, я чытаў, безумоўна, таварыша Феербахава. Карл Маркс калі-нікалі гуляў і ў азартныя, але не на грошы.

Ночкін

Не... На грошы...

Пабеданосікаў

Так, але на свае, а не на казённыя.

Ночкін

Дапусцім, кожны, хто штудзіраваў Маркса, ведае, што быў, праўда, аднойчы, памятны выпадак і з казённымі.

Пабеданосікаў

Вядома, гэты гістарычны выпадак прымусіць нас, у сувязі з гістарычным прэцэдэнтам, падысці больш уважліва да вашага ўчынку, але ўсё ж...

Ночкін

Ды кіньце вы бобу ў гаросе шукаць! Не гуляў ніколі Карл Маркс ані ў якія карты. Ды што мне вам расказваць! Хіба вы чалавека зразумееце? Вам толькі каб пунктам ды параграфам адпавядала. Эх ты, партфель напханы! Кліпса канцылярская!

Пабеданосікаў

Што? Здзекавацца? І са свайго непасрэднага, адказнага начальніка, і з пасрэднага... ды не, што я кажу! З безадказнага ценю Маркса... Не пускаць! Затрымаць!

Ночкін

Таварыш Пабеданосікаў, не турбуйце сябе званкамі, я сам у МУКВ * паведамлю...

Пабеданосікаў

Спыню! Не дазволю!

Бельвядонскі

Таварыш Пабеданосікаў! Які момант! Заха-

вайце позу, як яна ёсць! Дайце ўвекавечыць гэтае вокамгненнечка!

Ундэртон

Ха-ха-ха!

Пабеданосікаў

Спачуванне? Растратчыку? Смяяцца? Ды яшчэ нафарбаванымі губамі?.. Вон! *(Адзін, накручвае вяртушку.)* Алё, алё! Фу, фу!.. Хто гэта! Аляксандр Пятровіч. Ды я ж цябе тры дні... Прайшоў? Віншую. Ну, як жа, як жа. Якія могуць быць сумненні!.. Як заўсёды, цэлымі днямі, цэлымі начамі... Так, нарэшце, сёння... Два білеты. Мяккія. Першы. Са стэнаграфісткай. Пры чым тут РСІ? Неабходна дадыктаваць справаздачу. Якое маюць значэнне дзвесце сорак рублёў туды і назад? Так, правядзём іх як сутачныя або яшчэ якія-небудзь. У спешным парадку, ■ кур'ерам... Ну, безумоўна, тваё прасуну... Вось, вось! Зялёны Мыс *... Мне. Ну, цісну руку, з адказным прывітаннем. *(Кідае трубку. На матыў тарэадора *.)* Алё, алё!

Прыёмная. Чудакоў і Веласіпедкін наступаюць.

Аптымістэнка

Ды куды жэ ж вы прэцеся, нарэшце? Майце ж павагу да працы і дзейнасці дзяржаўнага персаналу.

Уваходзіць Мезальянсава. Ізноў кінуліся Чудакоў і Веласіпедкін.

Не... не... Без чаргі, згодна з тэлефанаграмай... *(Праводзіць пад ручку, канфідэнцыяльна.)* Усё гатова!.. А як жэ ж. Я яму расказаў са значэннем, што жонка яго па камсамольцах пайшла. Ён спа-

чатку як раззлуецца! Не пацярплю, кажа, распусных заляцанняў без сур'ёзнага стажу і службовага базісу, а потым нават узрадаваўся. Сакратарку ўжо ліквідаваў па прычыне неэтычнасці губ. Ідзіце проста, не бойцеся! І пад кожным ёй лістком * быў ужо гатоў мясцком...

Мезальянсава знікае.

Ч у д а к о ў

Ну, вось, цяпер гэту прапусцілі! Таварыш, ды зразумейце ж вы — ніякая навуковая, ніякая д'ябальская сіла ўжо не здольна спыніць таго, што насоўваецца. Калі мы не вынесем дослед у прастору над горадам, то можа нават быць выбух.

А п т ы м і с т э н к а

Выбух? Ну, ето вы пакіньце! Не пагражайце дзяржаўнай установе. Нам нервавацца і хвалявацца нэўдобна, а калі будзе выбух, тады і заявім на вас куды трэба.

В е л а с і п е д к і н

Ды зразумей жа ты, дурная галава!.. Гэта цябе трэба расправазаявіць і куды трэба і куды не трэба. Людзі прагнуць жаданнем працаваць на ўвесь рабочы сусвет, а ты, сляпая кішка, канцылярскімі размовамі мочышся на іх антузіязм. Так?

А п т ы м і с т э н к а

Папрашу-с не напіраць на асобу! Асоба ў гісторыі не мае асаблівай ролі. Гэта вам не царскія часы. Гэта раней патрабаваўся энтузіязм. А цяпер у нас гістарычны матэрыялізм, і ніякага энтузіязму з вас не патрабуецца.

М е з а л ь я н с а в а з'яўляецца.

Аптымістэнка

Разыходзьцеся, грамадзяне, прыём закрыты.

Мезальянсава

(з партфелем)

О баядэра, перад тваім хараством *! Тара-рам, тара-рам...

III ДЗЕЯ

Сцэна — прадаўжэнне тэатральных радоў. У першым радзе некалькі вольных месцаў. Сігнал: «Пачынаем». Публіка глядзіць у біноклі на сцэну, сцэна глядзіць у біноклі на публіку. Пачынаюцца свісткі, тупат, крыкі: «Час!»

Рэжысёр

Таварышы, не хвалюйцеся! На некалькі хвілін давядзецца затрымаць трэцюю дзею па непрадбачаных абставінах.

Хвіліна, зноў крыкі: «Час!»

Адну хвіліну, таварышы! *(Убок.)* Ну, што, ідуць? Няёмка так зацягваць. Пагаварыць, нарэшце, можна і потым; прайдзіце ў фае, як-небудзь далікатна намякніце. А, ідуць!.. Просім, просім, таварышы. Не, што вы! Вельмі прыемна! Ну, неістотна, адну хвіліну, нават паўгадзіны, гэта ж не цягнік, заўсёды можна затрымаць. Кожны разумее, у такі час жывём. Могуць быць усялякія там дзяржаўныя, нават планетарныя справы. Вы глядзелі першы і другі акт? Ну, як, як? Нас усіх, вядома, цікавіць уражанне і наогул погляд...

Пабеданосікаў

Нішто, нішто! Мы вось гаворым з Іванам Іванавічам. Востра схоплена. Падмечана. Але ўсё-такі гэта нейк вось не тое...

Рэжысёр

Дык жа гэта ўсё можна паправіць, мы заўсёды імкнемся. Вы вось зрабіце канкрэтныя ўказанні — мы, безумоўна... азірнуцца не паспееце...

Пабеданосікаў

Згушчана ўсё тут, у жыцці так не бывае... Ну, скажам, гэты Пабеданосікаў. Няёмка ўсё-такі... Па ўсім відаць, адказны таварыш, а нейк яго выставілі ў такім святле і назвалі яшчэ нейк «галоўначпупс». Не бывае ў нас такіх, ненатуральна, нежыццёва, непадобна! Гэта трэба перарабіць, змякчыць, апаэтызаваць, акругліць...

Іван Іванавіч

Так, так, гэта не так. У вас ёсць тэлефон? Я пазваню Фёдару Фёдаравічу *, ён, бясспрэчна, пойдзе насустрач... Ах, у час дзеяння няёмка? Ну, я потым, потым. Таварыш Маментальнікаў, трэба распачаць шырокую кампанію.

Маментальнікаў

Эчэленца, загадайце!
Перад вамі ўвесь я — слых!
Толькі знак вы, знак вы нам падайце,
Мігам вылаем усіх.

Рэжысёр

Што вы! Што вы, таварышы! Гэта ж у парадку апублікаванай самакрытыкі і з дазволу Губ-

літа * выведзены толькі ў сэнсе выключэння літаратурны адмоўны тып.

Пабеданосікаў

Як вы сказалі? «Тып»? Хіба ж так можна выказвацца пра адказнага дзяржаўнага дзеяча? Так можна сказаць толькі пра якога-небудзь зусім беспартыйнага прайдзісвета. Тып! Гэта ўсё-такі не «тып», а, як-ніяк, пастаўлены кіруючымі органамі галоўначпупс, а вы — тып! І калі ў яго дзеяннях маюцца супрацьзаконныя парушэнні, трэба паведаміць куды належыць на прадмет разбору і, нарэшце, правераныя пракуратурай звесткі — звесткі, апублікаваныя РСІ,ператварыць у сімвалічныя вобразы. Гэта я разумею, але выводзіць на ўсеагульнае пасмешышча ў тэатры...

Рэжысёр

Таварыш, вы сказалі правільна, але ж гэта па ходу дзеі.

Пабеданосікаў

Дзеі? Якія там дзеі? Ніякіх дзеяў у вас быць не можа, ваша справа паказваць, а дзейнічаць, не турбуйцеся, будуць без вас адпаведныя партыйныя і савецкія органы. А потым, трэба паказваць і светлыя бакі нашай рэчаіснасці. Узяць што-небудзь узорнае, напрыклад, нашу ўстанову, у якой я працую, ці мяне, напрыклад...

Іван Іванавіч

Так, так, так! Вы ідзіце ў яго ўстанову. Дырэктывы выконваюцца, цыркуляры праводзяцца, рацыяналізацыя наладжваецца, паперы гадамі ляжаць у поўным парадку. Для просьбаў, скаргаў

і adносін — канвеер. Сапраўдны куток сацыялізма. Надзвычай цікава!

Рэжысёр

Але, таварыш, дазвольце...

Пабеданосікаў

Не дазволю!!! Не маю права і нават здзіўляюся, як гэта наогул вам дазволілі! Гэта нават дыскрэдытуе нас перад Еўропай. *(Мезальянсавай).* Гэта вы не перакладайце, калі ласка...

Мезальянсава

Ах, не, не, ол райт! Ён толькі што наеўся ікры на банкеце і цяпер дрэмле.

Пабеданосікаў

А каго вы нам супрацьпастаўляеце? Вынаходніка? А што ён вынайшаў? Тормаз Вестынгаўза ён вынайшаў? Самапішучую ручку ён выдумаў? Трамвай без яго ходзіць? Рацыялярыю ён канцылярызаваў?

Рэжысёр

Што?

Пабеданосікаў

Я кажу, канцылярыю ён рацыяналізаваў? Не! Тады аб чым крык? Летуценнікаў нам не трэба! Сацыялізм — гэта ўлік!

Іван Іванавіч

Так, так. Вы бывалі ў бухгалтэрыі? Я бываў у бухгалтэрыі — усюды лічбы і лічбы, і маленькія, і вялікія, самыя розныя, а пад канец усе адна з адною збягаюцца. Улік. Надзвычай цікава!

Рэжысёр

Таварыш, не зразумейце нас кепска. Мы можам памыляцца, але мы хацелі паставіць наш тэатр на службу барацьбы і будаўніцтва. Паглядзяць — і за працу, паглядзяць — і ўсхвалююцца, паглядзяць — і выкрыюць.

Пабеданосікаў

А я вас папрашу ад імя ўсіх рабочых і сялян мяне не бударажыць. Падумаеш, будзільнік! Вы павінны мне лашчыць вуха, а не бударажыць, ваша справа радаваць вока, а не бударажыць.

Мезальянсава

Так, так, лашчыць...

Пабеданосікаў

Мы хочам адпачыць пасля дзяржаўнай і грамадскай дзейнасці. Назад, да класікаў! * Вучыцеся ў найвялікшых геніяў праклятага мінулага. Колькі разоў я вам казаў. Памятаеце, як спяваў паэт:

Пасля розных пасяджэнняў * —
Нам ці радасць, ці бяда...
Нашых будучых імкненняў
Нам, та-ра-рам, не шкада...

Мезальянсава

Ну, безумоўна, мастацтва павінна адлюстроўваць жыццё, прыгожае жыццё, прыгожых жывых людзей *. Пакажыце нам прыгожых жыўчыкаў на прыгожых ландшафтах і наогул буржуазнае разлажэнне. Нават, калі гэта патрэбна для агітацыі, дык і танец жывата. Або, скажам, як ідзе на прагнілым Захадзе свежая барацьба са старым бытам. Паказаць, напрыклад, на сцэне, што ў іх у

Парыжы жанаддзела * няма, а затое факстрот, ці якія спадніцы новага фасону носіць стары лядашчы свет — сконапельбо-монд *. Зразумела?

Іван Іванавіч

Так, так! Зрабіце нам прыгожа! У Вялікім тэатры нам пастаянна робяць прыгожа. Вы былі на «Чырвоным маку» *? Ах, я быў на «Чырвоным маку». Надзвычай цікава! Усюды з кветкамі крыляюць, пяюць, танцуюць розныя эльфы * і... сіфіліды.

Рэжысёр

Сільфіды, вы хацелі сказаць?

Іван Іванавіч

Так, так, так! Гэта вы добра заўважылі — сільфіды. Трэба распачаць шырокую кампанію. Так, так, так, лятаюць розныя эльфы... і цвэльфы *... Надзвычай цікава!

Рэжысёр

Даруйце, але эльфаў было ўжо шмат, і іх далейшае размнажэнне не прадугледжана пяцігодкай. Ды і па ходу п'есы яны нам нейк не падыходзяць. Але адносна адпачынку я вас, безумоўна, разумею, і ў п'есу будуць уведзены адпаведныя змены ў выглядзе бадзёрых і грацыёзных дадатковых уставак. Вось, напрыклад, і так званы таварыш Пабеданосікаў, калі даць яму шчыкатлівую тэму — можа ўсіх разрагатаць. Я зараз жа зраблю пару ўказанняў, і роля проста разалмазіцца. Таварыш Пабеданосікаў, вазьміце ў рукі якія-небудзь тры-чатыры прадметы, напрыклад, ручку, подпіс, паперу і партмаксімум *, і зрабіце некалькі жанглёрскіх практыкаванняў. Кідайце ручку,

хапайце паперу — стаўце подпіс, бярыце партмаксімум, лавіце ручку, бярыце паперу — стаўце подпіс, хапайце партмаксімум. Раз, два, тры, чатыры. Раз, два, тры, чатыры. Сав-дзень — партдзень — бю-ра-кра-та. Сав-дзень — парт-дзень — бю-ра-кра-та. Дасягае?

П а б е д а н о с і к а ў
(з захапленнем)

Выдатна! Бадзёра! Ніякага ўпадніцтва — нічога не прыніжае. На гэтым можна і спыніцца.

М е з а л ь я н с а в а

Вуй, сэ трэ педагожык.

П а б е д а н о с і к а ў

Лёгкасць рухаў цела, павучальная для кожнага пачынальніка кар'еры. Даступна, проста, на гэта можна нават дзяцей вадзіць. Паміж намі, мы — малады клас, рабочы — гэта вялікае дзіця. Безумоўна, крыху сухавата, няма той акругленасці, сакавітасці...

Р э ж ы с ё р

Ну, калі вам гэта падабаецца, тут далягляды фантазіі неабдымныя. Мы можам даць проста сімвалічную карціну з усіх наяўных акцёрскіх кадраў. *(Пляскае ў далоні.)*

Вольны мужчынскі персанал — на сцэну! Станьце на адно калена і сагніцеся з прыгнечаным выглядам. Збівайце нябачнай кіркой бачнай рукой нябачны вугаль. Твары, твары больш змрочныя... Цёмныя сілы вас люта гнятуць. Добра! Пайшло!

Вы будзеце капітал. Станьце сюды, таварыш капітал. Танцуйце над усімі з выглядам класавага панавання. Уяўляемую даму абнімайце нябач-

най рукой і піце ўяўляемае шампанскае. Пайшло! Цудоўна! Працягвайце!

Вольны жаночы персанал — на сцэну!

Вы будзеце — свабода, у вас абыходжанне адпаведнае. Вы будзеце — роўнасць, значыцца, усё роўна, каму іграць. А вы — братэрства — іншых пачуццяў вам усё роўна не выклікаць. Падрыхтаваліся! Пайшлі! Падымайце ўяўляемым заклікам уяўляемыя масы. Узрушайце, узрушайце ўсіх энтузіязмам! Што вы робіце?!

Вышэй уздымайце нагу, сімулюючы ўяўляемы пад'ём. Капітал, падтанцоўвайце налева з выглядам Другога Інтэрнацыянала. Чаго рукамі размахаліся! Працягвайце шчупальцы імперыялізму... Няма шчупальцаў? Тады нечага лезці ў акцёры. Працягвайце што хочаце. Спакушайце ўяўляемым багаццем танцуючых дам. Дамы, адмаўляйцеся рэзкім рухам левай рукі. Так, так, так! Уяўляемыя рабочыя масы, паўстаньце сімвалічна! Капітал, прыгожа падайце! Цудоўна!

Капітал, канайце эфектна!

Дайце маляўнічыя сутаргі!

Выдатна!

Мужчынскі вольны персанал, скідайце ўяўляемые ланцугі, уздымайцеся да сімвалу сонца. Размахвайце пераможна рукамі. Свабода, роўнасць і братэрства, сімулюйце жалезны поступ рабочых кагорт. Стаўце нібыта рабочыя ногі на нізрынуты нібыта капітал.

Свабода, роўнасць і братэрства, рабіце ўсмешку, як быццам узрадаваліся.

Вольны мужчынскі персанал, прытварыцеся, што вы — «хто быў нічым», і ўявіце, што вы — «той стане ўсім». Узлазьце на плечы адзін аднаму, адлюстроўваючы рост сацыялістычнага спаборніцтва.

Цудоўна!

Пабудуйце вежу з нібыта магутных цел, увасабляючы ў пластычным вобразе сімвал камунізма.

Размахвайце вольнай рукой з уяўляемым молатам у такт свабоднай краіне, даючы адчуванне пафасу барацьбы.

Аркестр, падбаўце ў музыку індустрыяльнага грукату.

Так! Цудоўна!

Вольны жаночы персанал — на сцэну!

Увівайце ўяўляемымі гірляндамі работнікаў сусветнай вялікай арміі працы, сімвалізуючы кветкі шчасця, што расцвілі пры сацыялізме.

Добра! Прымайце! Гатова!

Адпачывальная пантаміма на тэму —
«Праца і капітал
Змагаліся за п'едэстал».

Пабеданосікаў

Брава! Дзівосна! І як вы можаце з такім талентам разменьвацца на злабадзённыя дробязі, на нікчэмныя фельетоны? Вось гэта сапраўднае мастацтва — зразумела і даступна і мне, і Івану Іванавічу, і масам.

Іван Іванавіч

Так, так, надзвычай цікава! У вас ёсць тэлефон? Я пазваню... Каму-небудзь пазваню. Проста душа цераз край. Гэта ўзрушае! Таварыш Маментальнікаў, трэба распачаць шырокую кампанію.

Маментальнікаў

Эчэленца, загадайце,
Перад вамі ўвесь я — слых.

Толькі больш відовішчаў нам
дайце —
Будзе выхвалена ўміг.

Пабеданосікаў

Выдатна! Усё ёсць! Вы ўвядзіце сюды яшчэ самакрытыку, нейкім такім сімвалістычным чынам, цяпер гэта вельмі своечасова. Пастаўце куды-небудзь убаку столік, і няхай сабе артыкулы піша, пакуль вы тут сваёй справай займаецеся. Дзякую, да пабачэння! Я не хачу апашляць і абцяжарваць уражанне пасля такой найпрыгажэйшай канцоўкі. З таварыскім прывітаннем!

Іван Іванавіч

З таварыскім прывітаннем! Дарэчы, як прозвішча гэтай артыстачкі, трэцяя збоку? Вельмі прыгожая і пяшчотная... таленавітасць... Трэба адкрыць шырокую кампанію, а можа, нават і вузкую... Ну, так... я і яна. Я пазваню па тэлефоне. Альбо няхай яна пазвоніць.

Маментальнікаў

Эчэленца, загадайце!
Што нам сорам, быў бы слых.
Толькі адрас,
адрас дайце —
Стэлефонімся за міг.

Два капельдынеры спыняюць Веласіпедкіна, які рвецца ў першы рад.

Капельдынер

Грамадзянін, а грамадзянін, вас ветліва просяць, вымятайцеся вы адсюль. Куды вы лезеце?

Веласіпедкін

Мне трэба ў першы рад...

Капельдынер

А бясплатных пірожных вам не трэба? Вас ветліва просюць, грамадзянін, а грамадзянін? У вас білет у рабочай паласе *, а вы ў чыстую публіку прэцеся.

Веласіпедкін

Я іду ў першы рад да таварыша Пабеданосікава па справе.

Капельдынер

Грамадзянін, а грамадзянін, у тэатр для прыемнасці ходзюць, а не па справе. Вам ветліва кажуць, каціцеся адсюль кілбасой.

Веласіпедкін

Прыемнасць — справа паслязаўтрашняя, а я па справе, па сённяшняй, і, калі будзе трэба, не толькі першы — мы вам усе рады перавернем з ложамі.

Капельдынер

Грамадзянін, вам ветліва кажуць, вымятайцеся адсюль! За гардэроб не плацілі, праграму не купілі, ды яшчэ без білета!

Веласіпедкін

Ды я не глядзець прыйшоў. З маёй справай я і па партыйнаму білету сюды прайду... Я да вас, таварыш Пабеданосікаў!

Пабеданосікаў

Чаго вы гарлаеце? І хто гэта такі? Нейкі Пабеданосікаў?!!

Веласіпедкін

Жарты прэч, кіньце іграць! Вы і ёсць ён, і я да вас, каторы і ёсць галоўначпупс Пабеданосікаў.

Пабеданосікаў

Трэба-с даведацца калі не імя і па бацьку, дык хаця б прозвішча, перш чым звяртацца да вышэйстаячага адказнага таварыша.

Веласіпедкін

Дык калі ты адказны, ты і адказвай, чаму ў цябе ў канцылярыі замарожваюць вынаходку Чудакова? У нас у наяўнасці хвіліны. Няшчасце будзе непапраўнае. Адпусціце зараз жа грошы, вынесем дослед на месца з максімальным узвышшам і...

Пабеданосікаў

Што за лухта? Які Чудакоў? Якія ўзвышшы? І я наогул сам сягоння выязджаю на ўзвышшы Каўказа.

Веласіпедкін

Чудакоў — гэта вынаходнік...

Пабеданосікаў

Вынаходнікаў многа, а я адзін, і наогул прашу не турбаваць мяне хаця б у рэдкія, урэгуляваныя адпаведнымі інстанцыямі мінуты адпачынку. Зайдзіце ў пятніцу.

Рэжысёр энергічна махае рукой Веласіпедкіну.

Веласіпедкін

Да цябе зойдуць — і не ў пятніцу, а сягоння, і не я, а...

Пабеданосікаў

Няхай заходзіць хто сабе хоча, і не да мяне, а да майго намесніка. Калі ў загадзе аб'яўлена аб маім адпачынку, значыцца, мяне няма. Трэба разумець канструкцыю нашай канстытуцыі. Гэта недапушчальна!

Веласіпедкін

(да Івана Іванавіча)

Утлумачце яму, утэлефоньце яму, вы ж абяцалі!

Іван Іванавіч

Прыставаць са справамі да асобы, якая знаходзіцца ў адпачынку! Надзвычай цікава! У вас ёсць тэлефон? Я пазваню Мікалаю Аляксандравічу *. Трэба шанаваць здароўе старых адказных, пакуль яны яшчэ маладыя.

Рэжысёр

Таварыш Веласіпедкін, заклінаю вас, не рабіце скандалу! Ён жа не з п'есы. Ён проста падобны, і малю вас, каб яны не здагадаліся. Вы атрымаеце поўнае задавальненне па ходу дзеяння.

Пабеданосікаў

Бывайце, таварыш! Нечага сказаць, называецеся ррррэвалюцыйным тэатрам, а самі раздражняеце... як гэта вы сказалі?.. бударажыце, ці што, адказных работнікаў. Гэта не для мас, і рабочыя і сяляне гэтага не зразумеюць, і добра, што не зразумеюць, і растлумачваць ім гэтага не трэба. Што вы з нас нейкіх дзейных асоб робіце? Мы хочам быць бяздзейнымі... як яны называюцца? — гледачамі. Не-ее! Наступны раз я пайду ў другі тэатр!

Іван Іванавіч

Так, так, так! Вы бачылі «Вішнёвую квадратуру» * А я быў на «Дзядзьку Турбіных» *. Надзвычай цікава!

Рэжысёр

(Веласіпедкіну)

Вы што нарабілі? Вы ж ледзь не сарвалі спектакль. Калі ласка, на сцэну!

П'еса працягваецца!

IV ДЗЕЯ

Сцэна пераплецена ўваходнымі лесвіцамі. Павароты лесвіц, пляцоўкі і дзверы кватэр. На верхнюю пляцоўку выходзіць апрануты і з чамаданамі Пабеданосікаў. Спрабуе плячом прыціснуць дзверы, але Поля адчыняе палавінку і выбягае на пляцоўку. Кладзе руку на чамадан.

Поля

Што ж, я так і застануся?.. Не смешна!

Пабеданосікаў

Я прашу цябе спыніць гэтую размову. Якое сямейнае мяшчанства! Кожны ўрач скажа, што для поўнага адпачынку патрэбна вырваць сябе, іменна сябе, а не цябе, з прывычнага асяроддзя, ну, і я еду аднавіць важны для дзяржавы арганізм, умацаваць яго ў розных гарыстых мясцовасцях.

Поля

Я ж ведаю, ну, бачыла,— табе прынеслі два білеты. Я магла думаць... Ну, чым, чым я табе замінаю? Смехата!

Пабеданосікаў

Пакінь ты гэтыя мяшчанскія ўяўленні пра адпачынак. Мне на лодках катацца некалі. Гэта дробныя забаўкі для розных сакратароў. Плыві, мая гандола! * У мяне не гандола, а дзяржаўны карабель. Я табе не загараць еду. Я заўсёды абдумваю бягучы момант, а потым там... даклад, справаздача, рэзалюцыя — сацыялізм. Па маім грамадскім становішчы мне законам прысвоена стэнаграфістка.

Поля

Калі я тваёй стэнаграфіі перашкаджала? Смех! Ну, добра, ты перад другімі ханжыш, малюешся, але чаго ты мяне ашукваеш? Не смешна. Чаго ты мяне шырмай трымаеш? Пусці ты мяне, богам прашу, і стэнаграфуй хоць усю ноч! Смехата!

Пабеданосікаў

Цсс... Ты мяне кампраметуеш сваімі неарганізаванымі, а тым больш рэлігійнымі выкрыкамі. «Богам прашу». Цсс... Унізе жыве Казлякоўскі, ён можа перадаць Паўлу Пятровічу, а той знаёмы сем'ямі з Сямёнам Афанасычам.

Поля

Чаго хаваць? Пацеха!

Пабеданосікаў

Табе, табе трэба хаваць, хаваць свае бабскія, мяшчанскія, упадніцкія настроі, што ўтварылі такі няроўны шлюб. Ты ўдумайся хаця б перад тварам прыроды, на якую я еду. Удумайся! Я —і ты! Зараз не той час, калі дастаткова было ісці ў разведку побач і спаць пад адным шынялём. Я падняўся ўгору па разумовай, службовай і па

кватэрнай лесвіцы. Трэба і табе ўмець самаадукоўвацца і дыялектычна лавіраваць. А што бачу я ў тваім абліччы? Перажытак мінулага, ланцуг старога быту!

П о л я

Я табе замінаю? Чым? Смехата! Гэта ты з мяне зрабіў абшчыпаную квактуху.

П а б е д а н о с і к а ў

Цсс!!! Хопіць гэтай рэўнасці! Сама бадзяешся па чужых кватэрах. Камсамольскія ўцехі, так? Думаеш, я не ведаю? Не магла сабе нават залётнікаў знайсці адпаведна майму грамадскаму становішчу. Шкадлівая спадніцаноска!

П о л я

Сціхні! Не смешна.

П а б е д а н о с і к а ў

Цсс!!! Я табе сказаў, унізе жыве Казлякоўскі. Зойдзем у кватэру. Гэта трэба, нарэшце, скончыць!

Ляпае дзвярыма, упіхваючы Полю ў кватэру. На ніжняй прыступцы паказваецца В е л а с і п е д к і н, за ім Ч у д а к о ў — пад цяжарам нябачнай машыны. Нябачную машыну падтрымліваюць Д в о й к і н і Т р о й к і н.

В е л а с і п е д к і н

Націскай, таварышы! Яшчэ прыступак дваццаць. Цягні ціха! Каб не схаваўся зноў за сакратароў і паперкі. Няхай гэтая бомба часу выбухне ў яго.

Ч у д а к о ў

Баюся, не паспеем данесці. Пралік у дзесятую секунды дасць розніцу ў цэлую гадзіну па нашаму часу.

Двойкін

Ты адчуваеш, як награваюцца часткі пад рукой? Шкло закіпае.

Тройкін

З майго боку планка напальваецца да немагчымасці. Пліта! Далібог, пліта! Ледзь трываю, каб не разняць далоні.

Чудакоў

Цяжар машыны павялічваецца з кожнай секундай. Я амаль магу паручыцца, што ў машыне матэрыялізуецца пабочнае цела.

Двойкін

Таварыш Чудакоў, тупай хутчэй! Падтрымліваць няма моцы. Агонь нясём!

Веласіпедкін

(падбягае і падтрымлівае, апякаючыся)

Таварышы, не здавайцеся! Яшчэ прыступак дзесяць — пятнаццаць, ён тут побач, наверсе. О, чорт, пякельнае полымя! *(Адрывае апечаную руку.)*

Чудакоў

Цягнуць далей нельга. Відаць, застаюцца секунды. Хутчэй! Хоць бы да пляцоўкі! Звальвайце тут!

З дзвярэй выбягае Пабеданосікаў, зачыняе дзверы, потым стукае. Дзверы адчыняюцца, паказваецца Поля.

Пабеданосікаў

Ты, безумоўна, не хвалюйся. Ты, Полечка, памятай, ты сама можаш зразумець, што наша жыц-

цё, маё жыццё можа ўладзіць толькі тваё добрае жаданне.

П о л я

Маё? Сама? Не смешна!

П а б е д а н о с і к а ў

Дарэчы, я забыў схаваць браўнінг. Ён мне, мабыць, не спатрэбіцца. Схавай, калі ласка. Помні, ён зараджаны, і, каб стрэліць, трэба ўсяго адвесці вось гэты засцерагальнік. Бывай, Полечка!

З трэскам зачыняе дзверы, прыціскае вуха да замочнай шчыліны, прыслухоўваецца. На ніжняй прыступцы паказваецца М е з а л ь я н с а в а.

М е з а л ь я н с а в а

Носік, ты скора?

П а б е д а н о с і к а ў

Цс-с-с-с!!!

Грукат, выбух, стрэл. Пабеданосікаў расчыняе дзверы і кідаецца ў кватэру. На ніжняй пляцоўцы феерверкавы агонь. На месцы пастаўленага апарата — з з я ю ч а я ж а н ч ы н а са скруткам у ззяючых літарах. Гарыць слова «Мандат». Агульнае аслупяненне. Выбягае А п т ы м і с т э н к а, на хаду падцягвае штаны, у пантофлях на босыя ногі, узброены.

А п т ы м і с т э н к а

Дзе? Каго?

Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а

Прывітанне, таварышы! Я дэлегатка 2030 года. Я ўключана на дваццаць чатыры гадзіны на сягоннямні час. Тэрмін кароткі, заданні надзвычайныя. Праверце паўнамоцтвы і апавясціцеся.

Аптымістэнка

(кідаецца да дэлегаткі, узіраецца ў мандат, скорагаворкай мармыча тэкст)

«Інстытут гісторыі нараджэння камунізма...» Так... «Дадзены паўнамоцтвы...» Правільна. «Выбраць лепшых...» Ясна... «для перакідкі ў камуністычны век...» Што робіцца! Што робіцца, божухна!.. *(Кідаецца ўгору па прыступках.)*

На парозе з'яўляецца раззлаваны Пабеданосікаў.

Аптымістэнка

Таварыш Пабеданосікаў, да вас дэлегат з цэнтра.

Пабеданосікаў здымае кепку, апускае чамадан, разгублена прабягае мандат, потым таропка запрашае рукой у кватэру. Да Аптымістэнкі шэптам, потым да Фасфарычнай жанчыны.

Пабеданосікаў

(да Аптымістэнкі)

Накруці хвост вяртушцы. Дазнайся там, ведаеш у каго, ці магчымая гэта рэч, ці адпавядае гэта партэтыцы і ці мажліва бязбожніку верыць у такія звышнатуральныя з'явы. *(Да Фасфарычнай жанчыны.)* Я, безумоўна, ужо ў курсе гэтай справы, і мною прадугледжана неабходнае садзейнічанне. Вашы кампетэнтныя органы дзейнічалі цалкам прадумана, накіраваўшы вас да мяне. У нас гэтае пытанне прапрацоўваецца ўжо ў камісіі і неадкладна за палучэннем кіраўнічых дырэктыў будзе з вамі ўзгоднена. Заходзьце проста ў мой кабінет, не звяртаючы ўвагі на некаторае мяшчанства ў выніку няўвязкі роўнасці культурнага ўзроўню шлюбнага жыцця. *(Да Веласіпедкі-*

на.) Калі ласка! Я ж вам казаў — заходзьце проста да мяне!

Пабеданосікаў прапускае Фасфарычную жанчыну, якая паступова ахалоджваецца і прымае нармальны выгляд. Пабеданосікаў да падляцеўшага Аптымістэнкі.

Ну, што, што?

А п т ы м і с т э н к а

Яны смяюцца і кажуць, што гэта за мяжой чалавечага разумення.

П а б е д а н о с і к а ў

Ах, за мяжой! Значыцца, трэба з ВОКСам увязаць. Самую найдробязную рэч трэба рассусольваць. Самі ні найменшай ініцыятывы не могуць праявіць. Таварыш Мезальянсава, стэнаграфія адкладваецца. Падымайцеся наверх для неадкладнай звыштэрміновай культурнай сувязі.

V ДЗЕЯ

Дэкарацыя другой дзеі, толькі бязладная. Надпіс: «Бюро па адбору і перакідцы ў камуністычны век». Уздоўж сцяны сядзяць М е з а л ь я н с а в а, Б е л ь в я д о н с к і, І в а н І в а н а в і ч, К і ч, П а б е д а н о с і к а ў. Аптымістэнка сакратарыць на прыёме. Пабеданосікаў ходзіць нездаволены, прытрымліваючы дзвюма рукамі два партфелі.

А п т ы м і с т э н к а

У чым справа, гамадзянін?

П а б е д а н о с і к а ў

Не, так гэта працягвацца не можа! Я аб гэтым яшчэ буду гаварыць! Я і ў насценную газету пра гэта напішу. Абавязкова напішу!!! З бюракратыз-

мам і пратэкцыянізмам трэба змагацца. Я патрабую прапусціць мяне без чаргі!

Аптымістэнка

Таварыш Пабеданосікаў, ды які ж можа быць бюракратызм перад праверкай і перад адборам? Нэ трэба вам яе турбаваць. Ідзіце сабе без чаргі. Вось чарга пройдзе — і шпарце проста самі па сабе і без усякай чаргі.

Пабеданосікаў

Мне трэба зараз!

Аптымістэнка

Зараз? Калі ласка, зараз! Толькі жэ ж у вас гадзіннік з іхнім гадзіннікам не ўзгоднены. У яе жэ ж, таварыш, час другі, і як яна мне скажа, вы зараз жэ ж і пойдзеце...

Пабеданосікаў

Дык жа мне ж трэба ў сувязі з перакідкай высветліць мноства спраў: і аклад, і кватэру, і іншае.

Аптымістэнка

Цьфу! Ды я жэ ж вам кажу, не совайцеся вы з дробязямі ў буйную дзяржустанову! Мы драбніцамі займацца не можам. Дзяржава буйнымі рэчамі цікавіцца: фардзізмы розныя, машыны часу, тое, сёе...

Іван Іванавіч

Вы калі-небудзь бывалі ў чарзе? Я першы раз бываю ў чарзе. Надзвычай нецікава!

Былы кабінет Пабеданосікава поўны людзей.

Прыўзнятасць і баявая сумятня першых кастрычніцкіх дзён. Фасфарычная жанчына гаворыць.

Фасфарычная жанчына

Таварышы, сённяшняя сустрэча — наспех. Са многімі мы прабудзем гады. Я раскажу вам шмат яшчэ падрабязнасцей нашай радасці. Ледзь толькі дайшла вестка аб вашым доследзе, вучоныя наладзілі дзяжурства. Яны багата дапамаглі вам, улічваючы і карэкціруючы вашы непазбежныя памылкі. Мы ішлі адзін да аднаго, як дзве брыгады, што прарываюць тунель, пакуль не сустрэліся сёння. Вы самі не бачыце ўсёй грандыёзнасці вашых спраў. Нам відней: мы ведаем, што ўвайшло ў жыццё. Я са здзіўленнем аглядвала кватэркі, якія зніклі ў нас і рупліва аднаўляюцца музеямі, і я глядзела гіганты сталі і зямлі, удзячная памяць аб якіх і вопыт якіх і зараз высяцца ў нас узорам камуністычнага будаўніцтва і жыцця. Я разглядвала нябачных вам зашмальцаваных юнакоў, чые імёны гарацъ на плітахануляванага золата. Толькі сёння са свайго кароткага аблёту я агледзела і зразумела магутнасць вашай волі і грымоты вашай буры, што так хутка вырасла ў шчасце наша і ў радасць усёй планеты. З якім захапленнем глядзела я сягоння ажыўшыя літары легенд аб вашай барацьбе — барацьбе супроць усяго ўзброенага свету паразітаў і прыгнятальнікаў. За вашай працай вам няма калі адысціся і палюбавацца сабой, але я рада сказаць вам аб вашай веліччы.

Чудакоў

Таварыш, даруйце, я вас перапыню. Але часу застаецца нашых шэсць гадзін, і мне патрэбны вашы апошнія ўказанні. Колькі будзе адпраўлена, год прызначэння, хуткасць?

Фасфарычная жанчына

Напрамак — бязмежнасць, хуткасць — секунда — год, месца — 2030 год, колькі і хто — невядома. Вядома толькі станцыя прызначэння. Тут — каштоўнасць няясная. Будучыні мінулае — далонь. Прымуць тых, хто захаваецца ў ста гадах. Пачынайце, таварыш. Хто з вамі?

Фоскін

Я!

Двойкін

Я!

Тройкін

Я!

Фасфарычная жанчына

А хто з матэматыкаў — для чарцяжоў і кіраўніцтва?

Фоскін

Мы!

Двойкін

Мы!

Тройкін

Мы!

Фасфарычная жанчына

Як? Вы і рабочыя, вы і матэматыкі?

Веласіпедкін

Вельмі проста! Мы і рабочыя, мы і вузаўцы.

Фасфарычная жанчына

Для нас проста. Я не ведала, ці просты для вас пераход ад канвеера да кіраўніцтва, ад рашпіля да арыфмометра.

Двойкін

Не такія пераходы рабілі, таварыш. Мы браняносцы рабілі, потым запальнічкі, з запальнічкамі скончылі — штыкі пачалі, штыкоў нарабілі — на трактары перайшлі, ды яшчэ ўсялякую вучобу на вуз намотвалі. І ў нас многія не верылі, але мы гэтае нявер'е ў рабочы клас ліквідавалі. Калі вы наш час вывучалі, у вас невялікая памылачка выйшла. Вы, здаецца, пра мінулы год думаеце?

Фасфарычная жанчына

Я бачу, з вашым рухома-кур'ерскім мозгам уключыцца б проста ў нашы рады і ў нашу работу.

Веласіпедкін

Гэтага мы і баімося, таварыш. Машыну мы пусцім і, вядома, пойдзем, калі ячэйка пашле. Але, будзьце ласкавыя, лепей пакуль што не бярыце нас нікуды. У нас якраз цэх наш на бесперапынку пераходзіць — вельмі важна і цікава ведаць, ці выканаем мы пяцігодку за чатыры гады.

Фасфарычная жанчына

Абяцаю адно. Затрымаемся на станцыі 1934 год для атрымання даведак. Але калі такіх, як вы, многа, дык і даведак не трэба.

Чудакоў

Хадзем, таварышы!

Сцяна канцылярыі. Прабягаюць Чудакоў, Веласіпедкін, Двойкін, Тройкін, Фоскін, на хаду звяраючы планы. Пабеданосікаў дробненька тупае за Чудаковым. Чудакоў адмахваецца.

Пабеданосікаў

(узрушана размахвае рукамі)

Падумаеш, нейкі Чудакоў карыстаецца тым, што вынайшаў нейкі апарацічак часу і пазнаёміўся з гэтай бабай, адказ-жанчынай, раней. Я яшчэ не ўпэўнены наогул, што тут не проста бытавое разлажэнне і наогул сувязі фрыдляндскага парадку *. Пол і характар! Так! Так! *(Да Аптымістэнкі.)* Падначалены таварыш Аптымістэнка, вы ж павінны зразумець, што пытанне тычыцца найважнейшай рэчы — аб паездцы маёй, адказнага работніка, на чале цэлай установы ў стогадовую службовую камандзіроўку.

Аптымістэнка

Ды не ўзгоднена ваша падарожжа!

Пабеданосікаў

Гэта як жа не ўзгоднена? Я ўжо з раніцы сабе і ліцеры, і мандаты выпісаў.

Аптымістэнка

Ну, бачыце, а з НКШЗ не ўвязана.

Пабеданосікаў

Пры чым жа тут НКШЗ? Гэта ж галавацяпства! Гэта ж не цягнік. Тут у адну секунду сорак чалавек альбо восем коней * імчаць наперад на цэлы год.

Аптымістэнка

Адмовіць! Нежыццёва! Хто жэ ж згодзіцца

ездзіць у камандзіроўку, калі яму за сто год сутачныя трэба, а яму секундачныя выпісваць будуць?

Кабінет Пабеданосікава.

Фасфарычная жанчына

Таварышы...

Поля

Прашу слова! Даруйце за назойлівасць, я без усякай надзеі, якая можа быць надзея! Смехата! Я проста прашу даведкі, што такое сацыялізм. Мне пра сацыялізм таварыш Пабеданосікаў багата расказваў, але ўсё гэта неяк не смешна.

Фасфарычная жанчына

Вам нядоўга асталося чакаць. Вы паедзеце разам з мужам, з дзецьмі.

Поля

З дзецьмі? Смехата, у мяне няма дзяцей. Муж гаворыць, што ў наш баявы час лепш не звязвацца з такім несвядомым ці то элементам, ці то аліментам...

Фасфарычная жанчына

Добра. Вас не звязваюць дзеці, але ж вас звязвае многае іншае, калі вы жывяце з мужам.

Поля

Жыву? Пацеха! Я не жыву з мужам. Ён жыве з іншымі, роўнымі яму розумам, развіццём. Не смешна!

Фасфарычная жанчына

Чаму ж вы называеце яго мужам?

Поля

Каб усе бачылі, што ён супроць распушчанасці. Смехата!

Фасфарычная жанчына

Разумею. Значыцца, ён проста клапоціцца пра вас, каб у вас усё было?

Поля

Так... ён клапоціцца, каб у мяне нічога не было. Ён кажа, што абрастанне мяне новым плаццем кампраметуе яго ў вачах таварышаў. Смехата!

Фасфарычная жанчына

Не смешна!

Сцяна канцылярыі. Праходзіць Поля.

Пабеданосікаў

Поля? Ты як тут? Даносіла? Скардзілася?

Поля

Скардзілася? Смехата!

Пабеданосікаў

Ты ёй, галоўнае, расказала, як мы ішлі разам, плячо ў плячо, насустрач сонцу камунізма? Як мы змагаліся са старым бытам? Жанчыны любяць сентыментальнасць. Ёй гэта спадабалася? Так?

Поля

Разам? Смехата!

Пабеданосікаў

Ты глядзі, Поля! Ты не павінна запляміць май-

го гонару як члена партыі з выдатным стажам. Ты павінна памятаць пра партыйную этыку і не выносіць смецця з хаты. Дарэчы, ты пайшла б у хату, прабач, у кватэрку, і прыбрала б, вынесла смецце і сабрала б рэчы. Я еду. Я супроць сумяшчальніцтва і пакуль што еду адзін, а цябе выпішу, калі наогул буду выпісваць сваякоў. Ідзі дамоў, Поля, а то...

П о л я

Што «а то»? Не смешна.

Кабінет Пабеданосікава.

Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а

Выбар на вашу ўстанову выпаў выпадкова, як і вынаходкі здаюцца выпадковымі. Бадай што, лепшыя ўзоры людзей у той установе, у якой працуюць Тройкіны і Двойкіны. Але ў вас на кожнай пядзі будоўля, добрыя экземпляры людзей можна вывезці і адсюль.

У н д э р т о н

Скажыце, а мне можна з вамі?

Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а

Вы адсюль?

У н д э р т о н

Пакуль што ніадкуль.

Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а

Як так?

У н д э р т о н

Скарацілі.

Фасфарычная жанчына

Што гэта азначае?

Ундэртон

Губы, кажуць, фарбавала.

Фасфарычная жанчына

Каму?

Ундэртон

Сабе.

Фасфарычная жанчына

Больш нічога не рабілі?

Ундэртон

Перастуквала. Стэнаграфавала.

Фасфарычная жанчына

Добра?

Ундэртон

Добра.

Фасфарычная жанчына

Чаму ж ніадкуль?

Ундэртон

Скарацілі.

Фасфарычная жанчына

Чаму?

Ундэртон

Губы фарбавала.

Фасфарычная жанчына

Каму?

Ундэртон

Ды сабе ж!

Фасфарычная жанчына

Дык якая ж ім справа?

Ундэртон

Скарацілі.

Фасфарычная жанчына

Чаму?

Ундэртон

Губы, кажуць, фарбавала!

Фасфарычная жанчына

Дык навошта ж вы фарбавалі?

Ундэртон

Не пафарбаваць, тады і зусім не прымуць.

Фасфарычная жанчына

Не разумею. Калі б вы яшчэ каму-небудзь іншаму, скажам, тым, хто прыходзіць па даведкі, на рабоце фарбавалі б, ну, тады маглі б сказаць — перашкаджае, просьбіты крыўдзяцца. А так...

Ундэртон

Таварыш, вы мне даруйце за губы. Што мне рабіць? У падполлі я не была, а нос у мяне ў вяснушках, мяне толькі і заўважаць, што я губамі кідаюся. Калі ў вас і без гэтага на людзей гля-

дзяць, вы скажыце, толькі пакажыце ваша жыццё — хоць краёчкам! Вядома, там у вас усе важныя... з заслугамі, там Пабеданосікавы розныя. Я ім на вочы трапляцца не буду, але ўсё-такі пусціце... Калі не падыду, я назад вярнуся... вышлеце неадкладна. А ў дарозе я магу што-нішто парабіць, уражанні будзеце дыктаваць або справаздачу аб выдаткаванні — я настукаю.

Ночкін

А я падлічу. Я лепей у вас у МУКВ заяўлю, а то пакуль тут суды разбяруцца...

Сцяна прыёмнай.

Пабеданосікаў

Запішыце, занясіце ў пратакол! У такім выпадку я павінен заявіць, што здымаю з сябе ўсякую адказнасць, і калі ў выніку незнаёмства з папярэдняй перапіскай, а таксама няўдалага падбору асабістага складу выбухне катастрофа...

Аптымістэнка

Ну, ета вы пакіньце! Не пагражайце буйной дзяржаўнай установе, нам нервавацца і хвалявацца нэўдобна. А калі адбудзецца катастрофа, мы тады і давядзём да ведама міліцыі на прадмет складання пратакола.

Праходзіць Ночкін,
хаваючыся за Ундэртон.

Пабеданосікаў

(спыняючы Ночкіна і свідруючы вачамі Ундэртон)
Як? Яшчэ ва ўстанове?! Яшчэ на волі?!! Таварыш Аптымістэнка! Чаму не прыняты меры? Але, між іншым, раз вы яшчэ на волі, вы не можаце

ўхіліцца ад тэрміновай работы. Трэба, згодна з маімі камандзіроўкамі, выпісаць пад'ёмныя і сутачныя, зыходзячы з нармальнага ўяўлення аб часе і сярэдняга заробку за сто гадоў, ну, і там камандзіровачныя і падсправаздачныя... У выпадку папсуцця машыны, можа, дзе-небудзь давядзецца прастаяць, на якім-небудзь глухім паўгоддзі, гадоў дваццаць, трыццаць, трэба ўсё гэта прадугледзець і прыняць пад увагу. Нельга так неарганізавана каціцца...

Н о ч к і н

А ты арганізавана каціся кілбасой!!!

(Знікае.)

І в а н І в а н а в і ч

Кілбасой? Вы бывалі на пасяджэннях? Я бываў на пасяджэннях. Усюды бутэрброды з сырам, з вяндлінай, з кілбасой — надзвычай цікава!

П а б е д а н о с і к а ў
(адзін, развальваецца ў крэсле)

Ну, добра, я пакіну пост! Пры такіх адносінах я скажу, што іду ў адстаўку. Няхай потым вывучаюць мяне па ўспамінах сучаснікаў і партрэтах. Я іду, але вам жа, таварышы, горш!

Выходзіць Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а.

А п т ы м і с т э н к а

Прыём скончан! Прыйдзіце заўтра, у парадку жывой чаргі.

Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а

Які прыём? Якое заўтра? Якая чарга?

А п т ы м і с т э н к а

(паказвае на шыльду «Без дакладу не ўваходзіць»)

Згодна з асноўнымі законамі.

Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а

А, вы гэтую недарэчнасць зняць забылі?!

П а б е д а н о с і к а ў

(падхопліваецца і ідзе побач з Фасфарычнай жанчынай)

Дзень добры, дзень добры, таварыш. Даруйце, што я спазніўся, але гэтыя справы... Я ўсё-такі да вас заехаў на хвілінку. Я адмаўляўся. Але ніхто і слухаць не хоча. Едзь, кажуць, старшынствуй. Ну, раз калектыў просіць — давялося згадзіцца. Аднак майце на ўвазе, таварыш, я работнік цэнтральнага значэння, няхай іншыя калгасяцца *. Вы гэта ўлічыце наперад і ўзгадніце. Таварыш Аптымістэнка можа даць маланкай за наш кошт. Вы, безумоўна, самі разумееце, што мне давядзецца даць пасаду адпаведна майму стажу і грамадскаму становішчу як буйнейшаму работніку ў сваёй галіне.

Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а

Таварыш, я нікога нікуды не прызначаю, я з'явілася да вас толькі для пераканальнасці. Не сумняваюся, што з вамі абыдуцца так, як вы заслугоўваеце.

П а б е д а н о с і к а ў

Інкагніто? Разумею! Але паміж намі, як надзеленымі ўзаемным даверам, не можа быць таямніц. І я, як старэйшы таварыш, павінен вам заўважыць, што вас акружаюць людзі не зусім стопрацэнтныя. Веласіпедкін курыць. Чудакоў —

п'е, напэўна, п'е адпаведна фантазіі. Павінен сказаць і пра жонку, не маю права ўтаіць ад арганізацыі — мяшчанка і прыхільніца новых сувязей і новых спадніц, што сукупна называецца старым бытам.

Фасфарычная жанчына

Ну, якая вам справа. Працуюць затое...

Пабеданосікаў

Ну, што ж, што затое... Я таксама за тое, але я затое не п'ю, не куру, не даю «на чай», не загінаю налева, не спазняюся, не... *(нахіляецца да вуха)* не ўпадаю ў празмернасці, не пакладаю рук...

Фасфарычная жанчына

Гэта вы кажаце пра ўсё, чаго вы «не, не, не»... Ну, а ёсць што-небудзь, што вы «так, так, так»?

Пабеданосікаў

Так, так, так? Ну, так! Дырэктывы праводжу, рэзалюцыі падшываю, сувязь наладжваю, партузносы плачу, партмаксімум атрымліваю, подпісы стаўлю, пячаць прыкладаю... Ну, проста куток сацыялізма. У вас там, напэўна, цыркуляцыя паперак наладжана, канвеер, а?

Фасфарычная жанчына

Не ведаю, пра што вы кажаце, але, вядома, папера для газет падаецца ў машыну дакладна.

Уваходзяць Понт Кіч і Мезальянсава.

Понт Кіч

Кхе, кхе!

Мезальянсава

Пліз, сэр.

Понт Кіч

Асееў, бегемот, дай у доўг, лік збіт, і кошт знізіўся май пуд часейшэн...

Мезальянсава

Містэр Понт Кіч хоча сказаць, што ён можа па сходнай дзяржаўнай цане скупіць, з прычыны поўнай непатрэбнасці, усе гадзіннікі, і тады ён паверыць у камунізм.

Фасфарычная жанчына

Ясна і без перакладу. Спачатку прызнайце — выгады потым! Таварышы! Прыходзьце своечасова — роўна а дванаццатай гадзіне — на станцыю 2030 год адыходзіць першы цягнік часу.

VI ДЗЕЯ

Падвал Чудакова. З двух бакоў нябачнай машыны поркаюцца Чудакоў і Фоскін, Веласіпедкін і Двойкін. Фасфарычная жанчына звярае з планам нябачную машыну. Тройкін вартуе дзверы.

Фасфарычная жанчына

Таварыш Фоскін! Шчыты, што паслабляюць вецер, стаўце ардынарныя. Пяцігодка прывучыла да тэмпу і хуткасці. Пераход амаль не будзе заўважаны.

Фоскін

Шкло змяню. Паўміліметра. Небіткое.

Фасфарычная жанчына

Таварыш Двойкін! Праверце рысоры. Глядзіце,

каб не трэсла на ўхабах святаў. Бесперапынка распесціла плаўным ходам.

Двойкін

Пройдзем плаўна, абы толькі не валяліся гарэлачныя бутэлькі на дарозе.

Фасфарычная жанчына

Таварыш Веласіпедкін! Сачыце за манометрам дысцыпліны. Хто адхіліцца — зрэжа і знясе.

Веласіпедкін

Дармо! Падцягнем струною!

Фасфарычная жанчына

Таварыш Чудакоў, гатова?

Чудакоў

Адзначым лінію стаяння, і можна пускаць пасажыраў.

Белая стужка-рулон разматваецца паміж коламі нябачнай машыны.

Веласіпедкін

Тройкін, пускай!

З чатырох бакоў з плакатамі пад «Марш часу» ўліваюцца пасажыры.

Марш часу

Лунай над светлай эрай,
Мой спеў,
як голас мас!
Час,
на-
пе-
рад!

На-
пе-
рад,
час!
Хутчэй, краіна,
мерай
Вышыні
новых трас!
Час,
на-
пе-
рад!
На-
пе-
рад,
час!
У будучынь —
кар'ерам
Імчаць —
гадам наказ!
Час,
на-
пе-
рад!
На-
пе-
рад,
час!
У пяцігодцы —
верым —
Наш год —
былінны сказ!
Час,
на-
пе-
рад!

На-
пе-
рад,
час!
Пускай, мой край,
аберуч
Імклівы
ходу пас!
Час,
на-
пе-
рад!
На-
пе-
рад,
час!
З дарогі,
быту шэрасць!
Камуна,
бі пралаз!
Час,
на-
пе-
рад!
На-
пе-
рад,
час!
Лунай
над светлай эрай,
Мой спеў,
як голас мас!
Час,
на-
пе-
рад!

На-
пе-
рад,
час!

А п т ы м і с т э н к а
(аддзяляецца ад натоўпу, да Чудакова)

Таварыш, я вас павінен канфідэнцыяльна спытаць — буфет будзе? Так і ведаў! А чаму не абвешчана загадам? Забылі? Ну, нічога, пітва хопіць, з ядой пераб'ёмся. Заходзьце ў наша купэ. Якое месцейка, а?

Ч у д а к о ў

Станоўцеся побач. Плячо ў плячо. Аб стомленасці не хвалюйцеся. Адзін паварот вось гэтага кола — і праз секунду...

П а б е д а н о с і к а ў
(уваходзіць у суправаджэнні Мезальянсавай)

Званка яшчэ не было? Можна даваць. Адразу другі. *(Двойкіну.)* Таварыш, ты партыйны? Так? Не ў службу, а ў дружбу — памажы там з рэчамі. Дакументы важныя, о-о-о!!! Нельга давяраць розным беспартыйным насільшчыкам, што носяць толькі за грошы, а табе, як вылучэнцу, калі ласка,— нясі! Давяраю!.. Хто тут галоўначзаг пасадкі? Дзе маё купэ? Маё месца, безумоўна, ніжняе...

Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а

Машына часу яшчэ не зусім абсталяваная. Вам, як піянерам гэтага віду транспарту, давядзецца стаяць з усімі.

П а б е д а н о с і к а ў

Пры чым тут піянеры? Піянерскі злёт сконча-

ны *, і папрашу ніколі больш не дакучаць мне з піянерамі. Гэтая кампанія праведзена! Я проста не паеду! Чорт ведае што такое! Трэба, нарэшце, навучыцца шанаваць старога гвардзейца, а то я выйду з гвардыі. Урэшце, я патрабую кампенсацыі за нявыкарыстаны адпачынак! Адным словам, дзе рэчы?

Двойкін штурхае ваганетку з перавязанымі стосамі папер, капялюшнымі скрынкамі, партфелямі, паляўнічымі стрэльбамі і шафай-куфрам Мезальянсавай. З чатырох вуглоў ваганеткі чатыры сетэры. За ваганеткай Бельвядонскі з чамаданам, скрынкай, пэндзлямі, партрэтам *.

Фасфарычная жанчына

Таварыш, гэта што за агромністы універмаг?

Аптымістэнка

Ды не жэ ж. Гэта малюпасенькае абрастанне.

Фасфарычная жанчына

Ну, навошта вам? Хоць частку пакіньце!

Аптымістэнка

Вядома, таварыш. Поштай дашляце.

Пабеданосікаў

Папрашу без заўваг! Развесьце сабе насценную газету і заўважайце там. Я павінен прадставіць цыркуляры, ліцеры, копіі, тэзісы, перакопіі, папраўкі, выпіскі, даведкі, карткі, рэзалюцыі, справаздачы, пратаколы і іншыя апраўдальныя дакументы пры хаця б рэчавых сабаках. Я мог запрасіць дадатковы вагон-біс, але я не запрошваю згодна са сціпласцю ў асабістым жыцці. Не губляйце палітыкі далёкага прыцэлу *. Вам гэта таксама вельмі і вельмі спатрэбіцца. Атрымаўшы штаты, я

перавяду канцылярыю ў агульнасусветны маштаб. Пашырыўшы штаты, я перавяду маштаб у міжпланетны. Спадзяюся, вы не хочаце абесканцылярыць і дэзарганізаваць планету?

Аптымістэнка
(Фасфарычнай жанчыне)

Не пярэчце, грамадзянка. Шкада ж планеты.

Фасфарычная жанчына

Тады збірайцеся хутчэй!

Пабеданосікаў

Я папрашу вас не ўмешвацца не ў сваю кампетэнцыю. Гэта занадта! Папрашу не забываць — гэта мае людзі, і пакуль я не вызвалены, я тут разнайгалоўнейшы. Мне гэта абрыдла! Я буду скардзіцца ўсім на ўсе дзеянні літаральна ўсіх, як толькі вазьмуся за руль. Адступіцеся, таварышы. Стаўце рэчы сюды. Дзе партфель светла-жоўтага маладога цяляці з манаграмай? Аптымістэнка, збегайце! Не хвалюйцеся, пачакаюць! Я спыняю цягнік * па дзяржаўнай неабходнасці, а не дзеля нейкага глупства.

Аптымістэнка кідаецца, насустрач Поля з партфелем.

Поля

Калі ласка, не сыкай! Я прыбірала дома, як ты загадаў,— зараз вярнуся, дапрыбіраюся. Бачу — забыў. Думаю — важнае! Смехата! Прыбегла — калі ласка! *(Перадае партфель.)*

Пабеданосікаў

Прымаю партфель і прымаю да ведама. Трэба ўспамінаць раней! Наступным разам я буду разглядаць гэта як прарыў і паслабленне шлюбнай

дысцыпліны. Праважатыя, выйдзіце. Бывай, Поля! Калі я ўладкуюся, я табе буду прысылаць трэць чаго-небудзь згодна з практыкай суда і аж да змены застарэлага заканадаўства.

Понт Кіч

(уваходзячы і спыняючыся)

Кхе, кхе!

Мезальянсава

Пліз, сэр!

Понт Кіч

Злодзей нахабна драў з ліп язмін дай нам плюньце білетэр...

Мезальянсава

Містэр Кіч хоча сказаць і гаворыць, што ён без білета, таму што не ведаў, які патрэбен — партыйны ці чыгуначны, але што ён згодны ўрастаць у любы сацыялізм, толькі каб гэта яму было прыбыткова...

Аптымістэнка

Пліз, пліз, сэр. Дарогай дамовімся.

Іван Іванавіч

Прывітанне! Наша вам і вашым і нашым дасягненням. Яшчэ адно апошняе намаганне — і ўсё будзе ліквідавана. Вы бачылі сацыялізм? Я зараз убачу сацыялізм — надзвычай цікава!

Пабеданосікаў

І так, таварышы... Чаму і на чым мы спыніліся?

Ундэртон

Мы спыніліся на «І так, таварышы...».

Пабеданосікаў

Так! Прашу слова! Бяру слова! І так, таварышы, мы перажываем той час, калі ў маім апараце вынайдзены апарат часу. Гэты апарат вызваленага часу вынайдзены іменна ў маім апараце, таму што ў мяне ў апараце было колькі каму хацелася вольнага часу. Сучасны бягучы момант характарызуецца тым, што ён момант стаячы. А паколькі ў стаячым моманце невядома, дзе заключаецца пачатак і дзе наступае канец, то я спачатку скажу заключнае слова, а потым уступнае. Апарат выдатны, апарату рад — рад і я і мой апарат *. Мы рады таму, што, калі мы едзем раз у год у адпачынак і не пусцім наперад год, мы можам быць у адпачынку кожны год два гады. І наадварот, цяпер мы палучаем пэнсію адзін дзень у месяц, але раз мы можам прапусціць увесь месяц у адзін дзень, то мы можам палучаць пэнсію кожны дзень увесь месяц. І так, таварышы...

Галасы

— Далоў!
— Хопіць!
— Давай без малебнаў!
— Чудакоў, выключы яму час!

Чудакоў падкручвае Пабеданосікава. Пабеданосікаў працягвае жэстыкуляцыю, але ўжо зусім не чутны.

Аптымістэнка

У сваю чаргу бяру слова ад імя ўсіх і скажу вам проста ў твар, нягледзячы на асобы, што нам усё роўна, якая асоба стаіць на чале ўстановы, таму што мы паважаем толькі тую асобу, якая

пастаўлена і стаіць. Але скажу безасабова, што кожнай асобе прыемна, што гэта зноў ваша прыемная асоба. Таму ад імя ўсіх падношу вам гэты гадзіннік, таму што гэты цікаючы гадзіннік будзе да твару іменна вам, як асобе, што стаіць на чале.

Галасы

— Далоў!
— Пасаліце яму язык!
— Закруці яму кран, Чудакоў!

Чудакоў выключае Аптымістэнку. Аптымістэнка таксама махае рукамі, але і яго не чуваць.

Фасфарычная жанчына

Таварышы! Па першаму сігналу мы ляцім наперад, прарваўшы састарэлы час. Будучае прыме ўсіх, у каго знойдзецца хоць бы адна рыса, што родніць з калектывам камуны,— радасць працаваць, прага ахвяраваць, нястомнасць вынаходзіць, прыемнасць выказваць гордасць чалавечнасцю. Удзесяцярым і прадоўжым пяцігадовыя крокі. Трымайцеся масай, мацней, бліжэй адзін да аднаго. Імклівы час змяце і зрэжа баласт, абцяжараны хламам, баласт спустошаных нявер'ем.

Пабеданосікаў

Адступі, Поля!

Ночкін

(убягае, уцякаючы ад міліцыянера)

Мне б толькі дабегчы да сацыялізма, а там разбяруцца.

Міліцыянер

(даганяе, свішча)

Трымай!!! *(Уляцяюць у машыну.)*

Ф а с ф а р ы ч н а я ж а н ч ы н а

Раз, два, тры!

Бенгальскі выбух. «Марш часу». Цемра. На сцэне П а б е д а н о с і к а ў, А п т ы м і с т э н к а, Б е л ь в я д о н с к і, М е з а л ь я н с а в а, П о н т К і ч, І в а н І в а н а в і ч, скінутыя і раскіданыя д'ябальскім колам часу.

А п т ы м і с т э н к а

Злазь, прыехалі!

П а б е д а н о с і к а ў

Поля, Полечка! Абмацай мяне, агледзь з усіх бакоў. Здаецца, мяне пераехала часам. Паліна!.. Павезлі?! Затрымаць, дагнаць і перагнаць! Якая гадзіна? *(Глядзіць на падараваны яму гадзіннік.)*

А п т ы м і с т э н к а

Аддавайце, аддавайце гадзіннік, грамадзянін! Бытавы хабар, як такавы, нам не да твару, бо я ж адзін ад імя ўсіх месячную пэнсію ў гэты гадзіннік уклаў. Мы знойдзем сабе іншую асобу, каб падносіць гадзіннікі і паважаць.

І в а н І в а н а в і ч

Лес сякуць — трэскі ляцяць. Маленькія... вялікія недахопы механізма. Трэба пайсці прыцягнуць савецкую грамадскасць. Надзвычай цікава!

П а б е д а н о с і к а ў

Мастак, лаві момант, адлюструй жывога чалавека ў смяртэльнай знявазе!

Б е л ь в я д о н с к і

Не-е-е-е! Ракурс у вас нейкі стаў няўдалы. На мадэль трэба глядзець, як качка на балкон. У мяне толькі знізу ўгору выходзіць зусім па-мастацку.

Пабеданосікаў
(Мезальянсавай)

Ну, што ж, ну што ж, няхай паспрабуюць, паплаваюць «без вождя и без ветрил»! * Знікаю ў асабістае жыццё, пісаць успаміны. Хадзем, я з табою, твой Носік!

Мезальянсава

Я ўжо з носікам, і нават з носам, і нават з вельмі вялікім. Ні сацыялізма не змаглі ўладзіць, ні жанчыну. Ах вы, імпа... зантная фігурачка, нечага сказаць! Гуд бай, адзьё, аўфідэрзэйн *, бывайце!!! Пліз, май Кічык, май Пончык!

(Выходзіць з Понтам Кічам)

Пабеданосікаў

І яна, і вы, і аўтар — што вы гэтым хацелі сказаць: што я і накшталт мяне не патрэбны для камунізма?!?

Канец

КАМЕНТАРЫІ

«КЛОП»

Стар. 6

* Нобіле Умберта — начальнік італьянскай паветранай экспедыцыі на Паўночны полюс у 1928 годзе. Нобіле і каманда яго дырыжабля «Італія», які пацярпеў катастрофу, былі выратаваны савецкім ледаколам «Красін». Лёсу гэтай экспедыцыі Маякоўскі прысвяціў вершы «Крыж і шампанскае» і «Дзіўна... але дакладна».

Стар. 7

* Коці — парыжскі фабрыкант духоў. Разносчыца робіць няправільны націск на першым складзе яго прозвішча.

Стар. 7

* Магчыма, што для гэтай рэплікі Маякоўскі выкарыстаў пачатак нарыса Аф. Мількіна «Масква кніжная»: «Толькі за пятачок. Два тыдні смеху. Што робіць жонка, калі мужа няма дома. 120 вясёлых анекдотаў Мікалая Клюева!» — Так рэкламуюць свой тавар бадзяжныя кніжныя гандляры» (газ. «Чытач і пісьменнік». М., 1928, № 32, 11 жніўня). Клюеў М. А.— рускі паэт.

Стар. 8

* Дароці і Ліліян — Дароці Гіш (р. 1898) і Ліліян Гіш (р. 1896) — амерыканскія кінаактрысы, сёстры.

Стар. 10

* «Пакуль у вас няма прафсаюзнага білета, не раздражняйце яго».— У дваццатых гадах уладальнікі існаваўшых у той час прыватных гандлёвых і дробных прамысловых прадпрыемстваў і іх утрыманцы былі часткова абмежаваны ў грамадзянскіх правах. Члены ж прафсаюзаў, г. зн. людзі, якія належалі да ліку працоўных, натуральна, карысталіся ўсімі грамадзянскімі правамі.

Стар. 11

* Рабушынскі П. П. (р. 1871) — адзін з буйнейшых капіталістаў царскай Расіі.

Стар. 11

* «...я вам спяю эпіталáму Гіменея».— Эпіталама (грэч.) — вясельная песня з пажаданнем шчасця маладым. Адзін ■ улюбёных нумароў канцэртнага рэпертуара — «Эпіталама Гіменею» з оперы А. Г. Рубінштэйна «Нерон».

Стар. 12

* Венізелас Элефтэрый (1864—1936) — грэчаскі буржуазны палітычны дзеяч; неаднаразова быў прэм'ер-міністрам.

Стар. 13

* Крыху змененыя радкі з верша Івана Малчанава «Спатканне». На гэты верш Маякоўскі адказаў вершам «Пісьмо да каханай Малчанава, пакінутай ім...».

Стар. 13

* «Мы разышліся, нібы ў моры караблі» — радок з раманса «Караблі» (сл. і муз. Б. А. Празароўскага, Ленінград, 1925, выданне аўтара).

Стар. 15

* Макданальд Джэмс Рамсей — кіраўнік англійскай партыі лейбарыстаў; некалькі разоў быў прэм'ер-міністрам.

Стар. 17

* Гары Піль — нямецкі кінаакцёр, выканаўца галоўных роляў у шэрагу авантурных і салонных фільмаў; улюбёнец мяшчанскай публікі.

* Апухцін А. Н. (1841—1893) — рускі паэт.

* Надсан С. Я. (1862—1887) — рускі паэт.

Стар. 19

* Лібкнехт Карл (1871—1919) — адзін з правадыроў германскага пралетарыяту і заснавальнікаў Камуністычнай партыі Германіі; па-зладзейску забіты контррэвалюцыянерамі.

Стар. 21

* Шымскае «па» — танцавальны рух (крок), характэрны для танца «Шымі».

Стар. 21

* Чэмберлен Осцін (1863—1937) — кіраўнік англійскай кансерватыўнай партыі, міністр замежных спраў у

1924—1929 гады; адзін з арганізатараў антысавецкай кампаніі ў 1927 годзе.

* Пуанкарэ Раймон (1860—1934) — французскі рэакцыйны палітычны дзеяч, прэзідэнт Францыі (1913—1920), адзін з натхняльнікаў першай сусветнай вайны, а потым інтэрвенцыі супроць Савецкай Расіі.

Стар. 22

* Мулен-Руж — кабарэ ў Парыжы.

* Пантэон — месца пахавання выдатных дзеячаў; размова ідзе, напэўна, аб Пантэоне ў Парыжы.

* «Хто ваяваў, той мае права ля ціхай рэчкі адпачыць» — перафразіраваныя радкі з верша Івана Малчанава «Спатканне».

Стар. 23

* Радкі з верша Ул. Маякоўскага «Пісьмо да каханай Малчанава, пакінутай ім...».

* «На Луначарскай вуліцы стары я помню дом» — перафраз першай страфы песні на словы верша Я. П. Палонскага «Пустэльніца»:

В одной знакомой улице
Я помню старый дом
С высокой, темной лестницей,
С завешенным окном.

Стар. 24

* Ласальчанка — прозвішча іранічна ўтворана ад прозвішча нямецкага дробнабуржуазнага сацыяліста Фердзінанда Ласаля (1825—1864).

Стар. 25

* Шакеспеара — скажонае вымаўленне прозвішча Шэкспіра (ад яе англійскага — Shakespeare).

Стар. 27

* Трубадур — сярэдневяковы вандроўны паэт і спявак (у Паўднёвай Францыі).

Стар. 28

* «З'язджаліся к загсу трамваі...» — перафраз радкоў з песні «Стояли у церкви кареты, там пышная свадьба была».

* Шыньён гаффрэ — від прычоскі.

* Этуаль (франц.) — зорка.

Стар. 29

* «Любоў Макарава да Веры Халоднай. Вальс».— Саша Макараў — аўтар шматлікіх рамансаў; Вера Халодная — вядомая кінаактрыса. У запісной кніжцы Маякоўскага 1924 г., № 29, ёсць запіс: «Ноты. Туга Макарава па Веры Халоднай».

* Шарман (франц. Sharmant) — дзівосна, чароўна.

* Пеціт істуар (франц. Petite histoire) — маленькая гісторыя.

Стар. 30

* Цэдура — скажонае — цэ-дур (C-dur), тое ж, што і до-мажор,— музычны тэрмін, абазначэнне адной з танальнасцей.

Стар. 31

* Вязла іх з вяселля карэта, пад крыжам чырвоным вязла — гл. заўв. на стар. 28.

Стар. 32

* Жараў А. А. (1904—1984) — савецкі паэт.

Стар. 39

* Богашукальніцтва — рэакцыйнае рэлігійна-філасофскае вучэнне, якое ўзнікла ў перыяд рэакцыі пасля рэвалюцыі 1905—1907 гадоў.

* Булгакаў М. А. (1891—1940) — аўтар п'есы «Дні Турбіных», якая выклікала ў Маякоўскага адмоўную ацэнку.

* Самаабкладанне — добраахвотнае абкладанне ўзносамі на задавальненне мясцовых гаспадарчых і культурных патрэб, устаноўленае самім насельніцтвам.

Стар. 40

* Анабіёзны — ад слова анабіёз: стан арганізма, які працягвае жыць, але не выяўляе знешніх прыкмет жыцця.

Стар. 40

* Мастадонт — жывёла з групы хобатавых, якая вымерла.

Стар. 42

* Страдыварыус і Уткін — Страдыварыус (Страдывары) Антоніо (1644—1737) — італьянскі скрыпічны майстар. Уткін І. П. (1903—1944) — савецкі паэт; яго верш «Гітара» меў папулярнасць у часткі моладзі тых год. Выступаючы на сходзе Федэрацыі аб'яднанняў савецкіх пісьменнікаў у Доме Герцэна 22 снежня 1928 года, Маякоўскі гаварыў:

«Было два славутых імені: Страдыварыус і Уткінарыус. Адзін вырабляў скрыпкі, а другі вырабляў гітары. Чаму выраб скрыпак і гітар я павінен лічыць для сваёй мастацкай пралетарскай свядомасці характэрным?»

Стар. 43

* МОПР (Міжнародная арганізацыя дапамогі барацьбітам рэвалюцыі), Асаавіяхім — таварыства садзейнічання абароне і авіяцыйна-хімічнаму будаўніцтву, «Далоў неписьменнасць» — масавае добраахвотнае таварыства.

* «Дзе вы цяпер, хто вам цалуе пальцы» — радкі з песенькі «Ліловы негр», якую склаў і выконваў артыст А. Н. Вярцінскі.

Стар. 44

* Аўтадор — масавае таварыства садзейнічання развіццю аўтамабільнага транспарту, трактарнай і дарожнай справы.

* «Не пакідай, пабудзь са мною...» — пачатковыя словы рамана.

Стар. 47

* Трохгорная чума — жартоўнае вызначэнне ап'яненя півам; утворана ад назвы — Трохгорны піваварны завод (у Маскве).

* Чарльстон — модны танец тых год.

Стар. 48

* Герлс (англ. girls) — дзяўчаты; у дадзеным выпадку эстрадныя танцоўшчыцы, рухі якіх абсалютна аднолькавыя і нібы механізаваныя.

Стар. 52

* Хувер (Гувер) Герберт Кларк — амерыканскі рэакцыйны палітычны дзеяч, быў абраны прэзідэнтам ЗША ў 1928 годзе, займаў пост прэзідэнта з 1929 па 1933 год.

* Мусаліні Беніта (1883—1945) — фашысцкі дыктатар Італіі ў 1922—1943 гадах.

Стар. 56

* Доктар Таболкін Я. А.— маскоўскі ветэрынарны ўрач; лячыў сабаку Маякоўскага.

Стар. 59

* Мімікрыйны — пераймальны.

* «Гомо сапіенс» (лат. Homo sapiens) — мыслячы чалавек, натуральна-навуковае вызначэнне чалавека.

Стар. 60

* Бебель Аўгуст (1840—1913) — адзін з заснавальнікаў германскай сацыял-дэмакратыі і Другога Інтэрнацыянала.

* «...пад Інтэрнацыянал у балетах чухалі нага аб нагу...» — магчыма, намёк на адзін з танцаў амерыканскай танцоўшчыцы Айседоры Дункан, які яна выконвала ў час свайго прабывання ў Савецкай Расіі пад музыку «Інтэрнацыянала».

«ЛАЗНЯ»

Стар. 64

* У дзейных асобах.— Лёгкі кавалерыст.— «Лёгкай кавалерыяй» называліся добраахвотныя групы камсамольцаў, якія дапамагалі органам дзяржаўнага кантроля выяўляць недахопы ў дзейнасці ўстаноў і прадпрыемстваў.

Стар. 65

* «Унасякомілі, значыцца, Швейцарыю?» — Як вядома, Швейцарыя славіцца сваёй гадзіннікавай прамысловасцю.

Стар. 66

* Уэлс Герберт (1866—1946) — англійскі пісьменнік, аўтар шэрагу навукова-фантастычных раманаў, у тым ліку рамана «Машына часу».

* Эйнштэйн Альберт (1879—1955) — фізік-тэарэтык, стваральнік тэорыі адноснасці.

* Ёгі — паслядоўнікі аднаго з індыйскіх філасофска-рэлігійных вучэнняў.

Стар. 67

* Коган П. С. (1872—1932) — савецкі гісторык літаратуры і крытык, прэзідэнт Дзяржаўнай акадэміі мастацкіх навук; Маякоўскі часта палемізаваў з ім.

* Метафізічная субстанцыя — ідэалістычнае паняцце аб сутнасці з'яў, спасцігаемай звышінтуітыўным шляхам.

* Ноўмен — у ідэалістычнай філасофіі — сутнасць рэчы, якая не пазнаецца з вопыту.

Стар. 69

* Бруханаў Н. П. у той час быў народным камісарам фінансаў.

Стар. 70

* Ду ю спік інгліш? (англ. Do you speak englich?) — ці гаворыце вы па-англійску?

* Шпрехен зі дэйч? (ням. Sprechen sie deutsch?) — ці гаворыце вы па-нямецку?

* Парле ву франсэ? (франц. Parlez — vous français?) — ці гаворыце вы па-французску?

* Традзюксіён (франц. Traduction) — пераклад.

Стар. 70—71

* Нашы дасягненні... Аляксей Максімавіч».— Намёк на створаны А. М. Горкім часопіс «Нашы дасягненні».

* Эдысон Томас Алва (1847—1931) — амерыканскі вынаходнік, у прыватнасці аўтар некаторых вынаходстваў у галіне кінатэхнікі.

* Эчэленца (італ. Eccelenza) — ваша правасхадзіцельства.

Стар. 72

* «Антыдзюрынг», дакладна: «Анты-Дзюрынг» — назва твора Ф. Энгельса, які рэзка крытыкаваў погляды нямецкага рэакцыйнага філосафа Е. Дзюрынга (1833—1921). Іван Іванавіч дэманструе сваю адсталасць, лічачы «Анты-дзюрынга» чалавекам.

* Сіці — дзелавыя кварталы Лондана.

* Сконапель (франц. Ce gu′on appelle) — гэта значыць.

* РСІ — рабоча-сялянская інспекцыя, орган дзяржаўнага кантроля.

* Небаскроб «Известий» — шасціпавярховы будынак на плошчы Пушкіна ў Маскве, дзе змяшчалася і змяшчаецца зараз рэдакцыя газеты «Известия».

* Нахрыхтэн (ням. Nachrichten) — навіны.

*Анатоль Васільіч — Луначарскі Анатоль Васільевіч (1875—1933), народны камісар па асвеце ў 1917—1929 гадах.

* Пліз, сэр (англ. Please, Sir) — калі ласка, васпане.

Стар. 73

* Макданальд — гл. заўвагу да п'есы «Клоп».

* Чэрчыль Уінстан (1874—1965) — англійскі рэакцыйны палітычны дзеяч, займаў міністэрскія пасты.

Стар. 74

* Ол райт! Гуд бай! (англ. All right! Good bye!) — Вельмі добра! Да пабачэння!

Стар. 76

* ...невядома, што ў яго — «бэ» ці «мэ» ў дужках стаяла — г. зн. невядома, быў Пабеданосікаў бальшавіком — членам РСДРП(б) — ці меньшавіком.

Стар. 81

* Фардзізм — сістэма арганізацыі вытворчасці, якая прымянялася на прадпрыемствах амерыканскага капіталіста Генры Форда.

Стар. 83

* Чыстка — маецца на ўвазе партыйная чыстка і чыстка савецкага апарата, якая праводзілася ў 1929 годзе.

* Вяртушка.— У той час была толькі адна аўтаматычная тэлефонная станцыя,— яна абслугоўвала вышэйшыя ўрадавыя ўстановы і адказных работнікаў, што ўзначальвалі асобныя ведамствы. Аўтаматычны тэлефонны апарат называлі вяртушкай.

Стар. 85

* НКШЗ — народны камісарыят шляхоў зносін.

Стар. 87

* Луі Каторз Чатырнаццаты.— Размова ідзе пра Людовіка XIV, караля Францыі ў 1643—1715 гадах. Каторз (франц. guatorze) — чатырнаццаты. Такім чынам Бельвядонскі вымаўляе слова «чатырнаццаты» два разы запар.

* Луі Жакоп.— Жакоб — прозвішча вядомых французскіх майстроў мастацкай мэблі (XVIII—XIX вв.), але нікога з іх не звалі Луі. Бельвядонскі называе кожны стыль мэблі іменем Луі.

* Луі Мове Гу — Мове гу (франц. mauvais goût) — дрэнны густ.

Стар. 88—89

* Турма і ссылка.— Часопіс Усесаюзнага таварыства былых паліткатаржнікаў і ссыльна-пасяленцаў называўся «Катарга і ссылка».

* Мікель Анджэла Буанароці (1475—1564) — італьянскі мастак і скульптар.

Стар. 91

* Франц Мерынг (1846—1919) — адзін з заснавальнікаў Германскай камуністычнай партыі, відны публіцыст і гісторык.

* «Карл Маркс у асабістым жыцці» — такой працы ў Мерынга няма.

* Людвіг Фейербах (1804—1872) — нямецкі філосаф-матэрыяліст; аднакласнікам Маркса Фейербах не быў.

Стар. 92—93

* МУКВ — Маскоўскае ўпраўленне крымінальнага вышуку.

Стар. 93

* Зялёны Мыс — курорт каля Батумі.

* Матыў тарэадора — маецца на ўвазе папулярная арыя тарэадора з оперы Ж. Бізэ «Кармэн».

Стар. 94—95

* «І пад кожным ёй лістком...» — перафраз радкоў з байкі І. А. Крылова «Страказа і муравей».

* «О, баядэра, перад тваім хараством!» — словы арыі з аперэты І. Кальмана «Баядэра».

Стар. 96—97

* Фёдар Фёдаравіч — намёк на Ф. Ф. Раскольнікава, які займаў у 1929 годзе пасты спярша старшыні Галоўрэперктома, а потым старшыні Галоўмастацтва.

* Губліт — губернскае ўпраўленне па справах літаратуры і выдавецтваў.

Стар. 99

* «Назад да класікаў!» — укладваючы гэтыя словы ў вусны Пабеданосікава, Маякоўскі намякае на спробы некаторых дзеячаў мастацтва адмежавацца ад савецкай сучаснасці, схаваўшыся за класікаў.

* «Пасля розных пасяджэнняў...» — перафразіроўка наступных вершаў з паэмы М. Ю. Лермантава «Дэман»:

Час разлуки, час свиданья,
Им не радость, не печаль;
Им в грядущем нет желанья,
И прошедшего не жаль.

* «Жывых людзей...» — Намёк на «лозунг» «жывога чалавека», які быў высунуты крытыкам В. В. Ярмілавым і прапагандаваўся РАПП (Расійскай асацыяцыяй пралетарскіх пісьменнікаў) у канцы дваццатых гадоў. «Лозунг» гэты скіроўваў літаратуру ўбок ад палітычнай накіраванасці.

Стар. 100

* Жанаддзел — аддзел па рабоце сярод жанчын пры партыйным органе.

* Бо-монд (франц. Beau monde) — вышэйшы свет.

* «Чырвоны мак» — балет Р. М. Гліера, пастаўлены ў Вялікім тэатры ў 1927 годзе.

* Эльфы, цвэльфы — у міфалогіі лёгкія, паветраныя істоты; распаўсюджаныя персанажы балетаў.

* Цвэльфы — такога слова ў рускай мове няма; Іван Іванавіч заблытаўся ў іншаземных словах: па-нямецку «эльф» — адзінаццаць, цвёльф — дванаццаць.

* Партмаксімум — стаўка заработнай платы, вышэй якой не магла аплочвацца праца члена партыі.

Стар. 105

* Рабочая паласа — месцы ў тэатрах, якія аддаваліся ў распараджэнне рабочых арганізацый.

Стар. 107

* Мікалай Аляксандравіч — намёк на Н. А. Сямашка (1874—1949) — першы народны камісар аховы здароўя (1918—1930).

Стар. 108

* «Вішнёвая квадратура» — злучэнне назваў п'ес з рэпертуара Маскоўскага Мастацкага тэатра — «Вішнёвы сад» А. П. Чэхава і «Квадратура круга» В. П. Катаева (пастаноўка 1928 года).

* «Дзядзька Турбіных» — злучэнне назваў п'ес з рэпертуара Маскоўскага Мастацкага тэатра — «Дзядзька Ваня» А. П. Чэхава і «Дні Турбіных» М. А. Булгакава (пастаноўка 1926 года).

Стар. 109

* Плыві, мая гандола!» — Словы ў пачатку раманса Браўна.

Стар. 119

* Сувязі фрыдляндскага парадку.— Намёк на нашумеўшую ў тыя гады кнігу Л. Фрыдлянда «За зачыненымі дзвярыма. Запіскі ўрача-венеролага» (выйшла ў 1927 годзе).

* Сорак чалавек альбо восем коней...— Такі надпіс на таварных чыгуначных вагонах указваў на ўмяшчальнасць вагона.

Стар. 127

* Няхай іншыя калгасяцца.— Намёк на пасылку гарадскіх работнікаў на сталую працу ў вёску для арганізацыі і ўмацавання калгасаў.

Стар. 133—134

* Піянерскі злёт скончаны.— Усесаюзны піянерскі злёт праходзіў у жніўні 1929 года.

* Для гэтай рэмаркі Маякоўскі, безумоўна, выкарыстаў наступную заметку «Праўды»: «На станцыю Фрунзе прыехаў Троцкі ў суправаджэнні сям'і ў спецыяльным мяккім вагоне. Публіка была ўражана шматлікасцю багажа Троцкага (звыш сямідзесяці месцаў) і наяўнасцю панскіх вы-

годаў, з якімі ехаў высланы з Масквы Троцкі. Асабліва звяртала на сябе ўвагу тая акалічнасць, што Троцкі прывёз з сабой паляўнічага сабаку і вялікі набор паляўнічага начыння.— Што за пан прыехаў? — пыталі на станцыі». («Праўда», 1928, № 37, 12 лютага).

Стар. 134—135

* Палітыка далёкага прыцэлу — выраз Троцкага.

* «Я спыняю цягнік...» — Намёк на эпізод, які адбыўся ў 1929 годзе, калі А. В. Луначарскі пры ад'ездзе з Ленінграда па асабістых меркаваннях затрымаў адпраўку цягніка (гл. Пастанову ЦК ВКП(б) з прычыны незаконнай затрымкі тав. А. В. Луначарскім кур'ерскага цягніка, «Праўда», 1929, № 141, 22 чэрвеня).

Стар. 137

* Апарат выдатны, апарату рад — рад і я і мой апарат.— Пісьменнік В. П. Катаеў паведаміў: «Пасля прачытання «Лазні» Маякоўскі сказаў мне: «Ведаеце, адкуль пайшла гэтая ігра слоў? З дзяцінства. Бацька купіў мне фатаграфічны апарат. У доме была сенсацыя. Я сказаў: «Мама рада, папа рад, што купілі апарат!» Гэта быў мой першы экспромт. (Пададзена ў літаграфаваным выданні: Жывы Маякоўскі. Размовы Маякоўскага. Выпуск 2-гі. Запісаў і сабраў А. Кручоных, М., 1930, стар. 13). Параўнай таксама ў вершы «Маленькая цаца з пушыстым хвастом».

Дети рады,
папа рад —
Окупился аппарат.

Стар. 140

* «...без вождя и без ветрил».— Перафраз радкоў з паэмы М. Ю. Лермантава «Дэман».

На воздушном океане,
Без руля и без ветрил,
Тихо плавают в тумане
Хоры стройные светил.

Стар. 140

* Гуд бай, адзьё, аўфідэрзэйн (англ., франц., нямецк.— Good bye, adieu, auf Wiedersehen) — да пабачэння.

ЗМЕСТ

Клоп 3
Лазня 63
Каментарыі 141

ВЛАДИМИР ВЛАДИМИРОВИЧ
МАЯКОВСКИЙ

ПЬЕСЫ

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

Рэдактар Н. І. Тулупава
Мастак Н. У. Сустава
Мастацкія рэдактары
А. І. Труханава, А. І. Цароў
Тэхнічны рэдактар А. В. Барадзіна
Карэктар К. А. Крукоўская

ІБ № 2464

Здадзена ў набор 06.11.84. Падп. да друку 04.06.85. Фармат 70×100¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 6,13. Ум. фарб.-адб. 6,29. Ул.-выд. арк. 5,53. Тыраж 4000 экз. Зак. 875. Цана 70 к.
Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.
Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.